ЦЭНТР
ЕЎРАПЕЙСКАЙ
ТРАНСФАРМАЦЫІ

# Погляд беларускіх праваабаронцаў на праваабарончую дзейнасць і пытанні супрацоўніцтва праваабарончых арганізацый Беларусі

## Справаздача па выніках даследавання

Даследаванне выканана па ініцыятыве Беларускага Дома правоў чалавека імя Барыса Звозскава пры экспертнай падтрымцы Цэнтра прававой трансфармацыі (*Lawtrend*) і Асамблеі няўрадавых дэмакратычных арганізацый Беларусі.

Беларускі дом правоў чалавека імя Барыса Звозскава

LAWTREND исследования образование действия

**Аўтары:**

Алёна Зуйкова

Андрэй Ягораў

Аксана Шэлест

© **Цэнтр еўрапейскай трансфармацыі**, 2017.

Цэнтр еўрапейскай трансфармацыі дазваляе свабоднае выкарыстанне ўрыўкаў з дадзенага тэкста пры ўмове, што будзе пазначана крыніца і даслана копія публікацыі, у якой выкарыстаны ўрыўкі з тэкста.

**Цэнтр еўрапейскай трансфармацыі**
Мінск, Беларусь

cet@eurobelarus.info
cet.eurobelarus.info
+375 29 6185388
Facebook Twitter VKontakte

# Змест

**Уводзіны**....4

**Агульныя характарыстыкі сектара праваабарончых арганізацый Беларусі**....6

Звесткі аб рэспандэнтах....6

Звесткі аб арганізацыях....9

**Уяўленні аб праваабарончай дзейнасці**....14

Характарыстыкі праваабарончай дзейнасці....14

Характарыстыкі праваабаронцаў....16

Тыпалогія груп беларускіх праваабаронцаў....21

**Дзейнасць праваабарончых арганізацый**....29

Сферы дзейнасці беларускіх праваабаронцаў....29

Мэтавыя групы беларускіх праваабарончых арганізацый....33

Узроўні дзейнасці праваабарончых арганізацый....34

Кіраванне ў арганізацыях....37

Вызначальныя фактары ў дзейнасці....40

Інструменты, якія выкарыстоўваюцца праваабарончымі арганізацыямі....41

Уяўленні аб праблемах і дасягненнях праваабарончых арганізацый....43

Праблемы праваабарончых арганізацый....43

Дасягненні праваабарончых арганізацый....45

Дасягненні арганізацый грамадзянскай супольнасці ва ўяўленнях праваабаронцаў....47

Работа з грамадскай думкай....48

**Супрацоўніцтва ў сектары беларускіх праваабарончых арганізацый**....51

Уяўленні аб мэтах супрацоўніцтва....51

Уяўленні аб стратэгічна важных тэмах і сферах дзейнасці....53

Кароткатэрміновая перспектыва....53

Доўгатэрміновая перспектыва....54

Правы і свабоды, якія патрабуюць сумесных намаганняў праваабаронцаў для іх абароны....56

Фактары, якія спрыяюць і перашкаджаюць супрацоўніцтву паміж праваабарончымі арганізацыямі....57

Стымулы для супрацоўніцтва....57

Перашкоды для супрацоўніцтва....59

Некаторыя аналітычныя высновы пра фактары, якія ўплываюць на супрацоўніцтва....60

Ацэнка некаторых форм супрацоўніцтва праваабарончых арганізацый.....61
Прыклады сумесных дзеянняў арганізацый праваабарончага сектара.....61
Ацэнкі паспяховасці супрацоўніцтва.....61
Інтэнсіўнасць узаемнага наведвання мерапрыемстваў.....62
Узаемадапамога праваабарончых арганізацый.....63
Стаўленне да агульнай стратэгіі развіцця праваабарончай дзейнасці ў Беларусі.....64
Структура сеткавых узаемадзеянняў у сектары праваабарончых арганізацый.....69
Агульная характарыстыка сеткі.....69
Цэнтральнасць сеткі (меры адноснага ўплыву арганізацый).....71
Частата кантактаў.....74
Характарыстыка досведу ўзаемадзеяння.....76
**Інтэнсіўнасць, паспяховасць і рызыкоўнасць супрацоўніцтва праваабарончых арганізацый з рознымі суб’ектамі**.....79
**Этыка праваабаронцы вачыма лідэраў беларускіх праваабарончых арганізацый**.....81
Стаўленне да неабходнасці этычнага самарэгулявання для праваабарончай супольнасці.....81
Уяўленні аб механізмах рашэння канфліктаў, звязаных з праваабарончай этыкай.....82
Уяўленні аб дапушчальнасці некаторых дзеянняў для праваабаронцаў і праваабарончых арганізацый.....86
Уяўленні аб дапушчальнасці для праваабаронцаў супрацоўніцтва з палітычнымі суб’ектамі.....88
Супрацоўніцтва з палітычнымі партыямі.....88
Супрацоўніцтва з беларускімі ўладамі.....91
**Стратэгічнае развіццё**.....95
Місія праваабарончых арганізацый.....95
Прыярытэты дзейнасці праваабарончых арганізацый.....97
Стратэгічнае планаванне.....99
Ацэнкі патрэбы праваабарончых арганізацый у адукацыйных мерапрыемствах.....101
**Пра аўтараў**.....104
**Дадаткі**.....105
Дадатак 1. Спіс праваабарончых арганізацый і ініцыятыў, прадстаўнікі якіх прынялі ўдзел у даследаванні.....105
Дадатак 2. Анкета.....107
Дадатак 3. Структура сеткавых узаемадзеянняў у сектары праваабарончых арганізацый.....128

# Уводзіны

Нягледзячы на агульнае варожае асяроддзе для арганізацый грамадзянскай супольнасці ў Беларусі, праваабарончыя арганізацыі і ініцыятывы застаюцца вельмі актыўнымі, і іх колькасць працягвае павялічвацца (з 17 — у 2010 годзе да 25 — у 2013 годзе, хаця ў асноўным яны застаюцца незарэгістраванымі з-за палітыкі, якую праводзяць дзейсныя ўлады). Ёсць зноў створаныя арганізацыі і ініцыятывы, якія не заўжды маюць дастатковы досвед і разуменне таго, як супрацоўнічаць, але яны гатовыя стаць эфектыўнымі членамі праваабарончай супольнасці.

Раней ужо вялася праца над першым сумесным праектам стратэгічнай канцэпцыі для беларускай праваабарончай супольнасці, які быў прыняты напрыканцы 2011 года. Гэтая праца паказала, што ў праваабарончых арганізацыях Беларусі часта адсутнічае стратэгічнае планаванне і не хапае разумення таго, як стратэгіі павінныя быць рэалізаваныя, хаця патрэба ў больш шырокім, цэласным падыходзе да дзейнасці была дакладна вызначана. У 2013 годзе таксама была праведзена вялікая праца па вызначэнні сумесных стратэгічных планаў супрацоўніцтва для праваабаронцаў[1]. Напрыканцы 2015 года і напачатку 2016 года праваабаронцы выступалі з агульнымі стратэгічнымі заявамі аб сітуацыі ў краіне і неабходных агульных дзеяннях[2].

На цяперашні момант замоўца даследавання і яго партнёры зацікаўленыя ў рэалізацыі новага этапа працы па развіццю стратэгічнага супрацоўніцтва паміж праваабарончымі арганізацыямі. Дадзенае даследаванне з’яўляецца інструментам для аптымізацыі гэтай працы. Яно накіраванае на вызначэнне ўяўленняў лідэраў праваабарончых арганізацый і ініцыятыў Беларусі па шэрагу пытанняў, такіх як: разуменне праваабарончай дзейнасці, праблемы ў сферы правоў чалавека ў Беларусі, праблемы і дасягненні ў супрацоўніцтве праваабарончых арганізацый, стратэгічныя прыярытэты для беларускай праваабарончай супольнасці, разуменне розных аспектаў праваабарончай этыкі і стаўленне да этычнага самарэгулявання ў праваабарончай супольнасці.

Па ўзгадненні з замоўцам, метадам даследавання было абранае **анкетнае апытанне** сярод лідэраў праваабарончых арганізацый і ініцыятыў[3]. Выбарка арганізацый і ініцыятыў была складзеная замоўцам у адпаведнасці з яго мэтамі. Усяго было абследавана **30 арганізацый і ініцыятыў** (далей абагульнена — арганізыцыі), даследчая каманда апытала **50 рэспандэнтаў**. У адпаведнасці з зацверджанай метадалогіяй, у даследаванні ад кожнай арганізацыі павінныя былі прыняць удзел па два рэспандэнты, якія займаюць у сваіх арганізацыях лідэрскія пазіцыі. Аднак, па розных прычынах (такіх, напрыклад, як: адмова аднаго з лідэраў ад удзелу ў апытанні, самавызначэнне рэспандэнтаў падчас апытання ў якасці прадстаўнікоў іншых арганізацый, адсутнасць другога лідэра ў арганізацыі), шэраг арганізацый у даследаванні быў прадстаўлены толькі адным рэспандэнтам. Палявы этап даследавання быў рэалізаваны ў перыяд: **жнівень-кастрычнік 2016 года**.

---

[1] Гл.: **3-ці Беларускі праваабарончы форум прайшоў у Вільні** // Фонд дамоў правоў чалавека (*HRHF*), — 28.10.2013: http://humanrightshouse.org/Articles/19698.html.

[2] Гл.: **Праваабаронцы заклікаюць дзяржаву да прыняцця першачарговых мер аднаўленчага характару** // ПЦ «Вясна». — 09.12.2015: http://spring96.org/be/news/81545; **Узгодненая пазіцыя праваабаронцаў адносна прыярытэтаў пры вызначэнні стратэгіі ўзаемадзеяння міжнародных партнёраў з Беларуссю** // ПЦ «Вясна». — 28.01.2016: http://spring96.org/be/news/82090.

[3] Гл. спіс правабарончых арганізацый і ініцыятыў, прадстаўнікі якіх узялі ўдзел у даследванні, у **Дадатку 1**.

Шэраг пытанняў даследавання быў накіраваны на выяўленне і фіксацыю актуальнага стану беларускіх праваабарончых арганізацый: юрыдычнага статуса, часу існавання, памеру арганізацый і г.д. Хаця гэтыя пытанні датычыліся аб'ектыўных дадзеных, нельга казаць пра тое, што атрыманыя вынікі цалкам адлюстроўваюць стан сектара. Некаторая адноснасць вынікаў звязаная, у першую чаргу, з пэўнай абмежаванасцю сацыялагічных метадаў даследавання — з-за фактара суб'ектыўнага ўспрымання і прасторы для індывідуальных інтэрпрэтацый рэспандэнтамі фармулёвак пытанняў і варыянтаў адказаў. У дадзеным даследаванні абмежаванні метада накладаюцца і на аб'ектыўна неадназначнае становішча праваабарончых арганізацый у Беларусі, з прычыны чаго нават, здавалася б, аб'ектыўныя факты могуць па-рознаму інтэрпрэтавацца.

Так, па водгуках аднаго з удзельнікаў апытання:

> *«у залежнасці ад суб'ектыўнага ўспрымання, рэгістрацыя* [арганізацыі] *за мяжою можа мець толькі тэхнічны характар і не мець значэння. Час існавання* [арганізацыі] *таксама можа залежаць ад суб'ектыўнага бачання, таму што ў беларускіх умовах праваабарончыя арганізацыі былі вымушаныя «перараджацца». У мяне таксама выклікаюць сумневы вынікі па крыніцах фінансавання, членамі і супрацоўнікам. Гледзячы на лічбы, мне здаецца, што тут шмат у чым адлюстравана не фактычнае, а юрыдычнае становішча, калі адно выдаецца за іншае. Адносна членства, тут таксама можа быць суб'ектыўны падыход: рэгістрацыя ўстаноў замест грамадскіх аб'яднанняў мае вынікам тое, што юрыдычна — членаў няма, а фактычна — яны ёсць. У сувязі з гэтым, і розныя адказы. Падобная сітуацыя з супрацоўнікамі: нехта лічыць супрацоўнікамі ўсіх афіцыйна працаўладкаваных, нехта — усіх, хто атрымлівае сродкі»*[*].

Такім чынам, атрыманыя вынікі не з'яўляюцца на 100% адпаведнымі рэальнасці. Тым не менш, мы мяркуем, што яны ў значнай ступені адлюстроўваюць стан рэчаў і прадстаўляюць сабой дадзеныя, на якія зацікаўленыя бакі могуць арыентавацца пры прыняцці рашэнняў.

[*] Тут і далей двукоссямі і курсівам выдзеленыя цытаты з адказаў рэспандэнтаў, атрыманых у ходзе даследавання.

# Агульныя характарыстыкі сектара праваабарончых арганізацый Беларусі

## Звесткі аб рэспандэнтах

У ходзе даследавання былі апытаныя прадстаўнікі 30 арганізацый, якія пазіцыянуюць сябе ў якасці праваабарончых альбо ў дзейнасці якіх прысутнічае праваабарончы кампанент.

Усяго было апытана 50 рэспандэнтаў, з іх большасць (74%) на момант правядзення апытання займалі лідэрскія пазіцыі ў сваіх арганізацыях (адносіліся да ліку заснавальнікаў, кіраўнікоў, намеснікаў кіраўнікоў, старшыняў, членаў саветаў), а яшчэ 12% займалі менеджэрскія пазіцыі (з'яўляліся менеджэрамі або каардынатарамі праграм/праектаў) (гл. табліцу 1 і дыяграму 1).

**Табліца 1.** Размеркаванне рэспандэнтаў па займаемых у арганізацыях пазіцыях, чал., %

| Пазіцыя ў арганізацыі | Колькасць | Працэнты |
|---|---|---|
| Лідэры, кіраўнікі, члены саветаў | 37 | 74 |
| Менеджэры, каардынатары праектаў/праграм | 6 | 12 |
| Актывісты, супрацоўнікі | 7 | 14 |
| **Усяго** | 50 | 100 |

Такім чынам, надалей мы будзем казаць у асноўным пра лідэраў арганізацый, за выключэннем асобных выпадкаў, калі нам будзе неабходна асобна вылучыць пазіцыю актывістаў і супрацоўнікаў.

**Дыяграма 1.** Размеркаванне рэспандэнтаў па займаемых у арганізацыях пазіцыях, %, чал.




Для 64% рэспандэнтаў, паводле вынікаў апытання, праца ў іх арганізацыі з'яўлялася асноўным месцам занятасці (гл. дыяграму 2).

**Дыяграма 2.** Размеркаванне рэспандэнтаў па статусе занятасці ў арганізацыях, %, чал.



Каля трацiны рэспандэнтаў пазначыла, што ўдзельнiчаюць у дзейнасцi сваiх арганiзацый менш за 5 гадоў, астатнiя маюць больш працяглы стаж працы, а 36% рэспандэнтаў прысвяцiлi сваёй арганiзацыi ад 11 гадоў i больш (гл. дыяграму 3).

**Дыяграма 3.** Размеркаванне рэспандэнтаў па стажы працы ў арганізацыях, чал.




Сярод рэспандэнтаў (у асноўным, лідэраў арганізацый) мужчын апынулася некалькі больш, чым жанчын (гл. дыяграму 4).

**Дыяграма 4.** Размеркаванне рэспандэнтаў па полу, %, чал.




Сярод удзельнікаў апытання таксама больш людзей старэйшага і сярэдняга ўзросту (62% рэспандэнтаў — старэйшыя за 40 гадоў), чым маладых людзей (18% — маладзей за 30 гадоў) (гл. дыяграму 5).

**Дыяграма 5.** Размеркаванне рэспандэнтаў па ўзросце, чал.



Пераважная большасць рэспандэнтаў мае вышэйшую адукацыю (гл. дыяграму 6).

**Дыяграма 6.** Размеркаванне рэспандэнтаў па ўзроўню адукацыі, чал.




Большасць прыняўшых удзел у апытанні з'яўляецца вопытнымі праваабаронцамі і прысвяціла гэтай дзейнасці больш за 10 гадоў (56% рэспандэнтаў), яшчэ 32% рэспандэнтаў паведамілі, што працуюць у праваабарончай сферы ад 4 да 10 гадоў. «Пачаткоўцаў» сярод рэспандэнтаў аказалася параўнальна няшмат: толькі 8% паказалі, што займаюцца праваабарончай дзейнасцю менш за 3 гады (гл. дыяграму 7).

**Дыяграма 7.** Размеркаванне рэспандэнтаў па стажы працы ў праваабарончай сферы, чал.




Доўгая прысутнасць у сферы праваабарончай дзейнасці, у сукупнасці з паказчыкам асноўнай занятасці ў гэтай сферы ў 64% рэспандэнтаў, гаворыць аб высокай прафесіяналізацыі сектара. Нявялікая колькасць людзей, якія прыйшлі ў сектар у апошнія тры гады, кажа пра параўнальна невысокую ратацыю і маруднае абнаўленне ў першую чаргу лідэрскіх кадраў.

Паказальна, што не ўсе з апытаных назвалі сябе праваабаронцамі. Два рэспандэнты пазначалі, што адназначна не лічаць сябе праваабаронцамі, а яшчэ дзевяць (18%) — не змаглі даць адназначны адказ на пастаўленае пытанне: «Ці лічыце Вы сябе асабіста праваабаронцам?» (гл. дыяграму 8).

**Дыяграма 8.** Размеркаванне рэспандэнтаў па самаідэнтыфікацыі з праваабаронцамі, %, чал.




## Звесткі аб арганізацыях

Большасць праваабарончых арганізацый, чые прадстаўнікі прынялі ўдзел у апытанні, мае статус зарэгістраваных, прычым больш за палову ў даследуемай сукупнасці (16 з 30 арганізацый) мае дзяржаўную рэгістрацыю ў Беларусі*.

Палова арганізацый (15 з 30 арганізацый) на момант правядзення даследавання мела тэрмін існавання больш за 10 гадоў. Арганізацый, якія існуюць менш за тры гады, было выяўлена ў колькасці чатырох. Арганізацый, якія існуюць ад 3 да 10 гадоў, — сем. Адказваючы на пытанне пра тэрмін існавання сваіх арганізацый, шэсць рэспандэнтаў, якія прадстаўлялі тры арганізацыі, далі несупадаючыя адказы. У выпадку двух арганізацый несупадзенне адказаў можа быць звязана з памежнымі варыянтаў адказу — адказы былі дадзеныя ў суседніх дыяпазонах: у першым выпадку — «3-5 гадоў» і «6-10 гадоў»; у другім выпадку — «6-10 гадоў» і «больш за 10 гадоў». У трэцім выпадку адзін з рэспандэнтаў назваў тэрмін «менш за 3 гады», другі — «больш за 10 гадоў». Таксама варта адзначыць, што адзін рэспандэнт з пары ўказаў, што не мае адказу, паводле адказу другога рэспандэнта з той жа арганізацыі, дадзеная арганізацыя на момант правядзення апытання існавала «3-5 гадоў» (гл. дыяграму 9).

**Дыяграма 9.** Размеркаванне арганізацый па тэрміне існавання, %, частата




* Тут і далей, аналізуючы інфармацыю аб арганізацыях, мы разглядаем арганізацыі, прадстаўленыя парамі рэспандэнтаў, адказы якіх супалі, і арганізацыі, якія былі прадстаўленыя па адным рэспандэнту. Арганізацыі, прадстаўленыя парамі рэспандэнтаў, якія далі несупадаючыя адказы, былі выключаныя з агульнага аналіза і разгледжаныя асобна (на дыяграмах яны пазначаныя як адфільтраваныя, калі не пазначана іншае).

У ліку арганізацый, якія маюць дзяржаўную рэгістрацыю, 11 зарэгістраваныя як грамадскія аб’яднанні, шэсць — як установы, тры — як саюзы/асацыяцыі, адна арганізацыя з’яўляецца прафсаюзнай групай, яшчэ адна — таварыствам. Дзве пары рэспандэнтаў далі супярэчлівыя адказы: у першым выпадку адзін рэспандэнт з пары ўказаў, што яго арганізацыя зарэгістраваная як грамадскае аб’яднанне, другі рэспандэнт з пары — што як установа; у другім выпадку адзін рэспандэнт назваў у якасці арганізацыйна-прававой формы «Грамадскае аб’яднанне», яго «напарнік» выбраў адказ «Іншая» (пры гэтым рэспандэнтам было пазначана, што маецца на ўвазе *«Прафсаюз»*) (гл. дыяграму 10).

**Дыяграма 10.** Размеркаванне арганізацый з дзяржаўнай рэгістрацыяй па арганізацыйна-прававых формах, %, частата




Адносна 18 арганізацый рэспандэнтамі было ўказана, што тыя з’яўляліся членскімі арганізацыямі, адносна іншых 11 арганізацый — што тыя такімі не з’яўляюцца. Прадстаўнік яшчэ адной арганізацыі адмовіўся адказваць на пастаўленае пытанне.

З ліку арганізацый, пазначаных як членскія, адносна 11 арганізацый можна з вялікай доляй упэўненасці сказаць, што яны такімі і з’яўляюцца: станоўчы адказ на пастаўленае пытанне быў дадзены па пяці арганізацыям, якія былі прадстаўленыя парамі рэспандэнтаў, і па шасці арганізацыям, якія былі прадстаўленыя па аднаму рэспандэнту. Таксама да ліку членскіх арганізацый (але з доляй сумневу) можна аднесці яшчэ сем арганізацый, у якіх пары рэспандэнтаў далі супярэчлівыя адказы, калі адзін рэспандэнт з пары назваў колькасць членаў у сваёй арганізацыі, у той час як «напарнікі» абіралі варыянты адказу: «Не з’яўляецца членскай» (па выніках апытання было зафіксавана чатыры такіх выпадкі), «Не хачу адказваць» (два выпадкі) і «Не ведаю» (адзін выпадак) (гл. дыяграму 11).

**Дыяграма 11.** Размеркаванне арганізацый па арганізацыйнай структуры, %, частата



Што тычыцца памераў членскіх арганізацый, то, згодна з адказамі рэспандэнтаў, такія арганізацыі часцей за ўсё з’яўляюцца даволі шматлікімі, якія ўключаюць некалькі дзясяткаў, а то і соцен членаў. Так, палова членскіх арганізацый (г.зн. дзевяць арганізацый) налічвае больш за 69 членаў, арганізацый з невялікай колькасцю членаў (да 10 чалавек) было выяўлена ў колькасці чатырох, шматлікіх жа і вельмі буйных (больш за 1000 членаў) — тры арганізацыі (гл. дыяграму 12).

У дадзеным выпадку мы ўлічылі ўсе адказы, у якіх была названа колькасць членаў, нават калі толькі адзін рэспандэнт з пары даў колькасны адказ. Такім чынам, разгляду падлягаюць усе 18 членскіх арганізацый даследуемай сукупнасці. Характэрна, што ў выпадку пяці арганізацый, прадстаўленых у даследаванні парамі рэспандэнтаў, тыя далі супадаючыя адказы.

**Дыяграма 12.** Размеркаванне членскіх арганізацый па колькасці членаў, частата




Пытанне аб колькасці пастаянных аплачваемых супрацоўнікаў у арганізацыі (занятых на 0,5 стаўкі і больш) выклікала ў рэспандэнтаў некаторыя цяжкасці. Толькі 41 з 50 рэспандэнтаў даў адказ на пастаўленае пытанне (дзевяць рэспандэнтаў выбралі варыянт «Цяжка адказаць»). Пры гэтым толькі пяць пар рэспандэнтаў, якія прадстаўлялі адныя і тыя ж арганізацыі, далі супадаючыя адказы, сем пар — несупадаючыя адказы, а ў выпадку васьмі пар толькі адзін з парных рэспандэнтаў даў колькасны адказ, тады як «напарнікі» выбралі варыянт «Цяжка адказаць». З ліку рэспандэнтаў, якія прадстаўлялі свае арганізацыі ў адзіночным ліку, колькасць пастаянных супрацоўнікаў назвалі 9 з 10 рэспандэнтаў, а адзін рэспандэнт адмовіўся даваць адказ.

Такім чынам, намі былі атрыманыя дадзеныя па 29 з 30 арганізацый, адабраных у даследуемую сукупнасць. Пры гэтым аналізу былі падвергнутыя дадзеныя толькі па 22 арганізацыях, прадстаўленых па адным рэспандэнту, а таксама парамі, у якіх толькі адзін з двух рэспандэнтаў даў колькасны адказ. Аналізу не падлягалі дадзеныя па сямі арганізацыях, дзе парныя рэспандэнты далі несупадаючыя колькасныя адказы (на дыяграме 13 пазначана як «Адфільтравана»), а таксама дадзеныя па адной арганізацыі, прадстаўленай адзіным рэспандэнтам, які не даў адказу (на дыяграме 13 пазначана як «Невядома»).

У выніку з упэўненасцю можна сказаць, што пастаянных аплачваемых супрацоўнікаў не мае крыху менш за палову арганізацый, чые прадстаўнікі прынялі ўдзел у апытанні (а менавіта — 13 арганізацый); яшчэ сем арганізацый маюць невялікі штат (2-7 пастаянных супрацоўнікаў); штат, які складаецца з больш чым 10 чалавек, маюць толькі дзве арганізацыі: адна налічвае 11 пастаянных супрацоўнікаў, другая — 40 супрацоўнікаў.

Адказы парных рэспандэнтаў, якія далі несупадаючыя колькасныя адказы, вар'іруюцца ў дыяпазоне ад 4 да 14 пастаянных аплачваемых супрацоўнікаў, толькі ў выпадку адной пары рэспандэнтаў адзін з удзельнікаў апытання назваў колькасць супрацоўнікаў у памеры 50 чалавек, у той час як яго «напарнік» назваў колькасць у памеры сямі супрацоўнікаў (гл. дыяграму 13).

**Дыяграма 13.** Размеркаванне арганізацый па колькасці пастаянных супрацоўнікаў, частата




Пытанне аб колькасці прыцягваемых арганізацыямі валанцёраў у рэспандэнтаў таксама выклікала цяжкасці, але гэта было чакана, паколькі валанцёры з'яўляюцца менш выразна акрэсленай катэгорыяй, і іх колькасць цяжэй паддаецца фіксацыі. Выклікае здзіўленне той факт, што варыянт «Цяжка адказаць» выбралі толькі 10 рэспандэнтаў (крыху больш, чым не змаглі назваць колькасць пастаянных аплачваемых супрацоўнікаў), пры гэтым супадаючыя колькасныя адказы далі толькі чатыры пары рэспандэнтаў.

Дадзеныя аб колькасці прыцягваемых арганізацыямі валанцёраў былі атрыманыя адносна 28 арганізацый, у выпадку двух астатніх арганізацый рэспандэнтамі (адным прадстаўніком і парай прадстаўнікоў сваіх арганізацый) быў абраны варыянт «Цяжка адказаць» (на дыяграме 14 пазначана як «Невядома»). Аналізу былі падвергнутыя дадзеныя па 20 арганізацыях, дзе ў выпадку чатырох арганізацый парныя рэспандэнты далі супадаючыя адказы, у выпадку сямі арганізацый толькі адзін рэспандэнт з пары даў колькасны адказ і ў выпадку дзевяці арганізацый, прадстаўленых па адзіным рэспандэнту, быў дадзены колькасны адказ. З аналізу былі выключаныя восем арганізацый, дзе парныя рэспандэнты далі несупадаючыя адказы (на дыяграме 14 пазначана як «Адфільтравана»).

Грунтуючыся на атрыманых дадзеных, валанцёрскі рэсурс праваабарончых арганізацый можна ацэньваць як невялікі: 4 з 30 арганізацый, чые прадстаўнікі прынялі ўдзел у даследаванні, зусім не маюць валанцёраў, сем арганізацый маюць да 6 валанцёраў, чатыры арганізацыі — 8-12 валанцёраў, тры арганізацыі — 25 валанцёраў. Маштабныя валанцёрскія сеткі маюць толькі дзве арганізацыі (150 і 500 валанцёраў, адпаведна) (гл. дыяграму 14).

**Дыяграма 14.** Размеркаванне арганізацый па колькасці прыцягваемых валанцёраў, частата




Валанцёрскі патэнцыял арганізацый, пары прадстаўнікоў якіх далі несупадаючыя адказы, ацэньваецца па-рознаму: у выпадку трох арганізацый адказы вар'іруюцца ў дыяпазоне менш за 10 валанцёраў, у выпадку чатырох арганізацый — у дыяпазоне ад 5 да 30 валанцёраў, у выпадку яшчэ адной арганізацыі адзін рэспандэнт з пары назваў колькасць валанцёраў у памеры 32 чалавек, яго «напарнік» — у памеры 160 чалавек.

# Уяўленні аб праваабарончай дзейнасці

## Характарыстыкі праваабарончай дзейнасці

У асноўным, рэспандэнты пагадзіліся з двума характарыстыкамі праваабарончай дзейнасці з прапанаванага спісу, а менавіта:

- Праваабарончая дзейнасць — гэта дзейнасць асобных людзей, груп або інстытутаў грамадства, якія заахвочваюць і абараняюць агульнапрызнаныя правы чалавека і асноўныя свабоды;
- Праваабарончая дзейнасць палягае ў заахвочванні і абароне грамадзянскіх і палітычных правоў, а таксама заахвочванні, абароне і ажыццяўленні эканамічных, сацыяльных і культурных правоў.

З гэтымі сцвярджэннямі пагадзіліся 96% рэспандэнтаў (выбралі варыянты адказу: «Цалкам згодны» і «Часткова згодны») (гл. дыяграму 15).

У той жа час, у нязначнай ступені праявілася нязгода з такімі істотнымі характарыстыкамі праваабарончай дзейнасці як:

- Праваабарончая дзейнасць тычыцца заахвочвання і абароны правоў членаў любых груп насельніцтва;
- Праваабарончая дзейнасць не ўключае ў сябе дзейнасць, звязаную з правядзеннем або прапагандай актаў гвалту.

Так, адзін рэспандэнт не пагадзіўся з усеагульнасццю праваабароны, яшчэ адзін удзельнік даследавання дапусціў прымяненне гвалту, яшчэ два рэспандэнты мелі цяжкасць з адказам.

Ацэнкі рэспандэнтаў шмат у чым разышліся адносна такой характарыстыкі як:

- Праваабарончая дзейнасць накіраваная на абарону правоў індывідуальнага грамадзяніна ад пасягальніцтваў дзяржавы, але не распаўсюджваецца на адносіны паміж грамадзянамі.

74% удзельнікаў даследавання пагадзіліся з такой фармулёўкай (выбралі варыянты адказу: «Цалкам згодны» і «Часткова згодны»), тады як 24% выказалі сваю нязгоду з ёй.

Далёка не ўсе рэспандэнты пагадзіліся з прапанаваным сцвярджэннем аб выключна грамадскім характары праваабарончай дзейнасці:

- Праваабарончая дзейнасць носіць грамадскі характар і не распаўсюджваецца на дзейнасць афіцыйных асоб дзяржавы, чыноўнікаў і ўдзельнікаў бізнес-сектара.

36% рэспандэнтаў выбралі варыянт адказу «Цалкам не згодны», а яшчэ 10% мелі цяжкасці з адказам. Трэба заўважыць, аднак, што гэтае пытанне магло быць па-рознаму зразумелым удзельнікамі даследавання — адзін з рэспандэнтаў адзначыў:

> *«Чытаючы пытанне, я не да канца разумею яго сутнасць. «Не распаўсюджваецца» — у тым сэнсе, што мы не лічым, што гэтыя катэгорыі займаюцца праваабарончай дзейнасцю, ці ў тым сэнсе, што іх нашая дзейнасць не датычнаецца?»*.

Пры гэтым 82% рэспандэнтаў (30% адказалі «Цалкам згодны», плюс 52% адказалі «Часткова згодны») пагадзіліся са сцвярджэннем аб эксклюзіўнасці праваабарончай дзейнасці:

- Праваабарончая дзейнасць ажыццяўляецца праваабарончымі арганізацыямі або асобнымі праваабаронцамі на аснове спецыяльных ведаў і стандартаў кваліфікацыі.

Толькі 14% рэспандэнтаў не пагадзіліся з такой фармулёўкай.

**Дыяграма 15.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў зыходзячы з прапанаваных характарыстык праваабарончай дзейнасці, %



Дадаткова рэспандэнты назвалі наступныя характарыстыкі праваабарончай дзейнасці:

*«Непрадузятасць, непалітызаванасць (часта ігнаруецца беларусамі)»*;

*«Гэта таксама дзейнасць, звязаная з распаўсюджваннем каштоўнасцей правоў чалавека»*;

*«Асаблівая культура асяроддзя праваабаронцаў, асаблівая метадалогія, каштоўнастны падыход»*;

*«Праваабарончая дзейнасць — гэта дзейнасць дзеля асветы грамадзян, тлумачэння ім іх правоў і абавязкаў (спецыфіка СССР)»*;

*«Праваабарончая дзейнасць безвыплатная і не звязаная з атрыманнем даходаў»*;

*«Праваабарончая дзейнасць несумяшчальная з перасьледам палітычных мэтаў (барацьбой за ўладу)»*;

*«Праваабаронцы прызнаюць універсальнасць правоў чалавека»*;

*«Прызнанне ўніверсальнасці (прынцыпа) правоў чалавека, выкарыстанне дакладных метадаў: ненасілле, адмова ад карупцыйных метадаў збору інфармацыі»*;

*«Падзел каштоўнасці ўніверсальнасці і непадзельнасці правоў чалавека»*;

*«Спрэчным пытаннем з'яўляецца тое, ці кваліфікаваць як акты гвалту такія формы, як блакаванне перамяшчэння (напрыклад, службовых асоб да месца працы)»*;

*«Універсальнасць і непарыўнасць, займацца праваабарончай дзейнасцю — выконваць пэўную грамадскую функцыю і несці адпаведную адказнасць»*.

## Характарыстыкі праваабаронцаў

Што датычыцца характарыстык праваабаронцаў, рэспандэнты былі практычна аднадушныя па большасці параметраў (гл. дыяграму 16). Больш за 85% рэспандэнтаў цалкам пагадзіліся з чатырма з прапанаваных да ацэнкі характарыстык:

- Праваабаронцы — гэта тыя, хто індывідуальна ці сумесна з іншымі імкнецца заахвочваць, абараняць і ажыццяўляць правы чалавека і асноўныя свабоды на мясцовым, нацыянальным, рэгіянальным і/або міжнародным узроўнях;
- Праваабаронцы прызнаюць універсальнасць правоў чалавека для ўсіх без якога-небудзь адрознення;
- Праваабаронцы абараняюць правы чалавека толькі мірнымі сродкамі;
- Праваабаронцы абараняюць правы любых груп, уключаючы правы жанчын, дзяцей, правы карэнных жыхароў, правы бежанцаў і ўнутрана перамешчаных асоб, а таксама правы нацыянальных, моўных, сэксуальных меншасцей.

Яшчэ каля 5% рэспандэнтаў часткова пагадзіліся з гэтымі характарыстыкамі, і яшчэ каля 5% — мелі цяжкасці з адказам. Сярод апытаных лідэраў і актывістаў не знайшлося тых, хто б выказаў сваю нязгоду з гэтымі характарыстыкамі праваабаронцаў.

Цікавым з'яўляецца тое, што 6% удзельнікаў даследавання (ці тры рэспандэнты) не пагадзіліся з наступным з прапанаваных сцвярджэнняў:

- Праваабаронцы працуюць з любымі парушэннямі правоў чалавека, уключаючы масавыя пакаранні смерцю, катаванні, адвольныя арышты і заключэнне пад варту, дыскрымінацыю, пытанні занятасці, доступ да медыцынскага абслугоўвання, таксічныя адходы і іх уздзеянне на навакольнае асяроддзе.

Асобна варта разгледзець аспект уяўленняў даследуемай групы пра ўніверсальнасць правоў чалавека. Так, 86% (ці 43 рэспандэнты) цалкам пагадзіліся са сцвярджэннем «Праваабаронцы прызнаюць універсальнасць правоў чалавека для ўсіх без якога-небудзь адрознення», 6% (або 3 рэспандэнты) — часткова пагадзіліся з гэтай характарыстыкай праваабаронцаў, яшчэ 6% (або 3 рэспандэнты) — мелі цяжкасці з адказам.

Са сфармуляваным інакш сцвярджэннем пра ўніверсальнасць правоў чалавека «Праваабаронцы абараняюць правы любых груп, уключаючы правы жанчын, дзяцей, правы карэнных жыхароў, правы бежанцаў і ўнутрана перамешчаных асоб, а таксама правы нацыянальных, моўных, сэксуальных меншасцей» таксама пагадзіліся 96% рэспандэнтаў (90% адказалі «Цалкам згодны», плюс 6% адказалі «Часткова згодны»), і толькі 4% рэспандэнтаў мелі цяжкасці з адказам.

У той жа час, толькі 50% рэспандэнтаў катэгарычна не пагадзіліся з наступным сцвярджэннем:

- Праваабаронцы ў выключных выпадках могуць дапускаць выключэнне некаторых правоў чалавека для пэўных асоб або груп насельніцтва (тэрарыстаў, педафілаў і г.д.).

Пры гэтым з дадзеным сцвярджэннем часткова пагадзіліся 20% (ці 10 рэспандэнтаў) і столькі ж мелі цяжкасці з адказам. Цалкам пагадзіліся са сцвярджэннем, што выключэнні дапушчальныя, — 10% (ці пяць рэспандэнтаў). Адзін з рэспандэнтаў удакладніў сваю пазіцыю па гэтым пытанні, увёўшы іерархію правоў чалавека, пазначыўшы, якія выключэнні дапушчальныя, а якія не:

> *«Згодны — калі выключэнне датычыцца правоў на свабоду, свабоду перамяшчэння і г.д. Нельга выключаць права на жыццё, абарону ад рабства».*

Такім чынам, можна казаць пра тое, што ў беларускай праваабарончай супольнасці ўяўленні пра ўніверсальнасць правоў чалавека даволі часта спалучаюцца з уяўленнямі пра тое, што для некаторых груп у выключных выпадках дапушчальныя выключэнні.

Дадаткова рэспандэнты назвалі наступныя характарыстыкі праваабаронцаў:

> *«Непрадузятасць, непалітызаванасць (часта ігнаруецца беларусамі)»;*

> *«Непартыйны характар дзейнасці, пераход на дзяржаўную службу (у тым ліку ў якасці дэпутата парламента) цягне прыпыненне статуса праваабаронцы»;*

> *«Паслядоўна і прынцыпова абараняюць правы»;*

> *«Праваабаронца — не прафесія і не грамадская праца, а стан (імкненне) душы. Калі вы не можаце мірыцца з тым, што ў фармаце «дзяржава—чалавек» адбываецца парушэнне фундаментальных правоў і свабод чалавека, а гэта адбываецца ў любой дзяржаве, значыць, гл. вышэй»;*

> *«Праваабаронцы — гэта тыя, хто імкнецца да паглыблення сваіх ведаў нацыянальнага і міжнароднага права для абароны правоў і свабод грамадзян, тыя, хто імкнецца ў сваёй дзейнасці, у паўсядзённым жыцці прытрымлівацца высокіх маральных прынцыпаў».*

**Дыяграма 16.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў зыходзячы з прапанаваных характарыстык праваабаронцаў, %



На пытанне пра тое, ці падтрымліваюць удзельнікі даследавання захаванне ў Беларусі смяротнага пакарання ў якасці выключнай меры крымінальнага пакарання, 47 рэспандэнтаў (94%) адказалі, што не падтрымліваюць, адзін рэспандэнт — што падтрымлівае, яшчэ двое — мелі цяжкасці з адказам (гл. дыяграму 17).

**Дыяграма 17.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў па пытанні захавання ў Рэспубліцы Беларусь смяротнага пакарання, %, чал.




Як ужо было адзначана вышэй, 96% рэспандэнтаў пагадзіліся з характарыстыкай, што праваабаронцы абараняюць правы любых груп. Аднак пры адказе на пытанне пра тое, як бы паступілі рэспандэнты ў сітуацыі, калі б ім прапанавалі ўключыцца ў кампаніі па абароне правоў шэрагу мэтавых груп, высветлілася, што беларускія праваабаронцы далёка не заўсёды адназначна гатовыя публічна ўключацца ў такія кампаніі.

У прыватнасці, на разгляд рэспандэнтам было прапанавана 10 мэтавых груп:

1) жанчыны;
2) нацыянальныя меншасці;
3) эмігранты-мусульмане;
4) бежанцы;
5) баптысты, евангелісты;
6) прадстаўнікі ЛГБТ-супольнасці;
7) людзі з інваліднасцю;
8) зняволеныя;
9) тэрарысты, чыя віна даказаная;
10) палітычныя актывісты.

Хаця пераважная большасць рэспандэнтаў выказала гатоўнасць публічна выступаць у абарону правоў усіх пералічаных груп, назіраюцца пэўныя адрозненні ў адказах, у залежнасці ад мэтавай групы (гл. дыяграму 18).

**Дыяграма 18.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна ўдзелу ў кампаніях па абароне мэтавых груп, %



Па-першае, адносна большасці са спісу прапанаваных мэтавых груп сярод удзельнікаў даследавання ёсць тыя, хто не гатовы выступаць у абарону іх правоў. Іх колькасць невялікая: 1-3 рэспандэнты, хаця адносна абароны правоў тэрарыстаў, чыя віна даказаная, колькасць такіх павялічылася да васьмі рэспандэнтаў. Выключэнне складаюць толькі такія групы як: палітычныя актывісты, зняволеныя і людзі з інваліднасцю — ніхто з удзельнікаў даследавання не адказаў, што не будзе ўключацца ў кампаніі па абароне правоў гэтых груп. Таксама ў дачыненні да названых груп менш за ўсё рэспандэнтаў мелі цяжкасці з адказам.

Па-другое, ад 2 да 5 рэспандэнтаў выказаліся аб сваёй гатоўнасці дапамагаць кампаніям па абароне правоў кожнай з пералічаных груп — толькі непублічна. Больш за ўсё (5 рэспандэнтаў) такім чынам адказалі на пытанне адносна абароны правоў тэрарыстаў, чыя віна даказаная, зняволеных, прадстаўнікоў ЛГБТ-супольнасці, эмігрантаў-мусульман.

Па-трэцяе, даволі вялікая доля рэспандэнтаў (ад 2% да 32%, у залежнасці ад групы) мелі цяжкасці з адказам адносна таго, як яны паступяць. Найменшая колькасць рэспандэнтаў мела цяжкасці з адказам адносна магчымасці ўдзелу ў кампаніях па абароне правоў палітычных актывістаў і людзей з інваліднасцю (па 2% рэспандэнтаў, адпаведна), зняволеных і нацыянальных меншасцей (па 4%, адпаведна). Найбольшая колькасць рэспандэнтаў мела цяжкасці з адказам адносна магчымасці ўдзелу ў кампаніях па абароне правоў тэрарыстаў, чыя віна даказаная (32%).

Аналізуючы сукупнасць адказаў на пастаўленае пытанне, можна зрабіць два важных назіранні.

Па-першае, агулам, беларускія праваабаронцы гатовыя далучацца (галоўным чынам, публічна) да любых праваабарончых кампаній, аднак вылучаюцца «кропкі напружання». Да іх адносіцца абарона правоў палітычных актывістаў і зняволеных — у параўнанні з іншымі групамі, тут вышэйшы ўзровень гатоўнасці дзейнічаць, менш нявызначанасці. Гэта можа сведчыць пра наяўнасць падзяляемага праваабарончай супольнасцю ўяўлення аб вострых праблемах як для праваабарончага сектара, так і для краіны агулам. Абарона правоў іншых груп (рэлігійных супольнасцей, сэксуальных і нацыянальных меншасцей, бежанцаў, жанчын і г.д.) мае крыху меншы патэнцыял салідарнасці ў беларускай праваабарончай супольнасці, што можа быць звязана з меншай актуальнасцю гэтых праблем.

Па-другое, заўважны ўплыў чалавечага фактара, які адбіваецца на непрадузятасці беларускіх праваабаронцаў. Пра гэта можна меркаваць па тым, што на палюсах восі гатоўнасці далучацца да кампаній па абароне правоў знаходзяцца людзі з інваліднасцю (максімальнае значэнне) і тэрарысты, чыя віна даказаная (мінімальнае значэнне). Гэта можа казаць пра вялікае значэнне эмацыйнага стаўлення праваабаронцаў да патэнцыйнай мэтавай групы: нейтральна-пазітыўнае — адносна людзей з інваліднасцю і супярэчлівае — адносна асоб, якія абвінавачваюцца ў тэрарызме.

## Тыпалогія груп беларускіх праваабаронцаў

У залежнасці ад прыняцця рэспандэнтамі характарыстык праваабарончай дзейнасці і характарыстык праваабаронцаў, усіх праваабаронцаў можна падзяліць на тры групы, якіх мы ўмоўна назвалі:

1) **праваабаронцы-»рыгарысты»**;

2) **праваабаронцы-»рэалісты»**;

3) **праваабаронцы-»рэлятывісты»**.

**«Рыгарысты»** цвёрда прытрымліваюцца пазіцыі прызнання асноўных прынцыпаў праваабароны і базавых характарыстык праваабаронцаў: яны прызнаюць універсальнасць правоў чалавека для ўсіх без выключэння, прызнаюць непадзельнасць правоў чалавека, прызнаюць неад’емнасць правоў чалавека, прызнаюць ненасілле як прынцып (абарона толькі мірнымі сродкамі), прызнаюць непрафесійны характар (любы індывідуальна ці супольна з іншымі можа выступаць у абарону правоў чалавека), адназначна не падтрымліваюць смяротнае пакаранне.

**«Рэалісты»** падтрымліваюць асноўныя прынцыпы, аднак, у адрозненні ад «рыгарыстаў», адносна пытання асобных прынцыпаў могуць мець няцвёрдую пазіцыю і толькі часткова пагаджацца з імі, яны таксама могуць выбіраць варыянт адказу «Цяжка адказаць» у пытанні падтрымкі смяротнага пакарання.

**«Рэлятывісты»** могуць не падтрымліваць або мець цяжкасці пры вызначэнні сваёй пазіцыі адносна аднаго або некалькіх базавых прынцыпаў, яны таксама могуць падтрымліваць захаванне смяротнага пакарання.

Да кожнай з умоўных груп мы аднеслі тых рэспандэнтаў, якія далі наступныя варыянты адказаў на пытанні анкеты адносна характарыстык праваабарончай дзейнасці, характарыстык праваабаронцы і падтрымкі смяротнага пакарання (гл. табліцы 2-5).

**Табліца 2.** Варыянты адказаў на пытанне: «У якой ступені Вы згодны з кожнай з прыведзеных ніжэй характарыстык праваабарончай дзейнасці?» — для кожнай умоўнай групы праваабаронцаў

| **У якой ступені Вы згодны з кожнай з прыведзеных ніжэй характарыстык праваабарончай дзейнасці?** | **Умоўныя групы праваабаронцаў** | | |
|---|---|---|---|
| | «Рыгарысты» | «Рэалісты» | «Рэлятывісты» |
| Праваабарончая дзейнасць — гэта дзейнасць асобных людзей, груп або інстытутаў грамадства, якія заахвочваюць і абараняюць агульнапрызнаныя правы чалавека і асноўныя свабоды | «Часткова згодны»/ «Цалкам згодны» | «Часткова згодны»/ «Цалкам згодны» | «Цалкам не згодны»/ «Цяжка адказаць» |
| Праваабарончая дзейнасць палягае ў заахвочванні і абароне грамадзянскіх і палітычных правоў, а таксама заахвочванні, абароне і ажыццяўленні эканамічных, сацыяльных і культурных правоў | «Часткова згодны»/ «Цалкам згодны» | «Часткова згодны»/ «Цалкам згодны» | «Цалкам не згодны»/ «Цяжка адказаць» |
| Праваабарончая дзейнасць тычыцца заахвочвання і абароны правоў членаў любых груп насельніцтва | «Цалкам згодны» | «Часткова згодны»/ «Цалкам згодны» | «Цалкам не згодны»/ «Цяжка адказаць» |
| Праваабарончая дзейнасць не ўключае ў сябе дзейнасць, звязаную з правядзеннем або прапагандай актаў гвалту | «Цалкам згодны» | «Часткова згодны»/ «Цалкам згодны» | «Цалкам не згодны»/ «Цяжка адказаць» |

**Табліца 3.** Варыянты адказаў на пытанне: «У якой ступені Вы згодны з кожнай з прыведзеных ніжэй характарыстык праваабаронцаў?» — для кожнай умоўнай групы праваабаронцаў

| **У якой ступені Вы згодны з кожнай з прыведзеных ніжэй характарыстык праваабаронцаў?** | **Умоўныя групы праваабаронцаў** | | |
|---|---|---|---|
| | «Рыгарысты» | «Рэалісты» | «Рэлятывісты» |
| Праваабаронцы — гэта тыя, хто індывідуальна ці сумесна з іншымі імкнецца заахвочваць, абараняць і ажыццяўляць правы чалавека і асноўныя свабоды на мясцовым, нацыянальным, рэгіянальным і/або міжнародным узроўнях | «Часткова згодны»/ «Цалкам згодны» | «Часткова згодны»/ «Цалкам згодны» | «Цалкам не згодны»/ «Цяжка адказаць» |
| Праваабаронцы прызнаюць універсальнасць правоў чалавека для ўсіх без якога-небудзь адрознення | «Цалкам згодны» | «Часткова згодны»/ «Цалкам згодны» | «Цалкам не згодны»/ «Цяжка адказаць» |
| Праваабаронцы абараняюць правы чалавека толькі мірнымі сродкамі | «Цалкам згодны» | «Часткова згодны»/ «Цалкам згодны» | «Цалкам не згодны»/ «Цяжка адказаць» |
| Праваабаронцы працуюць з любымі парушэннямі правоў чалавека, уключаючы масавыя пакаранні смерцю, катаванні, адвольныя арышты і заключэнне пад варту, дыскрымінацыю, пытанні занятасці, доступ да медыцынскага абслугоўвання, таксічныя адходы і іх уздзеянне на навакольнае асяроддзе | «Цалкам згодны» | «Часткова згодны»/ «Цалкам згодны» | «Цалкам не згодны»/ «Цяжка адказаць» |
| Праваабаронцы абараняюць правы любых груп, уключаючы правы жанчын, дзяцей, правы карэнных жыхароў, правы бежанцаў і ўнутрана перамешчаных асоб, а таксама правы нацыянальных, моўных, сэксуальных меншасцей | «Цалкам згодны» | «Часткова згодны»/ «Цалкам згодны» | «Цалкам не згодны»/ «Цяжка адказаць» |

**Табліца 4.** Варыянты адказаў на пытанне: «Ці падтрымліваеце Вы захаванне ў Рэспубліцы Беларусь смяротнага пакарання ў якасці выключнай меры крымінальнага пакарання?» — для кожнай умоўнай групы праваабаронцаў

| | Умоўныя групы праваабаронцаў | | |
|---|---|---|---|
| | «Рыгарысты» | «Рэалісты» | «Рэлятывісты» |
| **Ці падтрымліваеце Вы захаванне ў Рэспубліцы Беларусь смяротнага пакарання ў якасці выключнай меры крымінальнага пакарання?** | «Не» | «Не»/ «Цяжка адказаць» | «Да»/»Не»/ «Цяжка адказаць» |

Размеркаванне ўсіх рэспандэнтаў па ўмоўным групам праваабаронцаў прадстаўлена ў табліцы 5.

**Табліца 5.** Размеркаванне рэспандэнтаў па ўмоўных групах праваабаронцаў, чал., %

| Умоўныя групы праваабаронцаў | Колькасць | Працэнты |
|---|---|---|
| «Рыгарысты» | 23 | 46 |
| «Рэалісты» | 18 | 36 |
| «Рэлятывісты» | 9 | 18 |
| **Усяго** | 50 | 100 |

Такім чынам, практычна адносна паловы рэспандэнтаў (46%) можна сказаць, што яны безумоўна падзяляюць базавыя характарыстыкі праваабарончай дзейнасці, а пераважная большасць, як мінімум, часткова згодная з імі (82%). У той жа час, важна адзначыць, што рэспандэнты з адной і той жа арганізацыі могуць трапляць у розныя групы, калі, зыходзячы з атрыманых адказаў, адзін рэспандэнт можа быць аднесены да ліку «рыгарыстаў», а другі — да ліку «рэлятывістаў».

Агулам, такая сітуацыя сведчыць пра тое, што, з аднаго боку, большасць рэспандэнтаў падзяляе агульныя прынцыпы і ўстаноўкі, але, у той жа час, у праваабарончым сектары прысутнічаюць групы з рознымі пазіцыямі, уключаючы і дыяметральна супрацьлеглыя («рыгарысты» і «рэлятывісты»). Некаторыя рэспандэнты давалі супрацьлеглыя адказы на пытанні пра падобныя характарыстыках: так, рэспандэнт мог цалкам пагаджацца з тым, што «праваабарончая дзейнасць тычыцца заахвочвання і абароны правоў членаў любых груп насельніцтва», але толькі часткова пагаджацца з тым, што «праваабаронцы прызнаюць універсальнасць правоў чалавека для ўсіх без якога-небудзь адрознення». У асобных выпадках сумневы рэспандэнтаў (варыянт адказу «Цяжка адказаць») адносна, здавалася б, бясспрэчных для праваабаронцаў характарыстыках (кшталту: «Праваабарончая дзейнасць — гэта дзейнасць асобных людзей, груп або інстытутаў грамадства, якія заахвочваюць і абараняюць агульнапрызнаныя правы чалавека і асноўныя свабоды», «Праваабарончая дзейнасць не ўключае ў сябе дзейнасць, звязаную з правядзеннем або прапагандай актаў гвалту» і г.д.) могуць быць звязаныя са звышкваліфікацыяй рэспандэнтаў, якія ведаець значна больш аб гэтых прынцыпах, чым схоплена ў кароткіх фармулёўках характарыстык.

Групы рэспандэнтаў могуць істотна адрознівацца ў пытанні абароны правоў асобных мэтавых груп, асабліва ў аспекце публічных дзеянняў:

- «Рыгарысты» больш, чым па выбарцы агулам, схільныя выступаць публічна ў абарону ўсіх названых груп. «Рэалісты» менш ахвотна, чым дзве іншыя групы, гатовыя публічна выступаць у падтрымку эмігрантаў-мусульман, прадстаўнікоў ЛГБТ-супольнасці і тэрарыстаў, чыя віна даказаная; яны таксама істотна менш за «рыгарыстаў» гатовыя аказваць публічную падтрымку баптыстам, бежанцам, зняволеным;

- «Рэлятывісты» ў меншай ступені, чым іншыя групы, гатовыя публічна выступаць у падтрымку жанчын, нацыянальных меншасцей, баптыстаў, людзей з інваліднасцю, палітычных зняволеных;

- «Рэлятывісты» ў большай ступені, чым «рэалісты», гатовыя выступіць у падтрымку эмігрантаў-мусульман, тэрарыстаў, чыя віна даказаная, і прадстаўнікоў ЛГБТ-супольнасці. Агулам, «рэлятывісты» менш, чым іншыя групы, гатовыя да публічных дзеянняў у падтрымку любых мэтавых груп (гл. табліцу 6 і дыяграму 19).

Умоўныя групы «рыгарыстаў», «рэалістаў» і «рэлятывістаў» таксама могуць адрозніваца адносна магчымасці выкарыстання этычна сумніўных метадаў у рабоце праваабаронцаў. Так, амаль трэць «рэалістаў» (пяць рэспандэнтаў) дапусціла магчымасць выкарыстання незаконных метадаў работы (хабар, подкуп, набыццё сакрэтнай дзяржаўнай інфармацыі і г.д.), калі гэта адзіны спосаб дамагчыся пастаўленых мэтаў. У адрозненне ад іх, і «рыгарысты», і «рэлятывісты» хутчэй схільныя ўстрымлівацца ад выкарыстання незаконных метадаў (гл. табліцу 7 і дыяграму 20).

**Табліца 6.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў з умоўных груп праваабаронцаў адносна ўдзелу ў кампаніях па абароне мэтавых груп — па варыянце адказу: «Буду выступаць у абарону іх правоў публічна», чал., %

| **Калі б да Вас звярнуліся з прапановай уключыцца ў кампанію па абароне правоў наступных груп, як бы Вы паступілі?** | | **Буду выступаць у абарону іх правоў публічна** | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | «Рыгарысты» | «Рэалісты» | «Рэлятывісты» | **Усяго па выбарцы** |
| Жанчыны | Колькасць | 21 | 15 | 6 | 42 |
| | Працэнты | 91,3 | 83,3 | 66,7 | 84,0 |
| Нацыянальныя меншасці | Колькасць | 21 | 15 | 7 | 43 |
| | Працэнты | 91,3 | 83,3 | 77,8 | 86,0 |
| Эмігранты-мусульмане | Колькасць | 17 | 10 | 7 | 34 |
| | Працэнты | 73,9 | 55,6 | 77,8 | 68,0 |
| Бежанцы | Колькасць | 22 | 13 | 7 | 42 |
| | Працэнты | 95,7 | 72,2 | 77,8 | 84,0 |
| Баптысты, евангелісты | Колькасць | 20 | 11 | 5 | 36 |
| | Працэнты | 87,0 | 61,1 | 55,6 | 72,0 |
| Прадстаўнікі ЛГБТ-супольнасці | Колькасць | 19 | 8 | 7 | 34 |
| | Працэнты | 82,6 | 44,4 | 77,8 | 68,0 |
| Людзі з інваліднасцю | Колькасць | 21 | 17 | 8 | 46 |
| | Працэнты | 91,3 | 94,4 | 88,9 | 92,0 |
| Зняволеныя | Колькасць | 22 | 14 | 7 | 43 |
| | Працэнты | 95,7 | 77,8 | 77,8 | 86,0 |
| Тэрарысты, віна якіх даказана | Колькасць | 11 | 5 | 4 | 20 |
| | Працэнты | 47,8 | 27,8 | 44,4 | 40,0 |
| Палітычныя актывісты | Колькасць | 21 | 17 | 7 | 45 |
| | Працэнты | 91,3 | 94,4 | 77,8 | 90,0 |

**Дыяграма 19.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў з умоўных груп праваабаронцаў адносна ўдзелу ў кампаніях па абароне мэтавых груп — па варыянце адказу: «Буду выступаць у абарону іх правоў публічна», %



**Табліца 7.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў з умоўных груп праваабаронцаў адносна магчымасці выкарыстання ў рабоце этычна сумнеўных метадаў, чал., %

| **Ці можа праваабарончая арганізацыя выкарыстоўваць незаконныя метады работы, напрыклад, хабар, подкуп, купля сакрэтнай дзяржаўнай інфармацыі і г.д.?** | | «Рыгарысты» | «Рэалісты» | «Рэлятывісты» | **Усяго па выбарцы** |
|---|---|---|---|---|---|
| Часам можа, залежыць ад сітуацыі, напрыклад, калі гэта адзіны спосаб дамагчыся пастаўленых мэтаў | Колькасць | 2 | 5 | 1 | 8 |
| | Працэнты | 8,7 | 27,8 | 11,1 | 16,0 |
| Не, не можа | Колькасць | 19 | 12 | 8 | 39 |
| | Працэнты | 82,6 | 66,7 | 88,9 | 78,0 |
| Цяжка адказаць | Колькасць | 2 | 1 | 0 | 3 |
| | Працэнты | 8,7 | 5,6 | 0,0 | 6,0 |
| **Усяго** | Колькасць | 23 | 18 | 9 | 50 |
| | Працэнты | 100,0 | 100,0 | 100,0 | 100,0 |

**Дыяграма 20.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў з умоўных груп праваабаронцаў адносна магчымасці выкарыстання ў рабоце этычна сумнеўных метадаў, %




Абсалютна ўсе рэспандэнты, аднесеныя да групы «рыгарысты», назвалі недапушчальным распаўсюд заведама непраўдзівай інфармацыі, нават калі гэта можа прывесці да станоўчых вынікаў. «Рэалісты» ж апынуліся не настолькі катэгарычнымі ў гэтым пытанні: тры рэспандэнты з гэтай групы мелі цяжкасці з адказам на пастаўленае пытанне. «Рэлятывісты» былі яшчэ менш катэгарычнымі адносна магчымасці выкарыстання заведама непраўдзівай інфармацыі ў добрых мэтах: частка «рэлятывістаў» (два рэспандэнты з дзевяці) дапусціла такую магчымасць, а яшчэ адзін — меў цяжкасці з адказам (гл. табліцу 8 і дыяграму 21).

**Табліца 8.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў з умоўных груп праваабаронцаў адносна магчымасці выкарыстання ў рабоце заведама няпраўдзівай інфармацыі, чал., %

| **Ці можа праваабарончая арганізацыя распаўсюджваць заведама недакладную інфармацыю, калі, на яе думку, гэта можа прывесці да станоўчых вынікаў?** | | «Рыгарысты» | «Рэалісты» | «Рэлятывісты» | **Усяго па выбарцы** |
|---|---|---|---|---|---|
| Часам можа, залежыць ад сітуацыі, напрыклад, калі гэта адзіны спосаб дамагчыся пастаўленых мэтаў | Колькасць | 0 | 0 | 2 | 2 |
| | Працэнты | 0,0 | 0,0 | 22,2 | 4,0 |
| Не, не можа | Колькасць | 23 | 15 | 6 | 44 |
| | Працэнты | 100,0 | 83,3 | 66,7 | 88,0 |
| Цяжка адказаць | Колькасць | 0 | 3 | 1 | 4 |
| | Працэнты | 0,0 | 16,7 | 11,1 | 8,0 |
| **Усяго** | Колькасць | 23 | 18 | 9 | 50 |
| | Працэнты | 100,0 | 100,0 | 100,0 | 100,0 |

**Дыяграма 21.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў з умоўных груп праваабаронцаў адносна магчымасці выкарыстання ў рабоце заведама няпраўдзівай інфармацыі, %



# Дзейнасць праваабарончых арганізацый

## Сферы дзейнасці беларускіх праваабаронцаў

У адпаведнасці з адказамі рэспандэнтаў, у сферу дзейнасці больш за палову арганізацый праваабарончага сектара Беларусі трапляюць такія асноўныя правы і свабоды чалавека як:

- права на справядлівы суд (пазначалі 78% рэспандэнтаў);
- свабода выражэння поглядаў і доступ да інфармацыі (72%);
- свабода сходаў і аб’яднанняў (66%);
- права на свабоду і асабістую недатыкальнасць (права на абарону ад адвольнага затрымання) (62%);
- забарона дыскрымінацыі па любой прыкмеце (60%);
- права на эфектыўныя сродкі прававой абароны ад парушанага права (56%);
- свабода думкі, сумлення і рэлігіі (52%);
- свабода ад катаванняў і жорсткага абыходжання (50%).

Ад чвэрці да паловы рэспандэнтаў пазначала, што ў сферу праваабарончай дзейнасці іх арганізацый трапляюць наступныя правы і свабоды чалавека:

- права на жыццё (пазначалі 48% рэспандэнтаў);
- права на свабодныя выбары (44%);
- павага да прыватнага і сямейнага жыцця (40%);
- права на працу і права на справядлівыя і спрыяльныя ўмовы працы (38%);
- свабода перамяшчэння і свабода выбару месца пражывання (32%);
- права на адукацыю (32%);
- забарона смяротнага пакарання ў мірны час (32%);
- права на камунікацыю (30 %) (гл. дыяграму 22).

Тры рэспандэнты выбралі варыянт адказу «Іншая», пазначыўшы наступнае:

> *«Кансультуем па пытаннях адвакатавання ў іншых галінах правоў чалавека, «мабільнае рэагаванне» — удзел у кампаніях па іншых тэматыках у галіне правоў чалавека»;*
>
> *«Права на альтэрнатыўную службу»;*
>
> *«Права на ўдзел у прыняцці рашэнняў».*

**Дыяграма 22.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна правоў і свабод чалавека, якія патрапляюць у сферы дзейнасці беларускіх праваабарончых арганізацый, %



Гіпотэза наконт таго, што больш «маладыя» і больш «дасведчаныя» арганізацыі маюць істотныя разыходжанні ў сферах праваабарончай дзейнасці, не пацвердзілася. Профілі розных груп арганізацый шмат у чым падобныя. З вялікай доляй умоўнасці можна казаць пра тое, што пытанні свабоды сходаў і аб'яднанняў і права на свабодныя выбары з'яўляюцца прэрагатывай больш «дасведчаных» арганізацый, у той час як абаронай права на мір і пытаннямі забароны калектыўнай высылкі замежнікаў займаюцца (практычна эксклюзіўна) «маладыя» арганізацыі. Трэба заўважыць, што вельмі «маладыя» арганізацыі (існуючыя менш за тры гады) практычна не работаюць з пытаннямі абароны права на жыццё (толькі 14% рэспандэнтаў з гэтай групы пазначалі, што дадзеныя пытанні знаходзяцца ў сферы дзейнасці іх арганізацый, у той час як у іншых групах на гэта ўказалі каля 50% рэспандэнтаў).

Аднак трэба адзначыць, што шэраг сфер з'яўляецца агульным для груп арганізацый, незалежна ад тэрміну іх існавання. Так, напрыклад, права на эфектыўныя сродкі прававой абароны адзначыла пераважная большасць рэспандэнтаў з груп арганізацый, якія існуюць менш за тры гады і ад 6 да 10 гадоў, і толькі каля 45% рэспандэнтаў — з груп арганізацый, якія існуюць ад 3 да 5 гадоў і больш за 10 гадоў. Права на свабоду і асабістую недатыкальнасць адзначыла больш за ўсё рэспандэнтаў з груп арганізацый, якія існуюць менш за тры гады і больш за 10 гадоў (гл. дыяграму 23).

**Дыяграма 23.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна некаторых правоў і свабод чалавека, якія патрапляюць у сферы дзейнасці арганізацый з розным тэрмінам існавання, %



**Дыяграма 24.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна правоў і свабод чалавека, якія патрапляюць у сферы дзейнасці зарэгістраваных і незарэгістраваных арганізацый, %



Што тычыцца адрозненняў у сферах праваабарончай дзейнасці паміж арганізацыямі, зарэгістраванымі ў Беларусі, за мяжой і не маючых рэгістрацыі, то відавочных супярэчнасцей таксама не назіраецца. Асноўная раздзяляльная рыса паміж дадзенымі тыпамі арганізацый пралягае ў тым плане, што ў арганізацый, якія не маюць дзяржаўнай рэгістрацыі ў Беларусі, больш вузкі тэматычны фокус дзейнасці, які ўключае пералік дзясятка правоў і свабод (права на справядлівы суд, свабоду выказвання поглядаў, свабоду сходаў і асацыяцый і інш.). Зарэгістраваныя ж у Беларусі арганізацыі працуюць з больш шырокім спектрам праваабарончых тым (гл. дыяграму 24).

## Мэтавыя групы беларускіх праваабарончых арганізацый

Што тычыцца мэтавых груп (кліентаў, выгадаатрымальнікаў) беларускіх праваабарончых арганізацый, то праваабарончы сектар працуе з вялікай разнастайнасцю катэгорый насельніцтва. Згодна адказам рэспандэнтаў, ні адна з мэтавых груп не з’яўляецца агульнай для ўсяго беларускага праваабарончага сектара ці хаця б большасці арганізацый. Катэгорыі насельніцтва, якія пазначыла найбольшая колькасць рэспандэнтаў: грамадства/насельніцтва агулам (52% рэспандэнтаў), грамадскія і палітычныя актывісты (50%), арганізацыі грамадзянскай супольнасці (46%) (гл. дыяграму 25).

**Дыяграма 25.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна мэтавых груп праваабарончых арганізацый, %



Таксама рэспандэнты назвалі яшчэ дзевяць мэтавых груп:

*«Агулам, залежыць ад праекта, няма абмежаванняў па мэтавай групе»*;

*«Журналісты і супрацоўнікі СМІ»*;

*«Мужчыны»*;

*«Пісьменнікі»*;

*«Пісьменнікі, журналісты, творцы»*;

*«Мэтавая група — чыноўнікі, бізнес, моладзь»*;

*«Усе слаі насельніцтва»*;

*«Студэнты, маладыя спецыялісты»*;

*«Працоўныя»*.

## Узроўні дзейнасці праваабарончых арганізацый

Галоўным чынам, беларускія праваабарончыя арганізацыі працуюць на ўзроўні Беларусі і на міжнародным узроўні, а таксама на ўзроўні буйных гарадоў. Пераважная большасць рэспандэнтаў (88%) пазначала, што іх арганізацыі працуюць на нацыянальным (рэспубліканскім) узроўні, варыянт адказу «На міжнародным узроўні» выбралі 82% рэспандэнтаў.

Буйныя гарады (г. Мінск і абласныя цэнтры) у якасці ўзроўню працы сваіх арганізацый назвала толькі каля паловы рэспандэнтаў: 54% рэспандэнтаў выбралі варыянт адказу «г. Мінск», 40% рэспандэнтаў — варыянт «абласныя цэнтры».

Раённыя цэнтры ў якасці ўзроўню сваёй дзейнасці назвалі 24% рэспандэнтаў; гарады раённага падпарадкавання, адміністрацыйныя адзінкі субнацыянальнага ўзроўню (вобласці і раёны); сельскую мясцовасць — па 16% рэспандэнтаў, адпаведна; гарады раённага падпарадкавання — 14% рэспандэнтаў (гл. дыяграму 26).

Аналіз адказаў рэспандэнтаў выявіў размеркаванне розных тыпаў арганізацый па рэгіянальных узроўнях дзейнасці. Асноўнае адрозненне назіраецца паміж профілем арганізацый, якія працуюць на міжнародным і нацыянальным узроўнях, і профілем арганізацый, якія працуюць на субнацыянальных узроўнях.

Дзейнасць арганізацый на субнацыянальных узроўнях пазначыла значна больш рэспандэнтаў з арганізацый, якія маюць дзяржаўную рэгістрацыю ў Беларусі, чым з арганізацый, зарэгістраваных за мяжой альбо не маючых рэгістрацыі (гл. дыяграму 27).

Таксама на субнацыянальных узроўнях радзей працуюць «маладыя» арганізацыі (існуючыя менш за 5 гадоў) і арганізацыі са штатам меней 10 чалавек (гл. дыяграмы 28 і 29).

**Дыяграма 26.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна рэгіянальных узроўняў дзейнасці арганізацый, %




**Дыяграма 27.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў з арганізацый, якія маюць і якія не маюць дзяржаўную рэгістрацыю, адносна рэгіянальных узроўняў дзейнасці арганізацый, чал.



**Дыяграма 28.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў з арганізацый з розным тэрмінам існавання адносна рэгіянальных узроўняў дзейнасці арганізацый, чал.




**Дыяграма 29.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў з арганізацый з рознай колькасцю супрацоўнікаў адносна рэгіянальных узроўняў дзейнасці арганізацый, чал.



## Кіраванне ў арганізацыях

Спецыяльнае пытанне было накіравана на выяўленне характару кіравання ў праваабарончых арганізацыях, наколькі кіраванне персаналізаванае, якую ролю граюць калегіяльныя органы.

Згодна адказам рэспандэнтаў, у праваабарончых арганізацыях рашэнні прымаюцца, як правіла, калегіяльнымі органамі, часцей саветамі. Аднак выдзяляюцца рашэнні, звязаныя з унутранай дзейнасцю арганізацый (прыём на працу новых супрацоўнікаў, рашэнні наконт абароны кліентаў, падача праектаў), якія прымаюцца часцей за ўсё індывідуальна кіраўнікамі або адказнымі супрацоўнікамі (гл. дыяграму 30).

**Дыяграма 30.** Размеркаванне арганізацый па органах прыняцця рашэнняў, частата




Можна адзначыць чатыры арганізацыі, у якіх асоба кіраўніка мае вырашальнае значэнне: рэспандэнты з гэтых арганізацый пазначылі, што кіраўнік прымае ўсе тыпы рашэнняў. Яшчэ ў трох арганізацыях кіраўнікі прымаюць палову ўсіх рашэнняў.

Агульны сход з’яўляецца асноўным органам прыняцця рашэнняў у двух арганізацыях. Таксама з’яўляецца цікавым кейс адной арганізацыі, калі адзін з пары рэспандэнтаў, якія прадстаўлялі адную і тую ж арганізацыю, даваў «правільныя» адказы: ён ва ўсіх выпадках пазначыў, што рашэнні ў арганізацыі прымаюцца агульным сходам, у той час як яго «напарнік» толькі ў адным выпадку назваў агульны сход, а ў астатніх выпадках — што рашэнні прымаюцца і супрацоўнікамі, і кіраўніком, і саветам, і толькі аднойчы гэты рэспандэнт меў цяжкасці з адказам.

З упэўненасцю можна сказаць, што ў большасці праваабарончых арганізацый калегіяльна прымаюцца рашэнні аб выступе з публічнымі заявамі ад імя арганізацыі: у 18 з 20 выпадкаў парамі рэспандэнтаў, якія прадстаўлялі адныя і тыя ж арганізацыі, былі дадзеныя аднолькавыя адказы. Па астатніх тыпах рашэнняў колькасць арганізацый, чые прадстаўнікі далі несупадаючыя адказы, вар'іруецца ад 5 да 10 арганізацый.

Нам падалося цікавым асобна разгледзець арганізацыі, якія былі прадстаўленыя ў даследаванні парамі рэспандэнтаў, і прааналізаваць супадаючыя і несупадаючыя адказы «напарнікаў». Такіх арганізацый у даследуемай сукупнасці аказалася 20. Як мінімум, у палове арганізацый па кожнаму пытанню «напарнікі» далі аднолькавыя адказы. Як і ва ўсёй даследуемай сукупнасці, у дадзеным выпадку было пазначана, што часцей за ўсё індывідуальна прымаюцца рашэнні, важныя для ўнутранага жыцця арганізацый, кшталту: прыём на працу новых супрацоўнікаў (у шасці арганізацыях падобныя рашэнні часцей за ўсё прымаюцца кіраўнікамі) і падача праектаў (у пяці арганізацыях за гэта часцей за ўсё адказваюць кіраўнікі, а яшчэ ў адной арганізацыі — адказны супрацоўнік) (гл. дыяграму 31).

**Дыяграма 31.** Размеркаванне па органах прыняцця рашэнняў арганізацый, прадстаўленых у даследаванні парамі рэспандэнтаў*, частата




* Падвыбарка з 20 арганізацый, якія былі прадстаўленыя ў даследаванні парамі рэспандэнтаў.

Ні ў адной арганізацыі з дадзенай падвыбаркі калегіяльныя органы не прымаюць удзел у вырашэнні пытанняў адносна абароны кліентаў. У большасці арганізацый такія рашэнні прымаюць адказныя супрацоўнікі, а ў адной з арганізацый — кіраўнік. У той жа час, пры адказе на пастаўленае пытанне больш за ўсё пар рэспандэнтаў (з 10 арганізацый) далі несупадаючыя адказы. Аналіз іх адказаў паказвае, што калегіяльныя органы задзейнічаныя ў прыняцце рашэнняў аб абароне кліентаў у нязначнай ступені: з 20 рэспандэнтаў 12 пазначылі, што дадзеныя рашэнні прымаюцца індывідуальна (адказнымі супрацоўнікамі або кіраўнікамі), і толькі пяць рэспандэнтаў назвалі калегіяльныя органы ў якасці тых, хто прымае рашэнні (астатнія рэспандэнты альбо прапусцілі пытанне, альбо выбралі варыянт адказу «Не ведаю»).

Асобную цікавасць прадстаўляюць адрозненні ў адказах пар рэспандэнтаў адносна прыняцця рашэнняў у арганізацыях. Па выніках апытання, у такіх пар рэспандэнтаў было зафіксавана 56 несупадаючымі адказаў. Толькі ў выпадку двух пар ад рэспандэнтаў былі атрыманыя супадаючыя адказы. Часцей за ўсё, у пары адзін з рэспандэнтаў у якасці асобы, якая прымае рашэнне, называў кіраўніка або адказнага супрацоўніка, другі рэспандэнт — адзін з калегіяльных органаў (савет, агульны сход, актыў) (30% несупадаючымі адказаў).

У 18% выпадкаў аднымі з парных рэспандэнтаў былі названыя калегіяльныя органы, другімі быў выбраны варыянт адказу «Не ведаю» альбо пытанне было прапушчана. У 16% выпадкаў адныя парныя рэспандэнты пазначылі, што рашэнні прымаюцца кіраўнікамі альбо адказнымі супрацоўнікамі, а другія парныя рэспандэнты выбралі варыянт «Не ведаю» альбо пытанне імі было прапушчана. У 14% выпадкаў рэспандэнтамі было названа, што рашэнні прымаюцца індывідуальна альбо адказнымі супрацоўнікамі, альбо кіраўнікамі. У 9% выпадкаў парнымі рэспандэнтамі былі выбраныя адказы з кластара калегіяльных органаў (рада, агульны сход, актыў) (гл. дыяграму 32).

**Дыяграма 32.** Размеркаванне несупадаючых адказаў у пар рэспандэнтаў, якія прадстаўлялі ў даследаванні адныя і тыя ж арганізацыі, частата, %



Аналіз адказаў рэспандэнтаў, якія ў даследаванні прадстаўлялі свае арганізацыі ў адзіночным ліку, не выявіў значных адрозненняў у характары кіравання гэтых арганізацый (гл. дыяграму 33).

**Дыяграма 33.** Размеркаванне па органах прыняцця рашэнняў арганізацый, прадстаўленых у даследаванні па адным рэспандэнту*, частата




* Падвыбарка з 10 арганізацый, якія былі прадстаўлены ў даследаванні па адным рэспандэнту.

## Вызначальныя фактары ў дзейнасці

Вызначальнымі фактарамі ў дзейнасці праваабарончых арганізацый з'яўляюцца патрэбы мэтавай групы (92% рэспандэнтаў пазначылі, што гэты фактар уплывае ў вялікай і вельмі вялікай ступені) і стратэгія арганізацыі (88% назвалі ўплыў гэтага фактару як вялікі і вельмі вялікі). Іншыя фактары ў значна меншай ступені вызначаюць дзейнасць арганізацый. Так, па сукупнасці адказаў «У вялікай ступені» і «У вельмі вялікай ступені» трэцім па значнасці фактарам з'яўляюцца стратэгіі, прынятыя на міжнародным узроўні. Затым — прыярытэты донарскіх праграм (22%) і стратэгіі, прынятыя групай арганізацый, кааліцыяй альбо парасонавай структурай (20%). У меншай ступені гэтыя фактары вызначаюць дзейнасць арганізацый, згодна з меркаваннем 36-56% рэспандэнтаў. Разам з тым, 14-24% рэспандэнтаў пазначылі, што гэтыя фактары ўплываюць у найменшай ступені. Найменшае значэнне для дзейнасці беларускіх праваабарончых арганізацый маюць стратэгіі, прынятыя дзяржаўнымі органамі Беларусі: больш за палову рэспандэнтаў пазначыла, што тыя не з'яўляюцца вызначальнымі фактарамі, 28% — што тыя ўплываюць у малой ступені і 2% — што тыя ўплываюць у вялікай ступені (гл. дыяграму 34).

**Дыяграма 34.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна вызначальных фактараў у дзейнасці арганізацый, %




## Інструменты, якія выкарыстоўваюцца праваабарончымі арганізацыямі

Для дасягнення сваіх мэтаў пераважная большасць праваабарончых арганізацый выкарыстоўвае: правядзенне публічных мерапрыемстваў (гэты інструмент назвалі 86% рэспандэнтаў), прававую дапамогу ў выглядзе кансультацый (84%), адукацыйныя і асветніцкія мерапрыемствы аб правах чалавека (82%), распаўсюд інфармацыі аб парушэннях правоў чалавека і спосабах іх абароны (80%), збор інфармацыі аб парушэнні правоў чалавека (78%).

Трэба адзначыць, што часта праваабарончыя арганізацыі для дасягнення сваіх мэтаў звяртаюцца да супрацоўніцтва як з іншымі праваабаронцамі, так і з грамадскімі арганізацыямі з іншых сектараў. Таксама больш за палову рэспандэнтаў пазначыла, што іх арганізацыі выкарыстоўваюць такія інструменты, як маніторынг і дакументаванне парушэнняў правоў чалавека, падрыхтоўка дакладаў і справаздач, праблемны аналіз і падрыхтоўка аналітычных дакументаў і даследаванняў.

Да ліку менш выкарыстоўваемых інструментаў адносяцца: арганізацыя акцый і кампаній у абарону правоў чалавека, формы ўзаемадзеяння з дзяржаўнымі органамі (распрацоўка праектаў нарматыўных дакументаў, удзел у грамадскіх, кансультацыйных і экспертных саветах, маніторынг выканання рашэнняў органаў улады), расследаванне фактаў парушэнняў правоў чалавека, аказанне неправавой (медыцынскай, псіхалагічнай, матэрыяльнай) дапамогі ахвярам парушэнняў правоў чалавека (гл. дыяграму 35).

**Дыяграма 35.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна інструментаў, якія выкарыстоўваюцца ў дзейнасці праваабарончых арганізацый, %



# Уяўленні аб праблемах і дасягненнях праваабарончых арганізацый

## Праблемы праваабарончых арганізацый

Рэспандэнты (49 удзельнікаў даследавання), адказваючы на адкрытае пытанне адносна таго, з якімі трыма асноўнымі праблемамі сутыкаецца іх арганізацыя, назвалі ў сукупнасці 124 праблемы. Прааналізаваўшы адказы, мы выдзелілі дзевяць праблемных сфер, большасць з якіх з’яўляецца агульнымі для многіх арганізацый сектара (гл. дыяграму 36).

Дзве праблемы з’яўляюцца актуальнымі для паловы праваабарончых арганізацый: гэта фінансаванне і ўзаемаадносіны з дзяржавай. Фінансаванне з’яўляецца галоўнай праблемай: рэспандэнты назвалі яе 31 раз, прычым 16 рэспандэнтаў назвалі гэтую праблему ў першую чаргу. Праблема мае розныя аспекты: адсутнасць фінансавання, недастатковасць фінансавання, нестабільнасць фінансавання, высокія выдаткі (напрыклад, высокая арэндная плата за офіс), праблема рэгістрацыі фінансавання.

Другая па колькасці ўзгадванняў праблема — гэта розныя аспекты нездавальняючага ўзаемадзеяння з дзяржавай (29 узгадванняў). Гэтую праблему рэспандэнты часцей за ўсё называлі ў другую чаргу (15 рэспандэнтаў паставілі гэтую праблему на другое месца). Гэтая праблемная вобласць уключае ў сябе два вялікіх аспекты: з аднаго боку, гэта нежаданне дзяржавы супрацоўнічаць; з другога боку, гэта ціск з боку дзяржавы. Таксама называліся: дзейнасць ДАНДА (*GONGO*), палітыка дзяржавы ў сферы правоў чалавека.

Астатнія праблемы маюць значэнне для значна меншай колькасці арганізацый. Так, праблемы, якія мы аб’ядналі ў кластар «Стратэгічнае і арганізацыйнае развіццё», былі названыя толькі 13 разоў. Сюды адносяцца такія праблемы як: уласна аргразвіццю, адсутнасць стратэгічнага плана арганізацыі і перагляд стратэгіі, крызіс кіравання і пераемнасць пакаленняў, дрэннае асвятленне дзейнасці ў СМІ, імідж, што ўстаяўся за 20 гадоў, недастатковае веданне англійскай мовы сярод праваабаронцаў.

Адсутнасць дзяржаўнай рэгістрацыі ў Беларусі з’яўляецца праблемай для арганізацый, згодна з меркаваннем 11 рэспандэнтаў, прычым для большасці з іх — першаснай праблемай.

10 разоў былі ўзгаданыя праблемы, звязаныя з недахопам кадраў у арганізацыях. Былі названыя такія аспекты як: недахоп кваліфікаваных кадраў агулам, а таксама нязначная колькасць экспертаў у рэгіёнах, маладых кваліфікаваных кадраў, недахоп валанцёраў. Адзін з рэспандэнтаў назваў праблемай сваёй арганізацыі цякучку кадраў.

Восем разоў былі названыя праблемы, якія маюць дачыненне да супрацоўніцтва праваабарончых арганізацый паміж сабой і з іншымі грамадскімі арганізацыямі. Гэтыя праблемы не з’яўляюцца першачарговымі. Канкрэтныя праблемы ў гэтай галіне: кансалідацыя і адсутнасць узаемадзеяння з іншымі праваабарончымі арганізацыямі, нежаданне вялікіх арганізацый дапускаць новыя арганізацыі ў поле, нацягнутыя адносіны з мясцовымі партнёрамі, адсутнасць камунікацыі з іншымі грамадскімі арганізацыямі.

Найбольш часта ўзгадваемай праблемай унутры калектываў праваабарончых арганізацый з’яўляецца прафесійнае выгаранне, стомленасць (4 з 6 узгадванняў).

Да агульных умоў дзейнасці адносяцца такія праблемы як: адсутнасць свабоды поглядаў і доступу да СМІ, адсутнасць незалежных судоў, агульныя палітычныя праблемы ў краіне, слабасць грамадзянскай супольнасці.

Таксама апытаныя праваабаронцы назвалі: праблемы недахопу салідарнасці ў грамадстве, незацікаўленасць мэтавай аўдыторыі, прававую непісьменнасць насельніцтва, недахоп прававой дапамогі, заангажаванасьць, неразуменне каштоўнасцей, правакацыі.

**Дыяграма 36.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна асноўных праблем праваабарончых арганізацый, частата



## Дасягненні праваабарончых арганізацый

На адкрытае пытанне адносна трох асноўных дасягненняў сваіх арганізацый за апошнія тры гады ўдзельнікі даследавання (48 рэспандэнтаў) далі ў сукупнасці 130 адказаў. Адзін рэспандэнт адзначыў, што дасягненні яго арганізацыі не датычацца праваабарончай дзейнасці, яшчэ адзін — прапусціў пытанне.

Часцей за ўсё ўдзельнікі даследавання называлі дасягнення сваіх арганізацый у сферы супрацоўніцтва (з іншымі праваабарончымі і неправаабарончымі беларускімі арганізацыямі, з дзяржавай, з міжнароднымі структурамі). У сукупнасці рэспандэнты далі 22 адказы, якія можна аднесці да гэтага кластара. Некалькі прыкладаў:

> *«Актыўны ўдзел у дзейнасці Беларускай нацыянальнай платформы»*;
>
> *«Развіваецца ўзаемадзеянне з уладамі»*;
>
> *«Наладжванне міжнародных кантактаў»*;
>
> *«Рэалізаваны буйны сумесны праект»*.

Таксама было названа некалькі сумесных мерапрыемстваў з іншымі арганізацыямі.

Другі па колькасці ўзгадванняў тып дасягненняў праваабарончых арганізацый — гэта змены ў заканадаўстве і правапрымяняльнай практыцы (20 узгадванняў). Мы аднеслі сюды не толькі прынятыя змены ў заканадаўстве, але і распрацоўку канкрэтных прапаноў па зменах, і працу ў сферы змены пэўных галін заканадаўства. Таксама мы ўключылі ў гэтую групу такія адказы як: *«доступ у месцы пазбаўлення волі»* і *«рамонт Цэнтра ізаляцыі правапарушальнікаў»*.

На трэцяй пазіцыі па колькасці ўзгадванняў — кластар «Развіццё арганізацыі» (16 узгадванняў). Чатыры ўзгадвання тычацца распрацоўкі і прытрымлівання стратэгічнага плана, два разы ўзгадваўся салідны ўзрост арганізацыі (20 гадоў), два разы — колькасць чалавек у арганізацыі, два разы — той факт, што арганізацыя выжыла, адзін раз дасягненнем быў названы факт стварэння арганізацыі. Таксама называліся: фармалізацыя кіравання ў арганізацыі, аднаўленне інтэрнэт-рэсурса, навучанне членаў арганізацыі, фінансавая ўстойлівасць і прафесіяналізацыя дзейнасці.

14 разоў удзельнікі даследавання назвалі ў якасці дасягнення паляпшэнне іміджу сваёй арганізацыі: давер, павага, пазнавальнасць арганізацыі, рост аўтарытэта. Адзін з рэспандэнтаў назваў дасягненнем сваёй арганізацыі *«прызнанне як апанента ўладаў»*. Таксама мы аднеслі сюды два ўзгадвання адносна атрымання прэмій (адна прэмія была прысуджана кіраўніку арганізацыі, другая — сайту арганізацыі) і атрыманне адным з кіраўнікоў арганізацыі дзяржаўнай пасады.

Важнымі дасягненнямі рэспандэнты лічаць таксама поспехі ў працы са сваімі мэтавымі групамі (13 узгадванняў). Рэспандэнты называлі: дапамога, кансультацыі, навучанне, рэкамендацыі.

Таксама рэспандэнты лічаць сваімі дасягненнямі агульнае паляпшэнне ў сваёй сферы дзейнасці (12 узгадванняў): асвета шырокага кола людзей, паляпшэнне прававой граматнасці мэтавай групы, праца з МУС па пэўных праблемах, прыцягненне ўвагі да сітуацыі з праблемамі мэтаў групы на ўзроўні Савета па правах чалавека ААН, рост папулярнасці беларускай мовы ў грамадстве, доступ чытачоў да новай еўрапейскай літаратуры.

Менш за 10 рэспандэнтаў назвалі дасягненні, якія патрапілі ў кластары: «Праекты» (стварэнне баз дадзеных, сістэм дапамогі, правядзенне фестывалей, запуск новых ініцыятыў), «Поспехі ў судах» (апраўдальныя прысуды ў беларускіх судоў і станоўчыя рашэнні Камітэта ААН па правах чалавека), «Развіццё ў дзейнасці арганізацыі» (павышэнне якасці дапамогі, засваенне новых тэм і г.д.), «Аналітыка», «Кампаніі і мерапрыемствы» (гл. дыяграму 37).

**Дыяграма 37.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў па кластарах адносна асноўных дасягненняў праваабарончых арганізацый, частата



## Дасягненні арганізацый грамадзянскай супольнасці ва ўяўленнях праваабаронцаў

На адкрытае пытанне наконт трох асноўных дасягненняў арганізацый грамадзянскай супольнасці за апошнія тры гады адказалі толькі 36 удзельнікаў даследавання, даўшыя агулам 88 адказаў (адзін з адказаў мы не змаглі праінтэрпрэтаваць: *«Вялікі працэс»*). Сем рэспандэнтаў не адказалі на дадзенае пытанне, яшчэ сем рэспандэнтаў мелі цяжкасці з адказам. Гэта сведчыць аб тым, што лідэры і актывісты праваабарончых арганізацый у меншай ступені арыентуюцца ў дзейнасці неправаабарончых грамадскіх арганізацый у параўнанні з дзейнасцю арганізацый унутры свайго сектара. Аналіз адказаў пацвярджае гэта назіранне.

Перш-наперш, трэба сказаць, што ўдзельнікі даследавання часцей за ўсё называлі дасягненнямі грамадзянскай супольнасці кампаніі і сферы ў галіне абароны правоў чалавека: вызваленне палітычных зняволеных (12 узгадванняў), дапамога рэпрэсаваным і барацьба супраць рэпрэсій (6 узгадванняў), падрыхтоўка Універсальнага перыядычнага агляду (УПА) (4 узгадванні), кантроль за выбарчым працэсам (правядзенне кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары», назіранне за выбарамі, дасягненне прагрэсу ў выбарчым заканадаўстве) (4 узгадванні), кампанія за адмену смяротнага пакарання (3 узгадванні), увядзенне альтэрнатыўнай грамадзянскай службы, садзейнічанне дзейнасці Камітэта ААН па правах чалавека і спецдакладчыка ААН (па 2 узгадванні, адпаведна). Таксама рэспандэнты пазначылі ў якасці дасягненняў грамадзянскай супольнасці: супрацоўніцтва праваабарончых арганізацый (правядзенне Другога Усебеларускага праваабарончага форума, пачатак дыялогу з праваабарончымі арганізацыямі) і ўзмацненне ролі праваабарончых арганізацый у вачах грамадства і дзяржавы. Усяго рэспандэнты назвалі дасягненні ў сферы правоў чалавека і праваабарончай дзейнасці 43 разы. Такім чынам, можна казаць пра тое, што лідэры праваабарончых арганізацый разглядаюць дасягненні ў сферы абароны правоў чалавека як галоўныя дасягненні грамадзянскай супольнасці Беларусі.

Дасягненні грамадзянскай супольнасці па-за сферай абароны правоў чалавека былі названыя ў сукупнасці 45 разоў. Адказы размеркаваліся па чатырох амаль роўных кластарах (гл. дыяграму 38).

**Дыяграма 38.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў па кластарах адносна асноўных дасягненняў арганізацый грамадзянскай супольнасці, частата



Кластар «Развіццё ў асобных сферах і пасляховыя кампаніі» ўключае такія адказы як: правядзенне кампаніі «У абарону беларускіх балот», культурніцкіх кампаній («Дзень вышыванкі», курсы беларускай мовы і г.д.), кампаніі па адмене арт. 193-1 КК РБ, фестывалю *МЕТА*, кампаніі па адмене дэкрэта аб *«прыгонным праве»* (на дрэваапрацоўчых прадпрыемствах). Галіны, у якіх удзельнікі даследавання адзначылі прагрэс, — гэта культурныя праекты, фарміраванне нацыянальнай свядомасці, адукацыйная і асветніцкая дзейнасць, актуалізацыя экалагічнай праблематыкі.

Кластар «Павялічванне ролі арганізацый грамадзянскай супольнасці ў грамадстве агулам» уключае такія дасягненні грамадзянскай супольнасці як: павялічванне заўважнасці арганізацый, узмацненне ролі грамадскіх арганізацый у вырашэнні праблем, выхад на больш шырокую аўдыторыю, пашырэнне шэрагаў паслядоўнікаў і г.д.

Кластар «Узаемадзеянне паміж арганізацыямі грамадзянскай супольнасці» ўключае ў сябе чатыры ўзгадванні Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства (ФГС УП) і дзейнасці Беларускай нацыянальнай платформы ФГС УП, а таксама такія канстатацыі як:

> *«Большы выхад за межы «ўнутранага кола»*;
>
> *«Паступова сыходзіць мястэчковасць, арганізацыі «кучкуюцца» ў кааліцыі, групы па інтарэсах, аб’ядноўваюцца»*.

У кластар «Развіццё грамадзянскай супольнасці» мы ўключылі такія ўзгадванні адносна дасягненняў арганізацый грамадзянскай супольнасці як: *«выжылі старыя НДА»*, прафесіяналізацыя, якасная экспертная праца, развіццё краўдфандынга.

## Работа з грамадскай думкай

Практычна ўсе апытаныя лідэры і актывісты пагадзіліся з тым, што беларускае грамадства неабходна інфармаваць аб дзейнасці іх арганізацый: 47 удзельнікаў даследавання, адказваючы на пытанне «Ці лічыце Вы неабходным інфармаваць беларускае грамадства аб дзейнасці Вашай арганізацыі?», выбралі адказ «Так», а астатнія тры ўдзельнікі даследавання мелі цяжкасці з адказам.

Пераважная большасць удзельнікаў даследавання (96%) пазначыла, што ў мэтах інфармавання выкарыстоўваюць СМІ (інтэрв’ю і артыкулы). Таксама вельмі часта для гэтага імі выкарыстоўваюцца сацыяльныя сеткі (78% рэспандэнтаў назвалі прадстаўленасць у сацыяльных сетках) і вэб-сайты арганізацыі (70% рэспандэнтаў у якасці спосаба інфармавання назвалі рэгулярнае абнаўленне інфармацыі на сайце арганізацыі). Яшчэ адзін спосаб, да якога даволі часта звяртаюцца праваабарончыя арганізацыі, — інфармацыйныя бюлетэні і рассылкі (гэты варыянт выбралі 64% рэспандэнтаў).

Параўнальна рэдка праваабарончыя арганізацыі выкарыстоўваюць для інфармавання грамадства аб сваёй дзейнасці сустрэчы з грамадзянамі (42% рэспандэнтаў пазначылі гэты варыянт) і прэзентацыі на выставах і кірмашах грамадзянскай супольнасці (38%).

Таксама рэспандэнты назвалі ў якасці спосабаў інфармавання грамадства арганізацыю фестываляў і літаратурных прэмій і проста мерапрыемства (гл. дыяграму 39).

**Дыяграма 39.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў па спосабах інфармавання грамадства аб дзейнасці арганізацый, %




Згодна адказам рэспандэнтаў, публікацыя публічных справаздач рэдка выкарыстоўваецца арганізацыямі для інфармавання аб сваёй дзейнасці (гэты спосаб пазначылі толькі 32% рэспандэнтаў). Прычыны, па якіх арганізацыі не публікуюць публічныя справаздачы аб сваёй дзейнасці, разнастайныя. Часцей за ўсё, рэспандэнты спасылаліся на фактар небяспекі рэпрэсій (24% рэспандэнтаў выбралі гэты варыянт адказу). 18% рэспандэнтаў назвалі адсутнасць такой неабходнасці, паколькі ўся неабходная інфармацыя ўжо ёсць у публічнай прасторы (на сайце і ў СМІ). Недахоп часу і рэсурсаў назвалі толькі 14% удзельнікаў даследавання.

Шэсць рэспандэнтаў назвалі іншыя прычыны:

> *«Адсутнасць рэгістрацыі ў Беларусі, а так — «Няма такой неабходнасці, уся інфармацыя ёсць на нашым сайце і ў СМІ»*;
>
> *«Яшчэ не прайшоў год для справаздачы»*;
>
> *«Як раз збіраемся гэта ўводзіць у наступным годзе ў тым аб'ёме, у якім магчыма»*;

*«Кароткі перыяд з пачатку працы»*;

*«Мы не публікуем фінансавую інфармацыю»*;

*«Няма магчымасці нават праз СМІ (не бяруць публікаваць)»*.

Тры рэспандэнты пазначылі, што не лічаць неабходным спецыяльна інфармаваць каго-небудзь пра дзейнасць сваіх арганізацый праз публічныя справаздачы. Яшчэ адзін рэспандэнт адказаў, што не дасведчаны аб прычынах, па якіх яго арганізацыя не публікуе справаздачы аб сваёй дзейнасці (гл. дыяграму 40).

**Дыяграма 40.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў наконт прычын, па якіх праваабарончыя арганізацыі не публікуюць справаздачы аб сваёй дзейнасці, %



# Супрацоўніцтва ў сектары беларускіх праваабарончых арганізацый

## Уяўленні аб мэтах супрацоўніцтва

Мэты, для дасягнення якіх беларускім праваабарончым арганізацыях, на думку рэспандэнтаў, неабходна супрацоўнічаць паміж сабой, вельмі разнастайныя. Па папулярнасці іх можна падзяліць на тры кластары.

У першы кластар трапляе такая мэта, як уплыў на дзяржаўную палітыку ў галіне правоў чалавека. Гэты варыянт адказу выбрала пераважная большасць рэспандэнтаў (41 рэспандэнт, або 82%).

Другі кластар (адказы, якія выбралі 25-30 рэспандэнтаў, або 40-50%) уключае наступныя мэты:

- змена заканадаўства;
- рэалізацыя агульных кампаній у абарону правоў чалавека;
- праца ў рамках міжнародных праваабарончых механізмаў;
- паляпшэнне ўмоў дзейнасці грамадскіх арганізацый у Беларусі;
- прадстаўленне інтарэсаў праваабарончых арганізацый у дыялогу з беларускімі ўладамі;
- прасоўванне, адстойванне, абарона правоў і інтарэсаў мэтавых груп.

Трэці кластар (адказы, якія выбралі 7-13 рэспандэнтаў, або 14-26%) уключае ў сябе мэты:

- дапамога іншым праваабаронцам у крызіснай сітуацыі;
- прыняцце сумесных заяў, зваротаў;
- рэалізацыя сумесных праектаў;
- палітычныя змены ў Беларусі;
- правядзенне сумесных маніторынгаў парушэнняў правоў чалавека;
- паляпшэнне ўмоў дзейнасці (прававых, фінансавых і г.д.) для праваабарончых грамадскіх арганізацый.

Ні адзін з удзельнікаў даследавання не адказаў, што беларускім праваабарончым арганізацыям супрацоўніцтва не патрэбнае (гл. дыяграму 41).

**Дыяграма 41.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна мэтаў супрацоўніцтва паміж праваабарончымі арганізацыямі, %



# Уяўленні аб стратэгічна важных тэмах і сферах дзейнасці

## Кароткатэрміновая перспектыва

Уяўленні рэспандэнтаў адносна сферах і тэмах дзейнасці, важных для беларускіх праваабаронцаў у кароткатэрміновай перспектыве (3-5 гадоў), вельмі разнастайныя, большасць з іх была ўзгаданая толькі адзін раз. На адкрытае пытанне ўдзельнікі даследавання далі агулам 126 адказаў. Не былі выяўленыя сферы і тэмы, якія б назвалі ўсе, пераважная большасць ці хаця б палова рэспандэнтаў. Толькі тры сферы/тэмы былі названыя больш чым 10 рэспандэнтамі:

- свабода мірных сходаў і асацыяцый (17 узгадванняў);
- смяротнае пакаранне (16 узгадванняў);
- права на справядлівы суд (11 узгадванняў).

4-7 разоў былі названыя такія сферы і тэмы як:

- свабода выражэння поглядаў і доступ да інфармацыі;
- дыскрымінацыя;
- права на свабоду і асабістую недатыкальнасць, неабгрунтаванае затрыманне да суда;
- справядлівыя выборы;
- адукацыя, асветніцтва па тэме праваабарончай дзейнасці (гл. дыяграму 42).

Сферы/тэмы, якія былі ўзгаданыя менш чым чатырма рэспандэнтамі, можна падзяліць на групы:

- Канкрэтныя прававыя сферы (лічбавыя свабоды, свабода рэлігіі, свабода ад катаванняў, правы бежанцаў і мігрантаў, права на здаровае навакольнае асяроддзе і г.д.). Усяго было названа больш за 20 сфер/тэм дзейнасці, стратэгічна важных для беларускіх праваабаронцаў у кароткатэрміновай перспектыве;
- Умовы дзейнасці праваабарончых арганізацый і арганізацый грамадзянскай супольнасці агулам (адміністрацыйны і крымінальны пераслед актывістаў, фінансаванне);
- Развіццё беларускіх праваабарончых арганізацый (*«падрыхтоўка кваліфікаваных кадраў і наогул інфраструктурныя праекты»*, *«пошук новых інструментаў і метадаў для таго, каб быць пачутымі як уладамі, так і грамадствам»*);
- Каардынацыя дзейнасці і супрацоўніцтва беларускіх праваабаронцаў (*«каардынацыя дзеянняў на нацыянальным і міжнародным узроўні»*, *«выпрацоўка жыццяздольнай стратэгіі праваабарончага руху»*, *«распрацоўка сумеснай стратэгіі выкарыстання міжнародных і ўнутраных механізмаў абароны правоў чалавека»*, *«арганізацыя сумесных круглых сталоў»*);
- Рэформы ў сектары беларускіх праваабарончых арганізацый (*«развіццё маладых праваабарончых ініцыятыў (без буйных арганізацый)»*, *«дэінстытуалізацыя»*);

- Лабіраванне і адвакатаванне (*«адвакатаванне правоў чалавека на нацыянальным і міжнародным узроўні»*, *«міжнароднае лабіраванне»*);
- Развіццё дыялогу з дзяржаўнай уладай;
- Актыўнасць, зыходзячы з бягучай абстаноўкі (напрыклад, у актуальны момант часу — *«дэкрэт аб дармаедах»*).

**Дыяграма 42.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў па кластарах стратэгічна важных сфер/тэм дзейнасці для беларускіх праваабаронцаў у кароткатэрміновай перспектыве, частата




## Доўгатэрміновая перспектыва

Рэспандэнты назвалі 117 сфер/тэм дзейнасці, якія, на іх думку, маюць стратэгічную важнасць для беларускіх праваабаронцаў у доўгатэрміновай перспектыве (5-10 гадоў). Шэсць рэспандэнтаў мелі цяжкасць з адказам.

Часцей за ўсё, удзельнікі даследавання называлі ў якасці стратэгічна важных сфер/тэм у доўгатэрміновай перспектыве асобныя правы, і, агулам, палова адказаў патрапляе ў гэтую катэгорыю. Часцей за іншых называліся: права на свабодныя выбары (15 узгадванняў), права на справядлівы суд (8 узгадванняў), свабода сходаў і асацыяцый (7 узгадванняў), забарона дыскрымінацыі па любой прыкмеце (6 узгадванняў), адмена смяротнай кары (4 узгадванні). Таксама называліся: свабода слова і доступ да інфармацыі, свабода думкі, сумлення і рэлігіі, права на працу, права на чыстае і здаровае навакольнае асяроддзе, свабода ад катаванняў, права на годнае жыццё, права на мір ды інш.

Радзей рэспандэнты называлі не канкрэтныя правы, а больш шырокія прававыя сферы ці групы правоў: грамадзянскія і палітычныя правы, эканамічныя і палітычныя правы, імплементацыя міжнародных норм у нацыянальныя законы, бізнес і правы чалавека, правы «трэцяга пакалення», *«сіла закона, толькі закон, а не дэкрэты, указы і дырэктывы»*, рэфармаванне судовай сістэмы, рэфармаванне выбарчай сферы, палітычныя рэформы і дэмакратызацыя і г.д.

Сем рэспандэнтаў назвалі стратэгічна важнай сферу нацыянальных механізмаў абароны правоў чалавека (канстытуцыйныя рэформы, інстытут амбудсмена). Пяць рэспандэнтаў пазначылі, што стратэгічна важным у доўгатэрміновай перспектыве з’яўляецца развіццё праваабарончага сектара (*«аб’яднанне праваабарончых арганізацый па сферах сумеснай дзейнасці»*, *«пашырэнне кола праваабарончых арганізацый»*, *«стратэгія развіцця»*, *«прасоўванне праваабарончага руху»*), а таксама развіццё грамадзянскай супольнасці агулам (*«павелічэнне патэнцыялу грамадзянскай супольнасці»*).

Па два рэспандэнты назвалі стратэгічна важнымі такія сферы/тэмы як: адукацыя і асвета, адвакатаванне і лабіяванне, далучэнне да міжнародных канвенцый (*«далучэнне Беларусі да Еўрапейскай канвенцыі»*) і міжнародных арганізацый (*«далучэнне да Савета Еўропы»*) (гл. дыяграму 43).

**Дыяграма 43.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў па кластарах стратэгічна важных сфер/тэм дзейнасці для беларускіх праваабаронцаў у доўгатэрміновай перспектыве, частата



Акрамя таго, рэспандэнты назвалі яшчэ 12 сфер/тэм, якія складана класіфікаваць:

*«Уніфікацыя нацыянальнага заканадаўства»*;

*«Абарона тых, хто пацярпеў»*;

*«Інфармаванне грамадскасці аб парушэннях у галіне правоў чалавека»*;

*«Маніторынг выканання краінай ратыфікаваных канвенцый»*;

*«Перакваліфікацыя супрацоўнікаў праваахоўнай і пенітэнцыярнай сістэмы»*;

*«Падтрымка тых, хто змагаецца»*;

*«Філасофія правоў чалавека»*;

*«HR based approach»*;

*«Увядзенне ў дзейнасць арганізацый падыходу, заснаванага на правах чалавека»*;

*«Абарона правоў чалавека на нацыянальным і міжнародным узроўнях»*;

*«Кантроль за дзяржаўнымі органамі»*;

*«Зварот за абаронай правоў у міжнародныя арганізацыі»*.

## Правы і свабоды, якія патрабуюць сумесных намаганняў праваабаронцаў для іх абароны

У беларускай праваабарончай супольнасці няма кансенсусу адносна таго, абарона якіх правоў і свабод патрабуе сумесных намаганняў праваабаронцаў.

Так, больш за ўсё ўдзельнікаў даследавання (56% рэспандэнтаў) пазначыла, што сумесных намаганняў патрабуе абарона права на справядлівы суд. Такім чынам, гэтае меркаванне з’яўляецца агульным толькі для паловы лідэраў арганізацый у сектары.

Акрамя гэтага права, рэспандэнты назвалі яшчэ восем правоў і свабод, абарона якіх, на іх думку, патрабуе сумесных намаганняў праваабаронцаў.

Трацiна рэспандэнтаў пазначыла, што сумесных намаганняў праваабаронцаў патрабуе абарона яшчэ трох правоў і свабод: свабода сходаў і аб’яднанняў, свабода ад катаванняў і жорсткага абыходжання і забарона смяротнага пакарання ў мірны час.

Крыху менш удзельнікаў даследавання ўгадала, што сумесныя намаганні праваабаронцаў патрэбныя для абароны: свабоды выказвання поглядаў і доступ да інфармацыі (28% рэспандэнтаў), права на свабоду і асабістую недатыкальнасць (26%), права на жыццё (22%), права на свабодныя выбары і свабода ад дыскрымінацыі па любой прыкмеце (па 20%, адпаведна) (гл. дыяграму 44).

Аднак трэба заўважыць, што пералічаныя правы і свабоды відавочна з’яўляецца прыярытэтнымі для праваабарончага сектара — іншыя правы і свабоды (у анкеце рэспандэнтам прапанавалі спіс з 32 розных правоў і свабодаў) былі названыя тры і менш разоў.

**Дыяграма 44.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна некаторых правоў, абарона якіх у найбольшай ступені патрабуе сумесных намаганняў праваабаронцаў, %




## Фактары, якія спрыяюць і перашкаджаюць супрацоўніцтву паміж праваабарончымі арганізацыямі

### Стымулы для супрацоўніцтва

На думку пераважнай большасці рэспандэнтаў, супрацоўніцтву паміж арганізацыямі праваабарончага сектара спрыяе ўзаемнаму даверу (гэты варыянт адказу на пастаўленае пытанне выбралі 38 рэспандэнтаў, або 76%). Таксама больш за палову рэспандэнтаў пазначыла, што супрацоўніцтву спрыяюць такія фактары як: супадзенне стратэгічных мэтаў арганізацый і добрыя асабістыя адносіны паміж лідэрамі і актывістамі розных арганізацый. Пазітыўныя фактары, якія назвала найменшая колькасць рэспандэнтаў, — гэта адсутнасць прычын для канкурэнцыі, наяўнасць арганізацый-лідэраў і наяўнасць у арганізацый свабодных рэсурсаў. Адзін з удзельнікаў даследавання меў цяжкасці з адказам (гл. дыяграму 45).

**Дыяграма 45.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў зыходзячы з уяўленняў пра фактары, якія спрыяюць супрацоўніцтву праваабарончых арганізацый, %




Таксама рэспандэнты назвалі яшчэ чатыры фактары: *«давер прыходзіць у сумеснай працы і будуецца на ўзаемнай павазе»*; *«канкрэтная праца па абароне правоў»*; *«зараз нічога не спрыяе, можна казаць толькі пра адзінкавыя выпадкі, ці пры ўмоўным стане»*; *«умова донара»*.

## Перашкоды для супрацоўніцтва

Меркаванні рэспандэнтаў адносна фактараў, якія перашкаджаюць супрацоўніцтву паміж праваабарончымі арганізацыямі, больш разнастайныя, аднак ні адзін са спісу прапанаваных фактараў не ёсць значным для большасці рэспандэнтаў. Часцей за ўсё, удзельнікі даследавання назначалі такія фактары як: занятасць справамі ўласнай арганізацыі (52%), канкурэнцыя за замежнае фінансаванне (44%), несупадзенне стратэгічных мэтаў розных арганізацый (42%) (гл. дыяграму 46).

**Дыяграма 46.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў зыходзячы з уяўленняў пра фактары, якія перашкаджаюць супрацоўніцтву праваабарончых арганізацый, %



Траціна рэспандэнтаў (32%) пазначыла, што перашкодай для супрацоўніцтва з’яўляецца ігнараванне вядомымі арганізацыямі інтарэсаў іх менш вядомых калег. У той жа час, розніцу ў інтарэсах зарэгістраваных і незарэгістраваных арганізацый пазначылі толькі 8% рэспандэнтаў (гэты фактар апынуўся ў ліку найменш узгаданых рэспандэнтаў).

Менш за ўсё рэспандэнтаў выбрала такія варыянты адказу як: адсутнасць вольнага часу ў лідэраў і супрацоўнікаў і адсутнасць у сектары прызнаваемых усімі арганізацый-лідэраў.

Акрамя таго, рэспандэнты назвалі яшчэ два фактары:

> *«Глыбокае несупадзенне ўяўленняў пра эфектыўныя тактыкі работы. Улічваючы, што ў нашых умовах ні адна тактыка не з’яўляецца на 100% эфектыўнай, гэта дае прастору для дыяметральна процілеглых меркаванняў»;*
>
> *«Няведанне пра праекты адзін аднаго, закрытасць праваабарончых арганізацый».*

## Некаторыя аналітычныя высновы пра фактары, якія ўплываюць на супрацоўніцтва

Аналізуючы фактары, якія спрыяюць і перашкаджаюць супрацоўніцтву арганізацый у праваабарончым сектары, можна заўважыць некалькі аспектаў.

Па-першае, давер і добрыя асабістыя ўзаемаадносіны паміж лідэрамі і актывістамі можна назваць адным з краевугольных камянёў, на якіх будуецца супрацоўніцтва паміж беларускімі праваабарончымі арганізацыямі. Аб гэтым сведчыць той факт, што гэтыя фактары ўваходзяць у тройку фактараў, пазначаных найбольшай колькасцю рэспандэнтаў, а фактар узаемнага даверу — адзіны фактар, адносна якога ў большасці рэспандэнтаў выявілася кансалідаванае меркаванне. Таксама можна меркаваць, што ў сектары няма вострай праблемы даверу, узаемаадносіны большасці лідэраў і актывістаў характарызуюцца як добрыя, паколькі фактар дрэнных узаемаадносін як перашкода для супрацоўніцтва апынуўся значным толькі для траціны рэспандэнтаў.

Па-другое, вялікае значэнне мае фактар супадзення/несупадзення стратэгічных мэтаў арганізацый (62% рэспандэнтаў пазначылі яго пазітыўны ўплыў на супрацоўніцтва і 42% рэспандэнтаў указалі на яго негатыўны ўплыў). Супастаўляючы адказы адносна гэтага фактара, можна меркаваць, што ў праваабарончым сектары ёсць група арганізацый, згуртаваная вакол агульных стратэгічных мэтаў. Арганізацыі ж, якія не падзяляюць уяўленні гэтай групы наконт стратэгічных мэтаў, адчуваюць істотныя складанасці ў наладжванні супрацоўніцтва.

Па-трэцяе, можна сказаць, што фактар лідэрства ў сектары не з’яўляецца актуальным для развіцця супрацоўніцтва. Варыянты адказаў, звязаныя з лідэрствам, выбрала параўнальна невялікая колькасць рэспандэнтаў, роўна як у пытанні адносна стымулаў для супрацоўніцтва, так і ў пытанні пра перашкоды. Таксама нячаста пазначаўся ўплыў на супрацоўніцтва фактара наяўнасці або адсутнасці каардынуючай пляцоўкі.

Нарэшце, цікавым з’яўляецца тое, што фактар адносін дзяржавы да праваабаронцаў, на думку большасці рэспандэнтаў, не з’яўляецца значным.

# Ацэнка некаторых форм супрацоўніцтва праваабарончых арганізацый

## Прыклады сумесных дзеянняў арганізацый праваабарончага сектара

Можна казаць аб тым, што супрацоўніцтва паміж праваабарончымі арганізацыямі інтэнсіўнае, лідэры і актывісты добра абазнаныя пра сумесныя праекты. Аб гэтым можна меркаваць па адказах на пытанне «Колькі прыкладаў сумесных дзеянняў арганізацый праваабарончага сектара за апошнія тры гады Вы можаце прыгадаць?», а таксама па тым, колькі прыкладаў сумесных дзеянняў змаглі назваць удзельнікі.

Толькі тры рэспандэнты пазначылі, што не могуць прыгадайь ні воднага прыкладу сумесных дзеянняў. Большасць жа рэспандэнтаў пазначыла, што могуць прыгадаць 3-5 прыкладаў, 20% — што могуць прыгадаць 6-10 прыкладаў і 16% — што могуць прыгадаць больш за 10 прыкладаў сумесных дзеянняў праваабаронцаў (гл. дыяграму 47).

**Дыяграма 47.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна інтэнсіўнасці сумесных дзеянняў праваабарончых арганізацый, %




На просьбу назваць прыклады такіх сумесных дзеянняў тры рэспандэнты адказалі, што такіх прыкладаў не было, яшчэ пяць — што не могуць прыгадайь. Аднак 28 рэспандэнтаў назвалі па пяць прыкладаў. Агулам, удзельнікі даследавання назвалі 52 прыклады сумесных дзеянняў, з якіх 19 мерапрыемстваў былі названыя больш чым адным рэспандэнтам.

Адназначнымі лідэрамі па колькасці ўзгадванняў з’яўляюцца: кампанія за адмену смяротнага пакарання і праца ў рамках Універсальнага перыядычнага агляду (УПА) — яны былі названыя па 18 разоў, адпаведна, у той час як іншыя сумесныя дзеянні і кампаніі былі ўзгаданыя менш за 10 разоў. Сярод іншых прыкладаў можна назваць: кампанію «Праваабаронцы за свабодныя выбары» (8 узгадванняў), прызнанне вязняў сумлення палітзняволенымі (7 узгадванняў), правядзенне праваабарончых летніх школ і дзейнасць Беларускага Дома правоў чалавека (па 6 узгадванняў), дапамога рэпрэсаваным і ўзаемадзеянне са спецдакладчыкам ААН па правах чалавека (па 5 узгадванняў).

## Ацэнкі паспяховасці супрацоўніцтва

Рэспандэнты вельмі высока ацанілі паспяховасць супрацоўніцтва праваабарончых арганізацый: больш за 60% удзельнікаў даследавання ацанілі паспяховасць супрацоўніцтва ад 6 балаў і вышэй па 10-бальнай шкале. Найбольшая колькасць рэспандэнтаў ацаніла паспяховасць супрацоўніцтва на 7 балаў (32%). Траціна рэспандэнтаў (30%) ацаніла паспяховасць супрацоўніцтва на 5 балаў і ніжэй, 4% удзельнікаў даследавання пазначылі, што супрацоўніцтва з’яўляецца зусім няўдалым (гл. дыяграму 48).

**Дыяграма 48.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў зыходзячы з ацэнкі паспяховасці супрацоўніцтва праваабарончых арганізацый, %




## Інтэнсіўнасць узаемнага наведвання мерапрыемстваў

Камунікацыя паміж арганізацыямі сектара знаходзіцца на даволі высокім узроўні. Пра гэта сведчаць адказы на пытанне адносна наведвання мерапрыемстваў, арганізаваных іншымі арганізацыямі. Так, 45 з 50 рэспандэнтаў адказалі, што наведваюць мерапрыемствы іншых арганізацый. Таксама можна судзіць, што лідэры праваабарончых арганізацый наведваюць мерапрыемствы сваіх калег часта: большасць удзельнікаў даследавання адзначылі, што ў апошні раз былі на такім мерапрыемстве менш за паўгода таму, пры гэтым вялікая частка рэспандэнтаў пазначыла перыяд часу «Менш за тры месяцы таму» (гл. дыяграму 49).

**Дыяграма 49.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна інтэнсіўнасці ўзаемнага наведвання мерапрыемстваў, %, чал.



## Узаемадапамога праваабарончых арганізацый

У выпадку патраплення праваабаронцаў у складаную сітуацыю (канфлікт з дзяржавай, ціск на праваабаронцаў, дыскрымінацыя праз праваабарончую дзейнасць і г.д.), лідэры праваабарончых арганізацый часцей за ўсё гатовыя аказваць дапамогу ў выглядзе падпісання калектыўных зваротаў у абарону (84% рэспандэнтаў) і арганізацыі кампаній у падтрымку (76%). Трохі радзей удзельнікі даследавання адзначалі сваю гатоўнасць выступаць у абарону праз СМІ (62%) і прыцягваць міжнародныя ўплывовыя суб’екты (56%). Больш за 40% рэспандэнтаў паведамілі, што гатовыя аказваць юрыдычную дапамогу (48%) і гуманітарную дапамогу (рабіць перадачы ў турмы і г.д.) (42%). Можна звярнуць увагу, што шэраг удзельнікаў даследавання (16%, або 8 рэспандэнтаў) пазначылі, што гатовыя да нефармальных кантактаў і спробаў дамовіцца з уладамі (гл. дыяграму 50).

**Дыяграма 50.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў па формах узаемадапамогі праваабаронцаў у складанай сітуацыі, %



Таксама два рэспандэнты назвалі іншыя віды дапамогі, якія яны гатовыя аказваць:

*«Маніторынг парушэнняў»;*

*«Юрыдычная дапамога ў сегменце эканамічных правоў».*

## Стаўленне да агульнай стратэгіі развіцця праваабарончай дзейнасці ў Беларусі

Пераважная большасць рэспандэнтаў (72%) пагадзілася з тым, што праваабарончым арганізацыях патрэбная агульная стратэгія развіцця дзейнасці ў Беларусі. Аднак выявілася і даволі значна колькасць тых, хто не змог адказаць на пытанне пра неабходнасць такой стратэгіі (20%). Рэспандэнтаў ж, якія пазначылі, што неабходнасці ў агульнай стратэгіі няма, аказалася меншасць (6%) (гл. дыяграму 51).

**Дыяграма 51.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна неабходнасці праваабарончым арганізацыям мець агульную стратэгію развіцця праваабарончай дзейнасці, %, чал.




35 удзельнікаў даследавання назвалі агулам 91 праблемную сферу, якія, на іх думку, патрабуюць сумеснага абмеркавання ўнутры праваабарончай супольнасці для выпрацоўкі агульнай пазіцыі або ўзгаднення дзеянняў. Аднак 30% (ці 15 рэспандэнтаў) мелі цяжкасці з адказам.

У фармулёўцы пытання рэспандэнтам было прапанавана тры кластары пытанняў і праблем: 1) праблемы супрацоўніцтва паміж арганізацыямі; 2) праблемы ў працы праваабаронцаў; і 3) вострыя пытанні па праблемах правоў чалавека. Адказы ўдзельнікаў даследавання размеркаваліся па гэтых кластарах прыблізна аднолькава (гл. дыяграму 52).

**Дыяграма 52.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў па кластарах праблем для абмеркавання ўнутры праваабарончай супольнасці, %, чал.



У кластары **«Праблемы супрацоўніцтва паміж арганізацыямі»** часцей за ўсё ўдзельнікі даследавання называлі праблемы, звязаныя з агульнай стратэгіяй праваабарончых арганізацый і кансалідацыяй унутры сектара:

*«Выпрацоўка стратэгіі дзеянняў у цяперашні час і на перспектыву»*;

*«Каардынацыя дзейнасці»*;

*«Абмеркаванне агульных прыярытэтных пытанняў, агульнай стратэгіі, вызначэнне агульнага плана і ролі кожнага»*;

*«Агульная (жывая) стратэгія — больш спробаў паглыбіць супрацоўніцтва»*;

*«Пазіцыянаванне, салідарныя дзеянні, фандрайзінг, падрыхтоўка кадраў»*;

*«Прадстаўніцтва ад імя сектара»*;

*«Стварэнне каардынуючай пляцоўкі, выпрацоўка яднаючых ідэй і праграм сумеснай дзейнасці»*.

Таксама часта рэспандэнты называлі праблемы актуальнага супрацоўніцтва:

*«Больш асабістых кантактаў не толькі на ўзроўні кіраўніцтва»*;

*«Вядзенне дыялогу (незамоўчванне) па вострых/спрэчных пытаннях, цэнтр vs. рэгіёны, старыя арганізацыі vs. новыя»*;

*«Ігнараванне вядомымі праваабарончымі арганізацыямі інтарэсаў іх менш вядомых калег, адсутнасць кааперацыі»*;

*«Канкурэнцыя, неабгрунтаваная зацыкленасць толькі на сабе»*;

*«Праблемы супрацоўніцтва паміж арганізацыямі»*;

*«Супрацоўніцтва грунтуецца на асабістых кантактах, а не на інтарэсах справы»*.

На думку шэрагу рэспандэнтаў, тэмай для сумеснага абмеркавання з’яўляюцца розніца падыходаў і праблема featureснага разумення праваабарончай дзейнасці, пытанні этыкі праваабарончай дзейнасці:

*«Недасканаласць дзеянняў, адрозненні (супярэчнасці) у разуменні канчатковых мэтаў праваабарончай дзейнасці»*;

*«Розныя мэты дзейнасці і правы чалавека, якія абараняюць арганізацыі»*;

*«Самавызначэнне суб’ектаў праваабарончай супольнасці з разуменнем, што такое праваабарона»*;

*«Узгадненне падыходаў»*;

*«Тэмы для агульнай працы»*;

*«Распрацоўка кодэкса этыкі»*.

Яшчэ тэмы, названыя ўдзельнікамі даследавання ў гэтым кластары:

*«Пытанне рэгрантынгу ўнутры праваабарончай супольнасці»*;

*«Інтарэсы супольнасці вышэй за інтарэсы арганізацыі»*;

*«Як зрабіць супрацоўніцтва больш эфектыўным, прадуктыўным і рэзультатыўным?»*;

*«Маніторынг парушэнняў правоў чалавека»*;

*«Непразрысты характар дзейнасці праваабарончых арганізацый»*;

*«Падрыхтоўка перыядычных справаздач у камітэты ААН, праца з міжнароднымі інстытуцыямі»*.

Адзін рэспандэнт адзначыў: *«Мне здаецца, гэтая праблема не так востра стаіць»*. Яшчэ адзін — што не можа назваць дакладна праблемы ў гэтай сферы.

У кластары **«Праблемы ў працы праваабаронцаў»** асноўнай праблемай, напэўна, з'яўляецца ціск з боку дзяржавы — як прамы ў выглядзе рэпрэсій або пагрозы пераследаў, так і ўскоснае, якое праяўляецца ў нестабільным становішчы агулам праваабарончых арганізацый, грамадскіх арганізацый і іх супрацоўнікаў:

*«Свабода асацыяцый (рэгістрацыя, атрыманне фінансавання) — сацыяльная абароненасць супрацоўнікаў»*;

*«Ціск з боку дзяржавы»*;

*«Моцны ціск нават з боку грамадства»*;

*«Негатыў ад дзяржавы, рызыка пераследаў»*;

*«Пераслед і дыскрымінацыя праз дзейнасць і пашырэнне магчымасцей для маніторынгаў і абароны індывідаў у судах»*;

*«Праваабаронцы і НДА агулам выціснутыя ў гета»*;

*«Перашкоды ўладаў, праблемы з афіцыйнай рэгістрацыяй»*;

*«Фінансаванне, змены ўмоў для дзейнасці арганізацый (заканадаўчых)»*.

Актуальным для праваабаронцаў з'яўляецца пытанне супрацоўніцтва з дзяржавай (дапушчальнасць супрацоўніцтва праваабаронцаў з дзяржавай і фактычная магчымасць супрацоўнічаць):

*«Афіцыйны статус праваабронцаў у Беларусі»*;

*«Пытанне агульнай стратэгіі ўзаемадзеяння з дзяржавай»*;

*«Аддзяленне палітычнай і праваабрончай пазіцый»*;

*«Стаўленне да супрацоўніцтва з дзяржавай»*;

*«Адсутнасць магчымасці дыялогу з дзяржавай»*;

*«Праца з дзяржавай»*;

*«Самарэгуляванне, узаемадзеянне з уладамі»*;

*«Супрацоўніцтва з уладамі»*;

*«Статус праваабаронцы: які ён?»*.

Таксама называліся праблемы дэфіцыту кадраў, адсутнасць агульнай пляцоўкі і некаторыя іншыя праблемы:

*«Агульная карціна адукацыйных (асветніцкіх) дзеянняў»*;

*«Агульныя зразумелыя публічныя ацэнкі і выказванні»*;

*«Адсутнасць агульнай пляцоўкі для сумесных дзеянняў»*;

*«Прасоўванне дэкларацыі аб праваабаронцах, хто такія праваабаронцы (базавыя этычныя прынцыпы)»*;

*«Распрацоўка і прыняцце этычных правіл дзейнасці беларускіх праваабаронцаў»*;

*«Мэты і вынікі працы, зваротная сувязь з грамадствам і мэтавымі групамі»*.

Таксама адзін рэспандэнт пазначыў, што не можа назваць дакладна праблемы ў гэтай сферы.

У кластары **«Вострыя пытанні па праблемах правоў чалавека»** рэспандэнты, у асноўным, называлі канкрэтныя правы або сферы, парушэнні ў якіх патрабуюць увагі:

*«Узаемадзеянне адносна вырашэння пытанняў палітычных знікненняў у Рэспубліцы Беларусь»*;

*«Пытанне дыскрымінацыі»*;

*«Дыскрымінацыя праз прыналежнасць да незалежных прафсаюзаў»*;

*«Дыскрымінацыя, катаванне»*;

*«Доступ да персанальных дадзеных»*;

*«Доступ да справядлівага правасуддзя, «мянтоўская» ўседазволенасць»*;

*«Ці маю права быць правым? (Чаму гарант Канстытуцыі і правоў, свабод беспакарана іх парушае? У чым корань зла?)»*;

*«Недыскрымінацыя»*;

*«Агульная пазіцыя па пытаннях санкцый, спецдакладчыка ААН, палітзняволеных»*;

*«Адмена смяротнага пакарання»*;

*«Адсутнасць незалежнага суда, свабодных выбараў, ціск дзяржавы ва ўсіх сферах»*;

*«Парушэнне асноўных правоў і свабод»*;

*«Адвольныя затрыманні»*;

*«Розныя крытэрыі і стандарты вызначэння палітзняволеных»*;

*«Свабода асацыяцый і сходаў, права на справядлівы суд, мараторый на/адмена смяротнага пакарання»*;

*«Свабоды асацыяцый»*;

*«Сістэматычныя парушэнні правоў чалавека ў Беларусі»*;

*«Смяротнае пакаранне, катаванне і нечалавечае ўтрыманне зняволеных»*;

*«Судовыя разбіральніцтвы з парушэннем закона»*.

Аднак некаторыя ўдзельнікі даследавання звярнулі ўвагу на іншыя аспекты:

*«Узаемадзеянне з органамі ўлады, праваабарона і палітыка»*;

*«Каштоўнасць правоў чалавека дэмпінгуецца арганізацыямі»*;

*«Негатыўнае стаўленне ўладаў Беларусі да праваабарончых арганізацый»*;

*«Абмеркаванне ўсяго спектра інструментаў абароны правоў чалавека і іх эфектыўнасць»*;

*«Праваабарончы парадак дня на сёння — прыярытэтная праблема»*.

Шэраг рэспандэнтаў сфармулявалі праблемы, якія яны лічаць актуальнымі для сумеснага абмеркавання, за межамі прапанаваных даследчыкамі кластараў (было аднесена намі да коастара **«Іншае»**):

*«Інфармацыя адносна дзейнасці»*;

*«Кансалідацыя праваабарончай супольнасці Беларусі»*;

*«Ці можна павысіць нашую эфектыўнасць?»*;

*«Нацыянальны план па правах чалавека, удзел праваабарончых арганізацый у дыялогу па правах чалавека»*;

*«Нягледзячы на тое, што ў праваабарончых арганізацыіях розны досвед супрацоўніцтва, патрабуецца перагляд пытанняў агульнай стратэгіі (ёсць, няма, якая), кола арганізацый, якія супрацоўнічаюць паміж сабою, тэмы, метады і г.д.»*;

*«Адмена кантрактнай сістэмы ў Беларусі»*;

*«Стандарты дзейнасці (прафесіяналізм)»*.

## Структура сеткавых узаемадзеянняў у сектары праваабарончых арганізацый

Падчас апытання рэспандэнтам задавалася пытанне адносна інтэнсіўнасці ўзаемадзеяння з іншымі арганізацыямі праваабарончага сектара. Рэспандэнты маглі пазначыць частату супрацоўніцтва (варыянты адказу: «Ніколі не супрацоўнічалі», «Часам супрацоўнічалі», «Часта супрацоўнічалі»), а таксама ахарактарызаваць досвед супрацоўніцтва як пазітыўны, нейтральны ці негатыўны. Паколькі адказы рэспандэнтаў з адной і той жа арганізацыі маглі адрозніваца, то ў якасці ступені (індэкса) звязанасці мы ўзялі сярэдняе значэнне (напрыклад, калі адзін рэспандэнт пазначаў «Ніколі не супрацоўнічалі» (значэнне — «0»), а другі — «Часам супрацоўнічалі» (значэнне — «1»), то індэкс звязанасці разлічваўся як сярэдняе і быў роўны значэнню -»0,5»). Гэтыя дадзеныя дазваляюць пабудаваць структуру сеткавых узаемадзеянняў арганізацый праваабарончага сектара.

### Агульная характарыстыка сеткі

Сетка ўзаемадзеянняў можа быць ахарактарызаваная як досыць шчыльная, арганізацыі добра звязаны адзін з адным (мера шчыльнасці сеткі *D* = 0,60, 466 сувязей з 780 магчымых). Адносіны можна апісаць як канцэнтрычную структуру сувязей с выразным цэнтральным ядром (гл. рысунак 1).

Можна вылучыць:

а) Выразнае ядро сеткі з 12 больш шчыльна звязаных паміж сабой арганізацый, з дамінаваннем узаемна зваротных сувязей (пазначана сінім колерам). Гэта ядро складаюць: 1) ПЦ «Вясна»; 2) РПГА «Беларускі Хельсінскі камітэт» (БХК); 3) Асамблея НДА; 4) Беларускі ДПЧ; 5) Камітэт «Салідэрнасць»; 6) ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (БАЖ); 7) Офіс па правах людзей з інваліднасцю (ОПЛІ); 8) Цэнтр прававой трансфармацыі (*Lawtrend*); 9) Прафсаюз РЭП; 10) ПУ «Беларускі дакументацыйны цэнтр» (БДЦ); 11) РГА «Прававая ініцыятыва»; 12) ПУ «Ліга развіцця дэмакратыі «Грамадзянскі вердыкт»;

б) 14 арганізацый з крыху менш шчыльнымі сувязямі з ядром сектара, у значнай ступені звязаныя аднанакіраванымі сувязямі (пазначана чырвоным колерам), з менш шчыльнымі сувязямі паміж сабой: 1) ПЦ «Ідэнтычнасць»; 2) Ініцыятыва *Human Constanta*; 3) ГА «Таварыства беларускай мовы» (ТБМ); 4) Гомельскі цэнтр стратэгічнай цяжбы (ГЦСЦ); 5) МПГ-Беларусь; 6) МПГ «Студэнцкая Рада»; 7) ПЦ «Прававая дапамога насельніцтву»; 8) Таварыства «Зялёная сетка»; 9) Таварыства «Ініцыятыва FORB»; 10) ПІКУ «Рэгіён 119»; 11) ГА «Магілёўскі праваабарончы цэнтр»; 12) Група сваякоў асуджаных/Ініцыатыва «За справядлівы суд у Беларусі»; 13) Ініцыятыва «Супраць беззаконнасці ў судах і пракуратуры»; 14) ГА «Цэнтр па правах чалавека»;

в) «Блізкую перыферыю» з васьмі арганізацый, якія слабей звязаныя з «цэнтрам» і «пramежкавымі» арганізацыямі і практычна не звязаныя паміж сабой, з дамінаваннем аднанакіраваных сувязей: 1) ГА «ВІТ»; 2) ГА «Экадом»; 3) Цэнтр развіцця студэнцкіх ініцыятыў (ЦРСІ); 4) Беларускі ПЭН-цэнтр; 5) АУ «Офіс правоў прызыўніка»; 6) АСГА «Звяно»; 7) «Праваабарончы альянс»; 8) Беларускі кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў (БКДП);

г) «Далёкую перыферыю» з шасці арганізацый, у асноўным не праваабарончага характару, якія маюць па адной сувязі: 1) Ініцыятыва *MAKEOUT*; 2) ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў» (СБП); 3) Ініцыятыва «Праваабаронцы супраць катаванняў»; 4) САГА «Матчын рух 328»; 5) Ініцыятыва «Праўныя дырэктары»; 6) Міжнародны кансорцыум «ЕўраБеларусь».

**Рысунак 1.** Агульная карціна сеткавых узаемадзеянняў у сектары праваабарончых арганізацый*




* Гл. выяву ў большым разрозненні — у **Дадатку 3** ці па спасылцы: https://cet.eurobelarus.info/files/userfiles/5/HR/Pic01-be.png.

Калі перавесці адносіны паміж арганізацыямі ў прасторавыя адносіны «блізкасці—аддаленасці» адзін ад аднаго (*Non-metric multidimensional scaling*), мы атрымаем наступную карціну (гл. рысунак 2):

**Рысунак 2.** Прасторавыя адносіны ў сетцы паміж праваабарончымі арганізацыямі (без арганізацый «далёкай перыферыі») (*Non-metric multidimensional scaling*)*



* Гл. выяву ў большым разрозненні — у **Дадатку 3** ці па спасылцы: https://cet.eurobelarus.info/files/userfiles/5/HR/Pic02-be.png.

Карціна нязначна адрозніваецца ад папярэдняй, яна дэманструе практычна тое ж ядро блізкіх адна да аднай арганізацый і падобную канцэнтрычную структуру. Аддаленне ад цэнтра такіх арганізацый, як Офіс па правах людзей з інваліднасцю (ОПЛІ) і ПУ «Ліга развіцця дэмакратыі «Грамадзянскі вердыкт», паказвае, што ў іх сетках адносін ёсць вялікая колькасць іншых кропак прыцягнення за рамкамі цэнтральнага ядра, г.зн., у адрозненне ад арганізацый ядра, яны крыху больш супрацоўнічаюць з арганізацыямі блізкай перыферыі сеткі. Цікава адзначыць наяўнасць некалькіх груп аддаленых ад цэнтра, але блізкіх адна да аднай арганізацый:

1) «Праваабарончы альянс» — Ініцыятыва «Супраць беззаконнасці ў судах і пракуратуры»;
2) Група сваякоў асуджаных/Ініцыатыва «За справядлівы суд у Беларусі» — ПІКУ «Рэгіён 119»;
3) ГА «ВІТ» — ГА «Экадом»;
4) Офіс па правах людзей з інваліднасцю (ОПЛІ) — Таварыства «Зялёная сетка» — Таварыства «Ініцыятыва FORB» — Ініцыятыва *Human Constanta*;
5) ПЦ «Ідэнтычнасць» — МПГ «Студэнская Рада» — МПГ-Беларусь — Цэнтр развіцця студэнцкіх ініцыятыў (ЦРСІ).

Блізкае размяшчэнне гэтых арганізацый у прасторы адносін тлумачыцца падобнасцю структуры іх адносін з іншымі арганізацыямі сеткі (хто з імі супрацоўнічае, з кім яны супрацоўнічаюць, якая інтэнсіўнасць гэтага супрацоўніцтва). Адзначым, што аб'ектыўная блізкасць пратораваґа размяшчэння можа быць звязаная з наяўнасцю агульных характарыстык у бліжэйшых арганізацый (агульная тэматыка дзейнасці, агульныя мэтавыя групы, падобныя стратэгіі супрацоўніцтва і г.д.). Для названых груп блізкасць можа тлумачыцца:

1) агульнай тэматыкай дзейнасці — для групы: «Праваабарончы альянс» — Ініцыятыва «Супраць беззаконнасці ў судах і пракуратуры»;
2) агульнай мэтавай групай (зняволеныя) — для групы: Група сваякоў асуджаных/Ініцыатыва «За справядлівы суд у Беларусі» — ПІКУ «Рэгіён 119»;
3) не цалкам праваабарончым характарам, арганізацыі маюць праваабарончы кампанент, але не з'яўляюцца толькі праваабарончымі па характары дзейнасці — для групы: ГА «ВІТ» — ГА «Экадом»;
4) агульнасцю ў арыентацыі на асобныя групы правоў — для групы: Офіс па правах людзей з інваліднасцю (ОПЛІ) — Таварыства «Зялёная сетка» — Таварыства «Ініцыятыва FORB» — Ініцыятыва *Human Constanta*;
5) агульнай мэтавай групай (моладзь) — для групы: ПЦ «Ідэнтычнасць» — МПГ «Студэнская Рада» — МПГ-Беларусь — Цэнтр развіцця студэнцкіх ініцыятыў (ЦРСІ).

## Цэнтральнасць сеткі (меры адноснага ўплыву арганізацый)

Падлік колькасці сувязей для кожнай арганізацыі дае магчымасць вызначыць адносную меру ўплывовасці асобных арганізацый у сеткі (гл. рысунак 1, дзе чым большы памер вузла, тым больш адносны ўплыў арганізацыі ў сетцы). У залежнасці ад колькасці сувязей (цэнтральнасць па ступені), арганізацыі можна размясціць наступным чынам:

1) ПЦ «Вясна» (32 сувязі);
2) РПГА «Беларускі Хельсінскі камітэт» (БХК), Асамблея НДА, ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (БАЖ), Офіс па правах людзей з інваліднасцю (ОПЛІ) (па 30 сувязей),
3) Беларускі ДПЧ (29 сувязей);
4) Цэнтр прававой трансфармацыі (*Lawtrend*) (28 сувязей);
5) Камітэт «Салідэрнасць» (26 сувязей);
6) ПУ «Беларускі дакументацыйны цэнтр» (БДЦ) (23 сувязі);
7) Прафсаюз РЭП, РГА «Прававая ініцыятыва», ПУ «Ліга развіцця дэмакратыі «Грамадзянскі вердыкт» (па 22 сувязі).

Уплывовасць вузла ў сетцы (у дадзеным выпадку ўплывовасць асобнай арганізацыі) таксама характарызуе мера цэнтральнасці ўласнага вектара (*Eigenvector centrality*). Мера цэнтральнасці ўласнага вектара разлічваецца як уклад розных сувязей ва ўплывовасць вузла: чым больш ён звязаны з іншымі ўплывовымі вузламі (вузламі з вялікай колькасцю сувязей), тым больш яго ўласны ўплыў у сетцы, а яго сувязі з вузламі з меншай колькасцю сувязей уносяць меншы ўклад у яго ўплыў.

Найбольш уплывовымі суб’ектамі ў ядры сеткі з’яўляюцца (па ступені змяншэння ўплыву):

1) ПЦ «Вясна»;
2) РПГА «Беларускі Хельсінскі камітэт» (БХК);
3) Асамблея НДА;
4) ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (БАЖ);
5) Беларускі ДПЧ;
6) Офіс па правах людзей з інваліднасцю (ОПЛІ);
7) Цэнтр прававой трансфармацыі (*Lawtrend*) (гл. рысунак 3).

**Рысунак 3.** Уплывовасць праваабарончых арганізацый у сетцы: мера цэнтральнасці ўласнага вектара (*Eigenvector centrality*)*



* Гл. выяву ў большым разрозненні — у **Дадатку 3** ці па спасылцы: https://cet.eurobelarus.info/files/userfiles/5/HR/Pic03-be.png.

Асобнай характарыстыкай сеткавых адносін з’яўляецца цэнтральнасць вузла па пасярэдніцтву (*Betweenness centrality*)[*]. Лічыцца, што інфармацыя ў сетцы распаўсюджваецца па кароткім шляху, гэта значыць, што ў элементарнай сетцы *A—B—C* (дзе *B* звязаны з *A* і *C*, але *A* і *C* не звязаныя адзін з адным), інфармацыя ад *B* хутчэй дойдзе да *A* і *C* (адзін крок), чым ад *A* да *C* (два крокі). У гэтым выпадку *B* будзе пасярэднікам у перадачы інфармацыі ад *A* да *C*. У пэўным сэнсе, вузлы з высокай цэнтральнасцю па пасярэдніцтву — гэта асноўныя «камунікатары» і «пасярэднікі» ў адносінах паміж удзельнікамі сеткі.

Найбольш уплывовымі суб’ектамі ў ядры сеткі з’яўляюцца (па ступені змяншэння ўплыву):

1) Офіс па правах людзей з інваліднасцю (ОПЛІ);
2) Беларускі ПЭН-цэнтр;
3) ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (БАЖ);
4) МПГ-Беларусь;
5) ПЦ «Вясна» (гл. рысунак 4).

**Рысунак 4.** Асноўныя камунікатары і пасярэднікі ў сетцы праваабарончых арганізацый: цэнтральнасць вузла па пасярэдніцтву (*Betweenness centrality*)*



* Гл. выяву ў большым разрозненні — у **Дадатку 3** ці па спасылцы: https://cet.eurobelarus.info/files/userfiles/5/HR/Pic04-be.png.

З’яўленне ў якасці пасярэднікаў, аддаленых ад цэнтра, такіх арганізацый, як Беларускі ПЭН-цэнтр і МПГ-Беларусь, тлумачыцца іх сувязямі з блізкай і далёкай перыферыяй сеткі, да якой інфармацыя ад гэтых арганізацый дойдзе хутчэй, чым ад іншых.

Калі з сеткі выключыць перыферыйныя арганізацыі з адной сувяззю, то карціна некалькі зменіцца (гл. рысунак 5).

---

[*] Цэнтральнасць па пасярэдніцтву роўная колькасці найкароткіх пуцей з усіх вузлоў да ўсіх астатніх, якія праходзяць праз гэты вузел. Вузел з высокай ступенню цэнтральнасці па пасярэдніцтву мае вялікае значэнне пры перадачы чаго-небудзь па сетцы, з прычыны меркавання, што перадача ажыццяўляецца найкароткім пуцём.

**Рысунак 5.** Асноўныя камунікатары і пасярэднікі ў сетцы праваабарончых арганізацый: цэнтральнасць вузла па пасярэдніцтву (без арганізацый «далёкай перыферыі») (*Betweenness centrality*)*



* Гл. выяву ў большым разрозненні — у **Дадатку 3** ці па спасылцы: https://cet.eurobelarus.info/files/userfiles/5/HR/Pic05-be.png.

У гэтым выпадку найбольш значнымі «пасярэднікамі» ў сетцы, дзе застаюцца галоўным чынам толькі непасрэдна праваабарончыя арганізацыі, з'яўляюцца (па ступені змяншэння ўплыву):

1) ПЦ «Вясна»;
2) Асамблея НДА;
3) ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (БАЖ);
4) Беларускі ДПЧ;
5) РПГА «Беларускі Хельсінскі камітэт» (БХК).

## Частата кантактаў

Найбольш моцныя сувязі (часта супрацоўнічалі на працягу трох гадоў) паміж сабой маюць арганізацыі з ядра сеткі: ПЦ «Вясна», Беларускі ДПЧ, ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (БАЖ), Асамблея НДА, Цэнтр прававой трансфармацыі (*Lawtrend*), РПГА «Беларускі Хельсінскі камітэт» (БХК), ПУ «Беларускі дакументацыйны цэнтр» (БДЦ), Камітэт «Салідэрнасць», Гомельскі цэнтр стратэгічнай цяжбы (ГЦСЦ). Да іх прымыкаюць: ПУ «Ліга развіцця дэмакратыі «Грамадзянскі вердыкт», ПЦ «Прававая дапамога насельніцтву» і РГА «Прававая ініцыятыва», якія менш шчыльна звязаныя з астатнімі і часцей аднанакіраванымі сувязямі. Частыя сувязі складаюць 30% ад усіх узаемадзеянняў, у якія ўключаныя амаль усе арганізацыі, але з рознай інтэнсіўнасцю (гл. рысунак 6).

**Рысунак 6.** Максімальная частата супрацоўніцтва праваабарончых арганізацый на працягу трох гадоў*



* Велічыня вузла паказвае адносную вагу ў частых узаемадзеяннях (індэкс сувязі — 1,5-2,0).

Гл. выяву ў большым разрозненні — у **Дадатку 3** ці па спасылцы:
https://cet.eurobelarus.info/files/userfiles/5/HR/Pic06-be.png.

Менш частыя ўзаемадзеянні (часам супрацоўнічалі на працягу трох гадоў) складаюць 70% усіх выпадкаў супрацоўніцтва. У менш частыя ўзаемадзеяння (слабыя сувязі) на працягу апошніх трох гадоў больш за ўсё ўступалі: Офіс па правах людзей з інваліднасцю (ОПЛІ), Цэнтр прававой трансфармацыі (*Lawtrend*), РПГА «Беларускі Хельсінскі камітэт» (БХК), ПЦ «Вясна», Беларускі ДПЧ, Прафсаюз РЭП, ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (БАЖ). Заўважым, што ініцыятарамі гэтых кантактаў часцей выступаюць іншыя арганізацыі, і ў менш частых кантактах агулам дамінуюць аднанакіраваныя сувязі. Пры гэтым арганізацыі з ядра сеткі (РПГА «Беларускі Хельсінскі камітэт» (БХК), Цэнтр прававой трансфармацыі (*Lawtrend*), Офіс па правах людзей з інваліднасцю (ОПЛІ), ПЦ «Вясна», Беларускі ДПЧ і інш.) звязаныя паміж сабой моцнымі сувязямі і часта ўзаемадзейнічаюць, тады як з астатнімі арганізацыямі яны падтрымліваюць кантакты час ад часу (гл. рысунак 7).

**Рысунак 7.** Мінімальная частата супрацоўніцтва праваабарончых арганізацый на працягу трох гадоў*



* Велічыня вузла паказвае адносную вагу ў частых узаемадзеяннях (індэкс сувязі — 1 і 0,5).

Гл. выяву ў большым разрозненні — у **Дадатку 3** ці па спасылцы:
https://cet.eurobelarus.info/files/userfiles/5/HR/Pic07-be.png.

## Характарыстыка досведу ўзаемадзеяння

Рэспандэнты далі ацэнкі досведу ўзаемадзеяння (пазітыўны, нейтральны, негатыўны) для 452 выпадкаў супрацоўніцтва* (з 466 пазначаных узаемадзеянняў); у 14 выпадках рэспандэнты не далі ацэнкі. У шэрагу іншых выпадкаў рэспандэнты давалі ацэнкі досведу супрацоўніцтва, пазначаючы ў той жа час, што супрацоўніцтва на працягу трох гадоў не было, ці не пакідаючы ацэнкі наконт узаемадзеяння. Гэтыя выпадкі ацэнкі неіснуючых узаемадзеянняў не адлюстроўваюцца ў агульнай карціне ацэнак супрацоўніцтва.

З 452 ахарактарызаваных выпадкаў супрацоўніцтва: як пазітыўныя ці хутчэй пазітыўныя былі ацэненыя 342 выпадкі; як нейтральныя — 95 выпадкаў; як негатыўныя ці хутчэй негатыўныя — 15 выпадкаў (гл. дыяграму 53).

**Дыяграма 53.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў па характарыстыках досведу супрацоўніцтва паміж арганізацыямі, %




Такім чынам, можна сказаць, што супрацоўніцтва паміж арганізацыямі характарызуецца пераважна пазітыўна (76% усіх узаемадзеянняў) або нейтральна (21% усіх узаемадзеянняў), негатыўны досвед супрацоўніцтва маецца толькі ў 3% выпадкаў.

Колькасць пазітыўна ахарактарызаваных кантактаў з асобнай арганізацыяй можа быць разгледжана як яе пазітыўны рэйтынг (ці, свайго роду, абсалютная мера яе рэпутацыі). У сетцы праваабарончых арганізацый найлепшую рэпутацыю ў калег маюць (па змяншэнні): ПЦ «Вясна», Беларускі ДПЧ, Цэнтр прававой трансфармацыі (*Lawtrend*), Офіс па правах людзей з інваліднасцю (ОПЛІ), ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (БАЖ) (гл. рысункі 8 і 9).

---

* Выпадкам супрацоўніцтва або кантактам лічылася адзнака рэспандэнта пра супрацоўніцтва («Часам супрацоўнічалі» або «Часта супрацоўнічалі») у адказе на пытанне анкеты: «Калі ласка, ацаніце інтэнсіўнасць і досвед супрацоўніцтва Вашай арганізацыі з кожнай з пералічаных арганізацый у апошнія тры гады».

**Рысунак 8.** Характарыстыкі досведу супрацоўніцтва паміж праваабарончымі арганізацыямі ў сетцы (усе сувязі): прасторавыя адносіны (*Non-metric multidimensional scaling*)*



* Зялёным колерам пазначаныя пазітыўныя і хутчэй пазітыўныя ўзаемадзеянні, сінім — нейтральныя, чырвоным — негатыўныя і хутчэй негатыўныя.

Гл. выяву ў большым разрозненні — у **Дадатку 3** ці па спасылцы: https://cet.eurobelarus.info/files/userfiles/5/HR/Pic08-be.png.

**Рысунак 9.** Пазітыўны і хутчэй пазітыўны досвед супрацоўніцтва паміж праваабарончымі арганізацыямі ў сетцы: залежнасць паміж велічынёй вузла і колькасцю ўваходзячых сувязей (*Indegree*)*



* Гл. выяву ў большым разрозненні — у **Дадатку 3** ці па спасылцы: https://cet.eurobelarus.info/files/userfiles/5/HR/Pic09_be.png.

Лідэрамі нейтральных уваходзячых узаемадзеянняў з’яўляюцца: «Праваабарончы альянс», РПГА «Беларускі Хельсінскі камітэт» (БХК), ПЦ «Прававая дапамога насельніцтву», Прафсаюз РЭП, ГА «Магілёўскі праваабарончы цэнтр» (гл. рысунак 10). Тут цікава адзначыць пазіцыю РПГА «Беларускі Хельсінскі камітэт» (БХК), які знаходзіцца сярод лідэраў па колькасці агульных сувязей, але, у адрозненне ад іншых лідэраў

сувязей, супрацоўніцтва з ім характарызуецца як пазітыўна-нейтральнае (каля траціны ўваходзячых узаемадзеянняў з БХК былі ацэненыя як нейтральныя). Уваходзячыя ўзаемадзеянні з астатнімі лідэрамі сувязей былі ацэненыя толькі як пазітыўныя, за выключэннем вельмі невялікай колькасці нейтральных сувязей.

**Рысунак 10.** Нейтральны досвед супрацоўніцтва паміж праваабарончымі арганізацыямі ў сетцы: парадак вузлоў у залежнасці ад колькасці ўваходзячых сувязей (*Indegree*)*



* Гл. выяву ў большым разрозненні — у **Дадатку 3** ці па спасылцы: https://cet.eurobelarus.info/files/userfiles/5/HR/Pic10-be.png.

Колькасць выпадкаў узаемадзеяння, у якіх досвед супрацоўніцтва быў ацэнены негатыўна, нязначнае, і яны не гуляюць асаблівай ролі ў агульным аб’ёме кантактаў (15 выпадкаў, ці 3% ад агульнай колькасці сувязей).

# Інтэнсіўнасць, паспяховасць і рызыкоўнасць супрацоўніцтва праваабарончых арганізацый з рознымі суб’ектамі

Паводле вынікаў даследавання, беларускія праваабарончыя арганізацыі найбольш інтэнсіўна супрацоўнічаюць з іншымі арганізацыямі грамадзянскай супольнасці Беларусі і са СМІ (сярэдняя ацэнка вышэй 7/10 балаў), а таксама з міжнароднымі арганізацыямі і іншымі арганізацыямі грамадзянскай супольнасці за межамі Беларусі (сярэдняя ацэнка вышэй 6/10 балаў). Супрацоўніцтва з гэтымі суб’ектамі рэспандэнты ацанілі таксама як найбольш паспяховае і найменш рызыкоўнае (гл. дыяграму 54).

**Дыяграма 54.** Ацэнкі інтэнсіўнасці, паспяховасці і рызыкоўнасці супрацоўніцтва праваабарончых арганізацый з рознымі суб’ектамі, балы



Інтэнсіўнасць супрацоўніцтва сваіх арганізацый з іншымі тыпамі суб’ектаў (беларускія і міжнародныя заканадаўчыя і выканаўчыя органы, беларускія дзяржаўныя ўстановы, дзяржаўныя і прыватныя прадпрыемствы) рэспандэнты ацанілі значна ніжэй (у сярэднім, ніжэй 3/10 балаў). Пры гэтым як больш паспяховае было ацэнена супрацоўніцтва праваабарончых арганізацый з дзяржаўнымі органамі іншых краін (парламенты, урады, міністэрствы і г.д.) і з беларускім прыватным бізнесам.

Да ліку суб’ектаў, супрацоўніцтва з якімі лідэрамі праваабарончых арганізацый было ацэнена як найбольш рызыкоўнае, адносяцца Адміністрацыя прэзідэнта (5,3/10 балаў), дзяржаўныя органы Беларусі (урад, міністэрствы, ведамствы) (4,3/10 балаў) і парламент (4/10 балаў).

Як правіла, рэспандэнты высока ацэньвалі паспяховасць супрацоўніцтва з тымі суб’ектамі, з якімі інтэнсіўна ўзаемадзейнічаюць, пры гэтым узаемадзеянне з гэтымі суб’ектамі атрымала нізкія ацэнкі рызыкі. Аднак можна вылучыць такія суб’екты, як дзяржаўныя ўстановы і бюджэтныя арганізацыі, дзяржаўныя органы іншых краін, органы мясцовага кіравання і самакіравання розных узроўняў і прыватны бізнес, дзе ацэнкі дастаткова збалансаваныя.

# Этыка праваабаронцы вачыма лідэраў беларускіх праваабарончых арганізацый

## Стаўленне да неабходнасці этычнага самарэгулявання для праваабарончай супольнасці

Сярод апытаных лідэраў і актывістаў беларускіх праваабарончых арганізацый стаўленне да неабходнасці этычнага самарэгулявання неадназначнае, хоць 56% рэспандэнтаў паведамілі, што гэты інстытут неабходны. Справа ў тым, што ў даследуемай групе выявілася вельмі вялікая доля тых, у каго адсутнічала афармленае меркаванне: 26% рэспандэнтаў мелі цяжкасці з адказам на гэтае пытанне. Таксама абазначылася даволі вялікая доля тых, хто паказаў, што этычнае самарэгуляванне не патрэбнае (16% рэспандэнтаў) (гл. дыяграму 55).

**Дыяграма 55.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна неабходнасці этычнага самарэгулявання для праваабарончай супольнасці, %, чал.




Сярод тых, хто падтрымаў увядзенне этычнага самарэгулявання ў праваабарончай супольнасці, дзве траціны (18 рэспандэнтаў) пазначыла, што таксама неабходныя механізмы кантролю за выкананнем этычных норм. Адна трэць удзельнікаў даследавання (9 рэспандэнтаў) паведаміла, што неабходнасці ў механізмах кантролю няма (гл. дыяграму 56).

**Дыяграма 56.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў, якія падтрымалі ўвядзенне этычнага самарэгулявання ў праваабарончай супольнасці, адносна неабходнасці механізма кантролю за выкананнем этычных норм, %, чал.



Адзінага меркавання адносна таго, з дапамогай якіх механізмаў павінен ажыццяўляцца кантроль за выкананнем этычных норм, у даследуемай групе не аказалася. Аднолькавая колькасць удзельнікаў даследавання (па 8 рэспандэнтаў, адпаведна) аддала перавагу: механізм спецыяльнага калегіяльнага органа, які абіраецца супольнасцю, і механізм самадысцыпліны (варыянт адказу: «Усе, хто прыняў устаноўленыя прынцыпы этычнага самарэгулявання, самі будуць старацца прытрымлівацца гэтых прынцыпаў у сваёй дзейнасці»). Варыянт разгляду спрэчных этычных пытанняў усёй супольнасцю апынуўся найменш пажаданым. Варыянт увядзення індывідуальнай пазіцыі (прадстаўніка, спецыяліста па этыцы) не абраў ні адзін з рэспандэнтаў (гл. дыяграму 57).

**Дыяграма 57.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў, якія падтрымалі ўвядзенне этычнага самарэгулявання ў праваабарончай супольнасці, адносна пажаданых механізмаў кантролю за выкананнем этычных норм, %, чал.




## Уяўленні аб механізмах рашэння канфліктаў, звязаных з праваабарончай этыкай

Для вырашэння канфліктных сітуацый паміж праваабарончымі арганізацыямі, звязаных з пытаннямі праваабарончай этыкі, рэспандэнты аддаюць перавагу звароту альбо да праваабарончай супольнасці, альбо да аўтарытэтнага пасярэдніка. Гэтыя варыянты адказу выбрала пераважная большасць рэспандэнтаў, суадносіны паміж імі амаль аднолькавыя: варыянт звароту да праваабарончай супольнасці выбралі 22 рэспандэнты, варыянт звароту да медыятара — 19 удзельнікаў даследавання (гл. дыяграму 58).

Таксама рэспандэнты прапанавалі чатыры сваіх варыянты:

*«Двухбаковыя перамовы ўсіх бакоў канфлікта, самарэгуляванне»*;

*«Камісія па этыцы, абраная на прававаым форуме»*;

*«Ніхто канфлікт не вырашыць, этыка дапаможа пазбягаць канфліктаў ці рабіць высновы ў выніку»*;

*«Зварот у спецыяльны калегіяльны орган, створаны для такіх выпадкаў»*.

**Дыяграма 58.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна пажаданых механізмаў вырашэння этычных канфліктаў паміж праваабарончымі арганізацыямі, %




Адносна спосабаў вырашэння канфліктных сітуацый, звязаных з праваабарончай этыкай, паміж асобнымі праваабаронцамі, рэспандэнты прадэманстравалі больш кансалідаванае меркаванне: 52% рэспандэнтаў пазначылі, што пажаданым механізмам для вырашэння такой сітуацыі быў бы зварот да пасярэдніка або медыятара, аўтарытэтнага для ўсіх канфліктуючых бакоў. 20% рэспандэнтаў пазначылі, што пажаданым было б разбіраць такія канфлікты ўсёй супольнасцю. Даволі вялікая колькасць удзельнікаў даследаванні (8 рэспандэнтаў) мелі цяжкасці з выбарам пажаданага механізма для вырашэння такіх сітуацый (гл. дыяграму 59).

Іншыя варыянты, прапанаваныя ўдзельнікамі даследавання, аналагічныя варыянтам вырашэння канфліктных сітуацый паміж арганізацыямі:

*«У залежнасці ад сітуацыі, зварот да пасярэдніка ці да супольнасці»*;

*«Камісія па этыцы, абраная на прававым форуме»*;

*«Ніхто канфлікт не вырашыць, этыка дапаможа пазбягаць канфліктаў ці рабіць высновы ў выніку»*;

*«Зварот у спецыяльны калегіяльны орган, створаны для такіх выпадкаў»*.

**Дыяграма 59.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна пажаданых механізмаў вырашэння этычных канфліктаў паміж індывідуальнымі праваабаронцамі, %




У сітуацыі, калі б член арганізацыі выкарыстаў значныя фінансавыя сродкі арганізацыі на свае асабістыя патрэбы, удзельнікі даследавання хутчэй за ўсё аддалі б перавагу такому механізму, як адкрытая пастаноўка пытання перад упаўнаважаным органам арганізацыі аб выключэнні гэтага чалавека (дадзены варыянт адказу выбралі 40% рэспандэнтаў). Другі па папулярнасці механізм — дамагацца звальнення гэтага чалавека, не апублічваючы інфармацыю аб яго ным учынку (гэты варыянт адказу выбралі 18% рэспандэнтаў). Шэсць рэспандэнтаў (12%) пазначылі, што будуць ініцыяваць публічны разгляд, яшчэ шэсць — што не ведаюць, як паступяць у такой сітуацыі (гл. дыяграму 60).

Пяць рэспандэнтаў прапанавалі свае механізмы дзеянняў:

> *«Усё залежыць ад сітуацыі. Найбольш верагодна, праінфармую кіраўніцтва або праініцыюю разбор (унутраны)»*;

> *«Перш-наперш, размова са спробай высветліць прычыны і жаданне кампенсацыі (раптоўная хвароба, паслугі адваката)»*;

*«Праінфармую донараў, а таксама ў прыватным парадку прадстаўнікоў іншых арганізацый і калег»;*

*«Спачатку бяседа сам-насам, потым адкрыта падыму пытанне аб выключэнні перад упаўнаважанам органам арганізацыі (калі сітуацыя не выправіцца)»;*

*«Такое наўрадці магчыма, але калі так, то разгледзім у калектыве».*

Паказальна, што для вырашэння прапанаваных сітуацый рэспандэнты наогул не разглядаюць варыянт звароту ў афіцыйныя судовыя структуры.

**Дыяграма 60.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна дзеянняў у выпадку ўзнікнення сітуацыі выкарыстання членам арганізацыі значных фінансавых сродкаў на асабістыя патрэбы, %



## Уяўленні аб дапушчальнасці некаторых дзеянняў для праваабаронцаў і праваабарончых арганізацый

На думку 62% рэспандэнтаў, выкарыстанне арганізацыяй грантавых сродкаў не па прызначэнні (на фіктыўныя мэты, на імітацыю дзейнасці) з'яўляецца падставай, каб не супрацоўнічаць з ёй. Аднак вельмі вялікая доля ўдзельнікаў даследавання (амаль 40% рэспандэнтаў) не прадэманстравала выразнай пазіцыі па гэтым пытанні: 24% рэспандэнтаў мелі цяжкасці з адказам і 12% выбралі варыянт адказу «Магчыма, залежыць ад сітуацыі» (гл. дыяграму 61).

**Дыяграма 61.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна магчымасці супрацоўніцтва з арганізацыяй, якая выкарыстоўвае грантавыя сродкі не па прызначэнні, %, чал.




З пункту гледжання пераважнай большасці апытаных лідэраў і актывістаў праваабарончых арганізацый (78% рэспандэнтаў), праваабаронцы не могуць выкарыстоўваць незаконныя метады працы (напрыклад, хабару, подкуп, купля сакрэтнай дзяржаўнай інфармацыі і г.д.) (гл. дыяграму 62).

**Дыяграма 62.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна магчымасці выкарыстання праваабарончай арганізацыяй незаконных метадаў работы, %, чал.



На думку 88% удзельнікаў даследавання, распаўсюджванне заведама непраўдзівай інфармацыі таксама з'яўляецца недапушчальным (гл. дыяграму 63).

**Дыяграма 63.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна магчымасці распаўсюджвання праваабарончай арганізацыяй непраўдзівай інфармацыі, %, чал.




Што датычыцца мовы варожасці, 58% рэспандэнтаў паведамілі аб недапушчальнасці яго выкарыстання ў прынцыпе, не прад'яўляючы спецыяльных патрабаванняў да праваабаронцаў. 38% удзельнікаў даследавання пазначылі, што лічаць выкарыстанне абразлівых выказванняў недапушчальным менавіта для праваабаронцаў. Адзін рэспандэнт выказаў вельмі радыкальную пазіцыю па гэтым пытанні: у выпадку, калі б абразлівыя выказванні дазволіў сабе супрацоўнік яго арганізацыі, гэты супрацоўнік быў бы звольнены. Толькі адзін рэспандэнт нічога не стаў бы прадпрымаць, сутыкнуўшыся з сітуацыяй выкарыстання праваабаронцам абразлівых выказванняў (гл. дыяграму 64).

**Дыяграма 64.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна дзеянняў у выпадку сутыкнення з сітуацыяй выкарыстання супрацоўнікам праваабарончай арганізацыі мовы варожасці, %



## Уяўленні аб дапушчальнасці для праваабаронцаў супрацоўніцтва з палітычнымі суб'ектамі

### Супрацоўніцтва з палітычнымі партыямі

Сярод апытаных лідэраў і актывістаў беларускіх праваабарончых арганізацый 24% (ці 12 рэспандэнтаў) пазначылі, што яны асабіста супрацоўнічаюць з палітычнымі партыямі. 10% (ці пяць рэспандэнтаў) не пажадалі адказаць на гэтае пытанне, адзін рэспандэнт меў цяжкасці з адказам. Большасць жа апытаных праваабаронцаў (64%, або 32 рэспандэнты) пазначылі, што не супрацоўнічаюць з палітычнымі партыямі (гл. дыяграму 65).

**Дыяграма 65.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна супрацоўніцтва з палітычнымі партыямі, %, чал.




Таксама больш за палову рэспандэнтаў (66%) пазначыла, што ў перыяд сваёй праваабарончай дзейнасці не былі ўдзельнікамі ініцыятыўных груп будзь якой палітычнай партыі падчас выбараў, у той час як 28% апытаных паведамілі, што з'яўляліся ўдзельнікамі такіх ініцыятыўных груп. Тры рэспандэнты выбралі варыянт адказу «Не хачу адказваць» (гл. дыяграму 66).

**Дыяграма 66.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна ўдзелу ў ініцыятыўных групах палітычных партый у перыяд праваабарончай дзейнасці, %, чал.



У даследуемай групе меркаванне аб тым, што супрацоўніцтва праваабаронцаў з палітычнымі партыямі і структурамі прынцыпова недапушчальнае, з’яўляецца маргінальным — толькі тры рэспандэнты пазначылі, што, на іх думку, такое супрацоўніцтва недапушчальнае ні ў якой форме. Яшчэ пяць рэспандэнтаў мелі цяжкасці з адказам на гэтае пытанне.

Больш за ўсё рэспандэнтаў пазначыла дапушчальнасць такой формы супрацоўніцтва праваабаронцаў з палітычнымі партыямі, як прыцягненне іх у якасці партнёраў у праваабарончыя кампаніі (гэты варыянт адказу выбралі 54% рэспандэнтаў). 46% рэспандэнтаў адказалі, што адначасовае членства ў праваабарончай арганізацыі і палітычнай партыі з’яўляецца дапушчальным. 40% удзельнікаў даследавання паведамілі, што лічаць дапушчальным патрабаваць і выказваць падтрымку прымяненню палітычных і эканамічных санкцый. Чатыры рэспандэнты палічылі дапушчальным для праваабаронцаў публічнае выказванне падтрымкі палітычным партыям і яшчэ тры рэспандэнты — выкананне праектаў па замове або па ініцыятыве палітычных суб’ектаў (гл. дыяграму 67).

**Дыяграма 67.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна дапушчальных для праваабаронцаў форм супрацоўніцтва з палітычнымі партыямі, %



Таксама рэспандэнты назвалі наступныя формы супрацоўніцтва з палітычнымі партыямі, якія яны палічылі дапушчальнымі:

*«Далучэнне палітычных партый да праблем абароны правоў чалавека»;*

*«Інфармаванне палітычных суб’ектаў аб сітуацыі ў галіне правоў чалавека для фарміравання іх пазіцыі»;*

*«Кансультаванне»;*

*«Лабіяванне змен у заканадаўстве»;*

*«Напэўна, у межах кампаній па абароне грамадскіх інтарэсаў, можна ў якасці стратэгіі выкарыстоўваць ціск раўназначных ці ўплывовейшых суб’ектаў на тых, што прымаюць рашэнні»;*

*«Аказанне сябрам партый праваабарончай дапамогі»;*

*«Розныя віды падтрымкі, калі прадстаўнікі гэтых груп становяцца ахвярамі рэпрэсій, агульная абарона іх правоў, але не супрацоўніцтва per se»;*

*«Экспертная падтрымка».*

Практычна ўсе рэспандэнты пазначылі, што для праваабаронцаў дапушчальна прымаць удзел у выбарчых кампаніях у якасці незалежных назіральнікаў, назіральнікаў ад грамадскіх арганізацый (гэты варыянт пазначылі 96% рэспандэнтаў) (гл. дыяграму 68).

**Дыяграма 68.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна дапушчальных для праваабаронцаў форм удзелу ў выбарчых кампаніях, %



Значна меншая колькасць апытаных лідэраў праваабарончых арганізацый указала на дапушчальнасць іншых форм удзелу ў выбарчых кампаніях: у якасці кандыдата (38% рэспандэнтаў), у якасці ўдзельніка ініцыятыўнай групы (34%), у якасці назіральніка ад палітычнай партыі (22%), у якасці агітатара за пэўнага кандыдата (22%). Адзін з рэспандэнтаў палічыў дапушчальным удзел у якасці даверанай асобы, яшчэ адзін — выкарыстанне выбарчых кампаній для прасоўвання сваіх ідэй.

Адзін рэспандэнт не змог назваць дапушчальныя формы ўдзелу. Яшчэ адзін рэспандэнт пазначыў, што ні адна з форм удзелу ў выбарчых кампаніях не з’яўляецца дапушчальнай для праваабаронцаў. Таксама адзін рэспандэнт пазначыў, што ўдзел у выбарчых кампаніях у будзь якой з прапанаваных якасцей *«цягне прыпыненне дзейнасці праваабаронцаў»*.

## Супрацоўніцтва з беларускімі ўладамі

78% рэспандэнтаў пазначылі, што для праваабаронцаў дапушчальна супрацоўніцтва з беларускімі ўладамі. Толькі адзін рэспандэнт адказаў, што гэта недапушчальна. Доля рэспандэнтаў, якія мелі цяжкасці з адказам, выявілася параўнальна вялікай — 20% (гл. дыяграму 69).

**Дыяграма 69.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна дапушчальнасці супрацоўніцтва праваабарончых арганізацый з беларускімі ўладамі, %, чал.




Практычна ўсе формы супрацоўніцтва з беларускімі ўладамі больш паловай рэспандэнтаў былі пазначаны ў якасці дапушчальных у любой сітуацыі, а менавіта: афіцыйная перапіска (88% рэспандэнтаў), сумесны ўдзел у пляцоўках, ініцыяваных трэцім бокам (72%), удзел у зборах прапаноў па ўдасканаленні заканадаўства, абвешчаных уладамі (76%), удзел у публічных слуханнях, у якіх прымаюць удзел прадстаўнікі органаў улады (66%) і арганізаваных органамі ўлады (60%).

Да больш спрэчных форм супрацоўніцтва належаць нефармальныя перамовы з чыноўнікамі і ўдзел у грамадскіх саветах пры органах улады. Удзельнікі даследаванні дапусцілі выбіральнае выкарыстанне гэтых форм супрацоўніцтва ў залежнасці ад сітуацыі (52% рэспандэнтаў ацанілі дапушчальнасць іх выкарыстання такім чынам). Толькі 42% рэспандэнтаў пазначылі ўдзел у грамадскіх саветах і 28% рэспандэнтаў — нефармальныя перамовы з чыноўнікамі ў якасці дапушчальных у любой сітуацыі.

У найменшай ступені ўдзельнікі даследавання палічылі дапушчальным выкананне праектаў па ініцыятыве ўладаў — толькі адзін рэспандэнт пазначыў, што гэта дапушчальна ў любой сітуацыі. 60% рэспандэнтаў ацанілі дапушчальнасць падобнага супрацоўніцтва ў залежнасці ад сітуацыі. Найбольшая колькасць рэспандэнтаў, у параўнанні з іншымі формамі супрацоўніцтва, пазначыла, што выкананне заказаў па ініцыятыве ўладаў недапушчальнае (18%), таксама найбольшая колькасць рэспандэнтаў мела цяжкасці з тым, каб ацаніць дапушчальнасць выкарыстання гэтай формы супрацоўніцтва (18%).

Адзін з удзельнікаў даследавання палічыў часам дапушчальнай такую форму супрацоўніцтва, як удзел у адукацыйных і асветніцкіх мерапрыемствах (гл. дыяграму 70).

**Дыяграма 70.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна дапушчальнасці выкарыстання праваабаронцамі некаторых форм супрацоўніцтва з беларускімі ўладамі, %



Дзве траціны рэспандэнтаў пазначылі, што ў найбліжэйшым годзе супрацоўніцтва з беларускімі ўладамі будзе для іх магчымае пры пэўных умовах. 34% пазначылі, што супрацоўніцтва будзе магчымае ў асобных выпадках, і 34% рэспандэнтаў паведамілі, што ўмовай для супрацоўніцтва з'яўляецца змяненне стаўлення з боку ўладаў. Яшчэ траціна рэспандэнтаў пазначыла, што супрацоўніцтва магчымае без дадатковых умоў (4%) альбо ўжо ажыццяўляецца (22%).

Адзін рэспандэнт паслядоўна прытрымліваўся пазіцыі аб недапушчальнасці і немагчымасці супрацоўніцтва з беларускімі ўладамі. Два ўдзельнікі даследаванні мелі цяжкасці пры адказе на гэтае пытанне (гл. дыяграму 71).

**Дыяграма 71.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна магчымасці супрацоўніцтва праваабарончых арганізацый з беларускімі ўладамі ў бліжэйшым годзе, %




Часцей за ўсё апытаныя лідэры праваабарончых арганізацый пазначалі, што вынікі супрацоўніцтва з беларускімі ўладамі, якіх яны б хацелі дамагчыся, носяць агульны характар: змяненне норм заканадаўства (76% рэспандэнтаў), змены ў практыцы правапрымянення (70%) і сістэмныя змены ў сітуацыі з правамі чалавека ў краіне (64%). Вынікі, звязаныя з кропкавымі паляпшэннямі, з'яўляюцца мэтай супрацоўніцтва з уладамі значна радзей: паляпшэнне сітуацыі ў асобных сферах правоў чалавека пазначылі толькі 30% рэспандэнтаў, паляпшэнне сітуацыі для асобных асоб, чые правы былі парушаныя, — 20%, паляпшэнне сітуацыі для асобных мэтавых груп — 18 % (гл. дыяграму 72).

**Дыяграма 72.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна пажаданых вынікаў супрацоўніцтва праваабарончых арганізацый з беларускімі ўладамі, %



# Стратэгічнае развіццё

## Місія праваабарончых арганізацый

На адкрытае пытанне адносна місіі/галоўнай мэты арганізацыі адказалі 49 рэспандэнтаў, аднак двое не далі змястоўных адказаў, спаслаўшыся на статут ці сайт сваіх арганізацый; яшчэ адзін рэспандэнт прапусціў пытанне. Такім чынам, вынікі даследавання дазваляюць прааналізаваць місійныя ўстаноўкі 29 арганізацый.

Па тыпах місій у праваабарончай супольнасці можна вылучыць некалькі груп арганізацый:

- Арганізацыі, місія/галоўная мэта дзейнасці якіх сканцэнтраваная на канкрэтных мэтавых групах (сем арганізацый).

  Прадстаўнікі гэтых арганізацый назвалі наступныя мэтавыя групы: НДА, праваабарончая супольнасць, літаратурная супольнасць, ЛГБТК, людзі з інваліднасцю, прызыўнікі, студэнты. Адказы рэспандэнтаў часцей за ўсё ўтрымоўвалі такія фармулёўкі як: *«фарміраванне супольнасці»*, *«падтрымка сумесных дзеянняў»*, *«стварэнне спрыяльных умоў»*, *«каб мэтавая група магла карыстацца ўсёй паўнатой правоў чалавека»*, *«фарміраванне новага пакалення»*.

- Арганізацыі, місія якіх заключаюцца ў развіцці грамадзянскай актывізму (дзве арганізацыі).

  Лідэры гэтых арганізацый сфармулявалі місію/галоўную мэту дзейнасці наступным чынам: *«спрыянне фарміраванню актыўнага грамадзяніна праз адукацыйную дзейнасць»*, *«прыцягненне грамадзян Беларусі да актывізму і дапамогі іншым грамадзянам»*.

- Арганізацыі, дзейнасць якіх накіраваная на грамадства агулам (тры арганізацыі).

  Гэта арганізацыі, зацікаўленыя ў тым, каб у Беларусі сфармавалася грамадзянская супольнасць, грамадства, якое паважае правы чалавека, дасведчанае наконт асноўных правоў і свабод і іх абароны. Прадстаўнікі гэтых арганізацый так сфармулявалі місію сваёй дзейнасці: *«аднаўленне парушаных правоў з выкарыстаннем усіх законных метадаў і фарміраванне грамадзянскай супольнасці праз сумесныя дзеянні, толькі дзеянні спрыяюць зменам асобы»*, *«садзейнічанне пабудове ў Беларусі грамадства, што паважае чалавека, які рэалізуе свае правы»*.

- Арганізацыі, місія якіх накіраваная на абарону канкрэтных правоў, развіццё пэўных сфер (шэсць арганізацый).

  Да гэтай групы мы аднеслі арганізацыі, аб'ектамі клопату якіх, згодна адказам рэспандэнтаў, з'яўляюцца: *«рэальны дзяржаўны статус беларускай мовы»*, *«пашырэнне прасторы для свабоды слова праз падтрымку якаснай журналістыкі і распаўсюджванне праўдзівай інфармацыі»*, *«замацоўванне права свабоды думкі, сумлення і рэлігіі»*, *«незалежны справядлівы суд у Беларусі»*, *«прапаганда ідэй устойлівага развіцця і экалагічна мэтазгоднага ладу жыцця»* і *«імплементацыя дэ-факта міжнародных абавязацельстваў Беларусі»*.

- Арганізацыі, якія клапоцяцца аб абароне ў Беларусі правоў чалавека агулам (шэсць арганізацый).

  Да гэтай групы мы аднеслі арганізацыі, прадстаўнікі якіх апісалі змест місійных установак сваіх арганізацый у тэрмінах садзейнічання захаванню правоў чалавека і прававой рэформы ў Беларусі, абароны правоў і законных інтарэсаў грамадзян, пошуку адказаў на сучасныя выклікі для правоў чалавека ў Беларусі, удзелу ў фармуляванні новага праваабарончага парадку дня, прасоўвання каштоўнасцей недыскрымінацыі і салідарнасці.

- Арганізацыі, місіі/галоўныя мэты якіх звязаная з дэмакратызацыяй Беларусі (дзве арганізацыі).

  У гэтую групу былі ўключаныя арганізацыі, галоўнымі мэтамі якіх з'яўляюцца: *«садзейнічанне пабудове ў Беларусі прававой дзяржавы, павышэнне прававой культуры і абароны правоў чалавека»* і *«падтрымка развіцця дэмакратыі ў Беларусі, Літве і іншых краінах праз механізмы вяршэнства права, актывізацыі грамадзян, абароны іх правоў і свабод»*.

Тры арганізацыі не патрапілі ў гэтыя кластары. Прадстаўнік адной з іх назваў у якасці місіі/галоўнай мэты арганізацыі дакументаванне парушэнняў правоў чалавека. Прадстаўнік другой галоўнай мэтай дзейнасці арганізацыі назваў уплыў на грамадска-палітычнае жыццё краіны. Нарэшце, прадстаўнік трэцяй арганізацыі адказаў, што на цяперашні момант галоўнай мэтай арганізацыі з'яўляецца: *«выжыванне, дзейнасць на тэрыторыі Беларусі па-за законам, і казаць пра будзь якое стратэгічнае развіццё складана»* (гл. дыяграму 73).

**Дыяграма 73.** Размеркаванне арганізацый па тыпу місіі, частата



## Прыярытэты дзейнасці праваабарончых арганізацый

Пераважная большасць удзельнікаў даследавання (76% рэспандэнтаў) назвала па тры прыярытэты ў дзейнасці сваіх арганізацый. Шэсць рэспандэнтаў (12%) назвалі толькі два прыярытэты, два рэспандэнты (4%) вылучылі толькі адзін прыярытэт. Агулам, 46 рэспандэнтаў назвалі 128 прыярытэтаў у дзейнасці праваабарончых арганізацый, тры рэспандэнты мелі цяжкасці з адказам на пастаўленае пытанне, яшчэ адзін рэспандэнт — прапусціў пытанне.

Часцей за ўсё ў якасці прыярытэтаў у дзейнасці праваабарончых арганізацый удзельнікі даследавання называлі абарону пэўных груп насельніцтва ці аб'ектаў (было атрымана 23 адказы, якія трапляюць у гэты кластар), і, галоўным чынам, такія прыярытэты называліся ў першую чаргу. Былі названыя наступныя мэтавыя групы: ахвяры рэпрэсій, студэнты (у тым ліку адлічаныя), людзі з інваліднасцю, бежанцы і мігранты, прадстаўнікі ЛГБТК, журналісты, працоўныя, сацыяльна-неабароненыя людзі (напрыклад, маці-адзіночкі), прызыўнікі, зняволеныя, праваабаронцы, а таксама члены ўласных арганізацый, плюс — аб'екты прыроды. Праз вялікую разнастайнасць мэтавых груп і спецыфіку дзейнасці па абароне іх правоў (напрыклад, дэінстытуалізацыя ў сферы абароны правоў людзей з інваліднасцю, навучанне за мяжой як дапамога для адлічаных студэнтаў, удзел у працы прызыўных камісій), такая пастаноўка прыярытэтаў аслабляе патэнцыял стратэгічнага супрацоўніцтва ў праваабарончым сектары.

Затое другі найбольш узгадваемы прыярытэт у дзейнасці праваабарончых арганізацый — гэта асьвета і адукацыйная дзейнасць. Дадзены прыярытэт у дзейнасці быў узгаданы 20 разоў. Галоўным чынам, удзельнікі даследавання мелі на ўвазе асвету насельніцтва ў сферы правоў чалавека. Навучанне мэтавых груп і канкрэтныя адукацыйныя тэмы называліся вельмі рэдка.

Трэцяя група прыярытэтаў па колькасці ўзгадванняў — гэта абарона канкрэтных правоў і свабод (16 узгадванняў). У гэтым выпадку ў якасці прыярытэтаў у дзейнасці рэспандэнтамі часцей за ўсё называліся: абарона свабоды асацыяцый, абарона ад дыскрымінацыі і адмена смяротнага пакарання. Таксама былі названыя такія прыярытэты як: свабода інфармацыі і прыватнасць (абарона ад аўтынгу), лічбавыя свабоды, прасоўванне механізмаў удзелу грамадскасці ў прыняцці рашэнняў, абарона парушаных правоў.

Чацвёртая група прыярытэтаў (15 узгадванняў) — гэта розныя аспекты развіцця сваіх арганізацый, уключаючы арганізацыйнае развіццё, фандрайзінг і фінансавую ўстойлівасць, рост колькасці членаў і пашырэнне геаграфіі дзейнасці, стратэгаванне дзейнасці, прафесійны рост супрацоўнікаў, легітымную змену ўлады ў арганізацыі, інфармаванне грамадства аб сваёй працы. Прыярытэты з гэтай групы называліся часцей за ўсё ў трэцюю чаргу.

У наступныя групы прыярытэтаў у дзейнасці праваабарончых арганізацый патрапілі прыярытэты, названыя рэспандэнтамі 10 і менш разоў, сярод якіх таксама назіраецца тэматычная разнастайнасць. Так, прыярытэты па ўнясенні змен у беларускае заканадаўства, як правіла, цесна звязаныя з тэматыкай дзейнасці арганізацый: змяненне заканадаўства ў сферы свабоды веравызнання, ратыфікацыя Канвенцыі аб правах інвалідаў, змяненне Закона «Аб альтэрнатыўнай грамадзянскай службе», выкананне палажэнняў Орхускай канвенцыі. Праекты, ускосна звязаныя з праваабарончай дзейнасцю, — гэта адкрыццё «Нацыянальнага ўніверсітэта» з беларускай мовай навучання, антыядзерная кампанія, рэалізацыя культурніцкіх праектаў, развіццё валанцёрства і г.д.

Такім чынам, можна сказаць, што адносна высокі патэнцыял супрацоўніцтва паміж праваабарончымі арганізацыямі ўтрымліваецца ў галіне асветы ў сферы правоў чалавека, а таксама арганізацыі прававой дапамогі (гл. дыяграму 74).

**Дыяграма 74.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна прыярытэтаў у дзейнасці праваабарончых арганізацый на бліжэйшы час, частата



## Стратэгічнае планаванне

Аналіз адказаў рэспандэнтаў паказвае, што амаль у палове арганізацый, чые прадстаўнікі прынялі ўдзел у даследаванні (а менавіта, у 13 арганізацыях), на момант правядзення апытання сесіі па стратэгічнаму планаванню праводзіліся альбо даўно (да 2014 года), альбо не праводзіліся зусім, і толькі ў васьмі арганізацыях стратпланаванне праводзілася цягам апошніх трох гадоў (прычым у чатырох з іх — у 2016 годзе).

Сярод арганізацый, прадстаўленых у даследаванні парамі рэспандэнтаў, якія на пастаўленае пытанне далі несупадаючыя адказы (дзевяць арганізацый; на дыяграме 75 пазначаныя як «Адфільтравана»), у чатырох выпадках першымі парнымі рэспандэнтамі было пазначана, што ў іх арганізацыях у апошні раз стратпланаванне праводзілася ў 2015 годзе, іх «напарнікамі» — што ў 2016 годзе. У двух арганізацыях першымі парнымі рэспандэнтамі было пазначана, што ў іх арганізацыях у апошні раз стратэгічнае планаванне праводзілася ў 2015-м і 2016-м гадах, а іх «напарнікі» мелі цяжкасці з адказам; яшчэ ў адной арганізацыі адзін з рэспандэнтаў назваў 2015 год, другі пазначыў, што стратпланаванне не праводзілася. Нарэшце, у выпадку яшчэ адной пары першым рэспандэнтам было пазначана, што ў апошні раз страгпланаванне праводзілася да 2014 года, другім — што не праводзілася ніколі, а ў выпадку іншай пары рэспандэнтаў былі дадзены адказы: «Такія сэсіі не праводзіліся» і «Цяжка адказаць». Такім чынам, з вялікай доляй упэўненасці да ліку арганізацый, у якіх праводзіліся сесіі па стратэгічнаму планаванню нядаўна (у 2015-2016 гадах), можна дадаць яшчэ пяць арганізацый, а да ліку арганізацый, дзе такія сесіі даўно ці ніколі не праводзілі, — дзве арганізацыі (гл. дыяграму 75).

**Дыяграма 75.** Размеркаванне арганізацый па часе правядзення апошняй сесіі па стратэгічнаму планаванню, частата



Адказваючы на пытанне пра тое, ці ёсць у арганізацыі стратэгічны план дзейнасці, у выпадку амаль паловы арганізацый (а менавіта, 13 арганізацый) рэспандэнтамі было пазначана, што такі план ёсць, у выпадку шасці арганізацый рэспандэнты паведамілі, што стратэгічнага плану ў іх арганізацый няма, яшчэ ў выпадку адной арганізацыі рэспандэнты паведамілі, што яны не інфармаваныя на гэты конт (на дыяграме 76 пазначана як «Невядома»). У выпадку 10 арганізацый, прадстаўленых у даследаванні парамі ўдзельнікаў, рэспандэнтамі былі дадзеныя несупадаючыя адказы (на дыяграме 76 пазначана як «Адфільтравана»), сярод іх у палове выпадкаў адзін з парных рэспандэнтаў выбраў варыянт адказу «Не ведаю» (гл. дыяграму 76).

**Дыяграма 76.** Размеркаванне арганізацый па наяўнасці/адсутнасці стратэгічнага плана дзейнасці, %, частата




Зыходзячы з адказаў рэспандэнтаў, у большай частцы арганізацый, якія маюць стратэгічны план дзейнасці, атрымоўваецца гэтага плана трымацца (11 з 13 арганізацый, прадстаўленых у даследаванні як парамі, так і адзінкавымі рэспандэнтамі). Рэспандэнты з двух арганізацый пазначылі, што трымацца стратэгічнага плана не атрымоўваецца, яшчэ ў выпадку двух арганізацый дзве пары рэспандэнтаў далі несупадаючыя адказы (у абодвух выпадках першыя рэспандэнты пазначылі, што трымацца плана атрымоўваецца, а іх «напарнікі» мелі цяжкасці з адказам) (гл. дыяграму 77).

**Дыяграма 77.** Размеркаванне арганізацый, якія маюць стратэгічны план, адносна выканання дадзенага плана дзейнасці, %, частата



Што тычыцца ўнутранай ацэнкі выніковасці дзейнасці, то, зыходзячы з адказаў рэспандэнтаў, практычна ва ўсіх арганізацыях даследуемай сукупнасці такая працэдура выконваецца, але, часцей за ўсё, нерэгулярна: у 13 арганізацыях ацэнка выніковасці дзейнасці праводзіцца нерэгулярна, у сямі — рэгулярна. Яшчэ ў васьмі арганізацыях ацэнка выніковасці дзейнасці праводзіцца, але пры адказе рэспандэнты з гэтых арганізацый разышліся адносна рэгулярнасці яе правядзення, калі адныя парныя рэспандэнты пазначылі, што ацэнка праводзіцца рэгулярна, а другія — што праводзяцца нерэгулярна альбо быў абраны адказ «Не ведаю». Прадстаўнікі толькі адной арганізацыі пазначылі, што ў іх выпадку ўнутраная ацэнка выніковасці дзейнасці не праводзіцца, яшчэ ў выпадку адной арганізацыі адзін з рэспандэнтаў паведаміў, што ў арганізацыі працэдура ацэнкі праводзіцца нерэгулярна, другі пазначыў, што яна зусім не праводзіцца (гл. дыяграму 78).

**Дыяграма 78.** Размеркаванне арганізацый адносна выканання працэдуры ўнутранай ацэнкі выніковасці дзейнасці, частата, %




## Ацэнкі патрэбы праваабарончых арганізацый у адукацыйных мерапрыемствах

Пераважная большасць рэспандэнтаў пазначыла, што іх арганізацыі маюць патрэбу ў дадатковых адукацыйных мерапрыемствах. 10% (ці 5 рэспандэнтаў) пазначылі, што іх арганізацыі ў дадатковых адукацыйных мерапрыемствах не маюць патрэбы, і 16% удзельнікаў даследавання мелі цяжкасці з адказам (гл. дыяграму 79).

**Дыяграма 79.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў наконт патрэбнасці ў дадатковых адукацыйных мерапрыемствах, %, чал.



Найбольш актуальнымі тэмамі для адукацыйных мерапрыемстваў для праваабарончых арганізацый з'яўляюцца: стратэгічнае планаванне, арганізацыйнае развіццё, інфармацыйная бяспека і праектны менеджмент (38-40% рэспандэнтаў выбралі гэтыя варыянты адказу). Да ліку тэм, да якіх праявіла цікавасць найменшая колькасць удзельнікаў даследавання, адносяцца: дакументаванне парушэнняў правоў чалавека, трэнінгі па асобных правах чалавека, пошук інфармацыі (менш за 15% рэспандэнтаў выбралі дадзеныя варыянты адказу) (гл. дыяграму 80).

**Дыяграма 80.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна пажаданых тэм для адукацыйных мерапрыемстваў, %



Таксама ўдзельнікамі даследавання былі пазначаныя іншыя тэмы для адукацыйных мерапрыемстваў:

*«Bankwatch»*[4];

*«Адукацыя членаў арганізацыі ў галіне аўтарскіх правоў»*;

*«Права на свабоду выказванняў, на пратэст»*.

Адзін рэспандэнт выбраў варыянт «Іншае», пазначыўшы наступнае:

*«Асобным валанцёрам і супрацоўнікам арганізацыі неабходныя адукацыйныя мерапрыемствы па механізмах абароны правоў чалавека, асобных правах чалавека і г.д.»*.

Што тычыцца форм адукацыйных мерапрыемстваў, больш за ўсё рэспандэнтаў выказала зацікаўленасць у абмене досведам з замежнымі арганізацыямі (гэты варыянт адказу выбралі 64% рэспандэнтаў). Другой найбольш запатрабаванай формай адукацыйных мерапрыемстваў сярод удзельнікаў даследавання з’яўляюцца семінары ў Мінску (58%). Абмен досведам з беларускімі арганізацыямі апынуўся цікавым меншай колькасці рэспандэнтаў (46%), яшчэ меншая зацікаўленасць у даследуемай групе да семінараў за мяжой (40%). Анлайн-курсы, семінары ў рэгіёнах і асветніцкія матэрыялы — формы, найменш запатрабаваныя лідэрамі праваабарончых арганізацый (менш за 35% рэспандэнтаў выбралі дадзеныя варыянты адказу) (гл. дыяграму 81).

**Дыяграма 81.** Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў адносна пажаданых форм адукацыйных мерапрыемстваў, %




[4] ***Bankwatch*** — гэта грамадскі маніторынг праектаў, што рэалізуюцца міжнароднымі фінансавымі інстытутамі; гл., напрыклад: **Активистов экоорганизаций приглашают на тренинг по бэнквотчингу** // «Зеленый портал». — 29.09.2016: http://greenbelarus.info/calendar/aktivistov-ekorganizaciy-priglashayut-na-trening-po-benkvotchingu.

# Пра аўтараў

**Алёна Зуйкова** — аналітык Цэнтра еўрапейскай трансфармацыі, магістр палітычных навук. Скончыла Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт (Вільнюс, Літва), атрымаўшы ступень бакалаўра па спецыяльнасці «Паліталогія і еўрапейскія даследаванні», а таксама магістратуру *Sciences Po — Institut d’Études Politiques de Lille* (Інстытут палітычных навук, г. Ліль, Францыя) па спецыяльнасці «European Affairs». Фокус даследчых інтарэсаў: Еўрапейская палітыка суседства, Усходняе партнёрства, еўрапейская палітыка ў дачыненні да Беларусі, еўрапейская палітыка развіцця; грамадзянская супольнасць, ролю арганізацый грамадзянскай супольнасці ў працэсах дэмакратызацыі Беларусі; Еўразійскі эканамічны саюз.

**Андрэй Ягораў** — дырэктар Цэнтра еўрапейскай трансфармацыі, магістр палітычных навук. Скончыў аддзяленне паліталогіі і магістратуру па спецыяльнасці «Паліталогія» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У галіне палітычных даследаванняў працуе з 2001 года. Фокус даследчых інтарэсаў: трансфармацыя постсавецкай прасторы, грамадзянская супольнасць, палітычныя трансфармацыі ў Беларусі і рэгіёне ўсходняга партнёрства, еўрапейскія даследаванні.

**Аксана Шэлест** — старшы аналітык Цэнтра еўрапейскай трансфармацыі, кандыдат сацыялагічных навук (*PhD*). Скончыла аддзяленне сацыялогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, аспірантуру Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Працавала ў Інстытуце сацыялогіі НАН Беларусі: кіравала сектарам методыкі і практыкі аператыўных даследаванняў, займала пасаду вучонага сакратара, узначальвала аддзел тэхналогій сацыялагічных даследаванняў. З’яўляецца экспертам аналітычнай групы Агенцтва гуманітарных тэхналогій. Лаўрэат Прэміі Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі ў намінацыі «Сацыяльныя і палітычныя навукі» (2013).

# Дадаткі

## Дадатак 1. Спіс праваабарончых арганізацый і ініцыятыў, прадстаўнікі якіх прынялі ўдзел у даследаванні

1. **Асамблея няўрадавых дэмакратычных арганізацый Беларусі** (Асамблея НДА Беларусі)
2. **Асветніцка-сацыяльнае грамадскае аб'яднанне «Звяно»** (АСГА «Звяно»)
3. **Асветніцкая праваабарончая ўстанова «Офіс па правах людзей з інваліднасцю»** (ОПЛІ)
4. **Асветніцкая ўстанова «Офіс правоў прызыўніка»**
5. **Асветніцкая ўстанова «Цэнтр прававой трансфармацыі»** (*Lawtrend*)
6. **Беларускі Дом правоў чалавека імя Барыса Звозскава** (Беларускі ДПЧ)
7. **Беларускі праваабарончы цэнтр «Ідэнтычнасць»** (ПЦ «Ідэнтычнасць»)
8. **Беларускі прафсаюз работнікаў радыёэлектроннай прамысловасці** (Прафсаюз РЭП)
9. **Гомельскі цэнтр стратэгічнай цяжбы** (ГЦСЦ)
10. **Грамадзянская ініцыятыва «Супраць беззаконня ў судах і пракуратуры»**
11. **Грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя журналістаў»** (БАЖ)
12. **Грамадскае аб'яднанне «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны»** (ТБМ)
13. **Грамадскае аб'яднанне «Цэнтр па правах чалавека»**
14. **Грамадскае аб'яднанне «Экадом»**
15. **Гродзенскае абласное грамадскае аб'яднанне маладых навукоўцаў «ВІТ»** (ГА «ВІТ»)
16. **Група сваякоў асуджаных, якія пацярпелі ад беззаконня ў судах і пракуратуры/Ініцыятыва «За справядлівы суд у Беларусі»**
17. **Камітэт абароны рэпрэсаваных «Салідэрнасць»** (Камітэт «Салідэрнасць»)
18. **Моладзевая прафсаюзная група «Студэнцкая Рада»** (МПГ «Студэнцкая Рада»)
19. **Моладзевая праваабарончая група — Беларусь** (МПГ-Беларусь)
20. **Праваабарончы цэнтр «Вясна»** (ПЦ «Вясна»)
21. **Праваабарончы цэнтр «Прававая дапамога насельніцтву»**
22. **Прыватная інфармацыйна-кансультацыйная ўстанова «Рэгіён 119»** (ПІКУ «Рэгіён 119»)

23. **Публічная ўстанова «Беларускі дакументацыйны цэнтр»** (БДЦ)
24. **Публічная ўстанова «Ліга развіцця дэмакратыі «Грамадзянскі вердыкт»**
25. **Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне «Беларускі ПЭН-цэнтр»**
26. **Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне «Прававая ініцыятыва»**
27. **Рэспубліканскае праваабарончае грамадскае аб’яднанне «Беларускі Хельсінкскі камітэт»** (БХК)
28. **Таварыства «Зялёная сетка»**
29. **Установа «Кансультацыйны цэнтр па актуальных міжнародных практык і іх імплементацыі ў праве «Хьюман Канстанта»** (Праваабарончая ініцыятыва *Human Constanta*)
30. **Экспертна-прававое таварыства «Ініцыятыва FORB»**

## **Дадатак 2.** Анкета

Прывітанне! Дзякуем за тое, што Вы пагадзіліся прыняць удзел у нашым даследаванні. Даследаванне праводзіцца Цэнтрам еўрапейскай трансфармацыі па ініцыятыве Беларускага Дома правоў чалавека імя Барыса Звозскава з мэтай вызначэння прыярытэтаў развіцця беларускай праваабарончай супольнасці на падставе бачання асноўных праблем у сферы дзейнасці па абароне правоў чалавека ў Беларусі.

Даследаванне ананімнае, усе матэрыялы па выніках даследавання будуць выкарыстоўвацца толькі ў абагульненым выглядзе, ніякія дадзеныя, якія дазваляюць ідэнтыфікаваць Вас асабіста, уключаючы запоўненыя анкеты, не будуць апублікаваныя або перададзеныя заказчыку даследавання.

Прыняць удзел у даследаванні вельмі проста:

- Трэба ўважліва прачытаць пытанні анкеты і ўсе варыянты адказаў. Выберыце той варыянт, які адлюстроўвае Ваша асабістае меркаванне або характарызуе Вашу сітуацыю, і абвядзіце кружком яго нумар.
- Калі ні адзін з варыянтаў Вам не падыходзіць, напішыце свой адказ у свабодным радку.
- У некаторых пытаннях можна выбраць некалькі варыянтаў адказаў, таму, калі ласка, чытайце ўважліва тлумачэнні да пытанняў анкеты.
- Калі нешта з напісанага Вам незразумела ці выклікае сумневы, звярніцеся за тлумачэннямі да інтэрв’юера.
- Калі ласка, паспрабуйце не прапускаць пытанні! Ад паўнаты атрыманай інфармацыі залежыць якасць вынікаў усяго даследавання.

Загадзя ўдзячныя за ўважлівае і сур’ёзнае стаўленне да даследавання!

Для пачатку давайце пазнаёмімся. Калі ласка, паведамьце некаторыя дадзеныя пра Вас:

1. **Назва арганізацыі**: ______________________________________________________________________________

2. **Пасада (займаемая пазіцыя)**: ____________________________________________________________________

3. **Ці з’яўляецца праца ў дадзенай арганізацыі Вашым асноўным месцам занятасці?**

1. Так
2. Не

4. **Колькі гадоў Вы працуеце ў дадзенай арганізацыі?** *(дакладна ці прыкладна)*: _________ гадоў

5. **Узрост**: __________ гадоў

6. **Адукацыя** *(выберыце, калі ласка, толькі 1 варыянт адказу)*:

1. Пачатковая, сярэдняя няпоўная
2. Агульная сярэдняя
3. Сярэдняя спецыяльная
4. Няскончаная вышэйшая
5. Вышэйшая
6. Вучоная ступень

Давайце пагаворым аб Вашым разуменні праваабарончай дзейнасці:

**7. Як даўно Вы працуеце ў праваабарончай сферы?**

1. Менш за 1 год
2. 1-3 гады
3. 4-5 гадоў
4. 6-10 гадоў
5. Больш за 10 гадоў

**8. Ці лічыце Вы сябе асабіста праваабаронцам?**

1. Так
2. Не
3. Цяжка адказаць

**9. Адзначце, калі ласка, у якой ступені Вы згодны з кожнай з прыведзеных ніжэй характарыстык праваабарончай дзейнасці?** *(дайце, калі ласка, 1 адказ у кожным радку)*:

| | Характарыстыкі | Цалкам не згодны | Часткова згодны | Цалкам згодны | Цяжка адказаць |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Праваабарончая дзейнасць — гэта дзейнасць асобных людзей, груп або інстытутаў грамадства, якія заахвочваюць і абараняюць агульнапрызнаныя правы чалавека і асноўныя свабоды. | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 2. | Праваабарончая дзейнасць палягае ў заахвочванні і абароне грамадзянскіх і палітычных правоў, а таксама заахвочванні, абароне і ажыццяўленні эканамічных, сацыяльных і культурных правоў. | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 3. | Праваабарончая дзейнасць тычыцца заахвочвання і абароны правоў членаў любых груп насельніцтва. | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 4. | Праваабарончая дзейнасць не ўключае ў сябе дзейнасць, звязаную з правядзеннем або прапагандай актаў гвалту. | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5. | Праваабарончая дзейнасць накіравана на абарону правоў індывідуальнага грамадзяніна ад пасягальніцтваў дзяржавы, але не распаўсюджваецца на адносіны паміж грамадзянамі. | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 6. | Праваабарончая дзейнасць носіць грамадскі характар і не распаўсюджваецца на дзейнасць афіцыйных асоб дзяржавы, чыноўнікаў і ўдзельнікаў бізнес-сектара. | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 7. | Праваабарончая дзейнасць ажыццяўляецца праваабарончымі арганізацыямі або асобнымі праваабаронцамі на аснове спецыяльных ведаў і стандартаў кваліфікацыі. | 1 | 2 | 3 | 4 |

**10. Ці лічыце Вы патрэбным дадаць якія-небудзь важныя, з Вашага пункту гледжання, характарыстыкі праваабарончай дзейнасці?**

1. Так *(назавіце, калі ласка)*: ____________________
2. Не

**11. Пазначце, калі ласка, у якой ступені Вы згодны з кожнай з прыведзеных ніжэй характарыстык праваабаронцаў?** *(дайце, калі ласка, 1 адказ у кожным радку)*:

| | Характарыстыкі | Цалкам не згодны | Часткова згодны | Цалкам згодны | Цяжка адказаць |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Праваабаронцы — гэта тыя, хто індывідуальна ці сумесна з іншымі імкнецца заахвочваць, абараняць і ажыццяўляць правы чалавека і асноўныя свабоды на мясцовым, нацыянальным, рэгіянальным і/або міжнародным узроўнях. | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 2. | Праваабаронцы прызнаюць універсальнасць правоў чалавека для ўсіх без якога-небудзь адрознення. | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 3. | Праваабаронцы абараняюць правы чалавека толькі мірнымі сродкамі. | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 4. | Праваабаронцы працуюць з любымі парушэннямі правоў чалавека, уключаючы масавыя пакаранні смерцю, катаванні, адвольныя арышты і заключэнне пад варту, дыскрымінацыю, пытанні занятасці, доступ да медыцынскага абслугоўвання, таксічныя адходы і іх уздзеянне на навакольнае асяроддзе. | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5. | Праваабаронцы абараняюць правы любых груп, уключаючы правы жанчын, дзяцей, правы карэнных жыхароў, правы бежанцаў і ўнутрана перамешчаных асоб, а таксама правы нацыянальных, моўных, сэксуальных меншасцей. | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 6. | Праваабаронцы ў выключных выпадках могуць дапускаць выключэнне некаторых правоў чалавека для пэўных асоб або груп насельніцтва (тэрарыстаў, педафілаў і г.д.). | 1 | 2 | 3 | 4 |

**12. Ці лічыце Вы патрэбным дадаць якія-небудзь важныя, з Вашага пункту гледжання, характарыстыкі праваабаронцаў?**

1. Так *(назавіце, калі ласка)*: ___________________________
2. Не

**13. Калі б да Вас звярнуліся з прапановай уключыцца ў кампанію па абароне правоў наступных груп, як бы Вы паступілі?** *(дайце, калі ласка, 1 адказ у кожным радку)*:

| | | Не буду выступаць у іх абарону | Буду дапамагаць, але непублічна | Буду выступаць у абарону іх правоў публічна | Цяжка адказаць |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Жанчыны | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 2. | Нацыянальныя меншасці | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 3. | Эмігранты-мусульмане | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 4. | Бежанцы | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5. | Баптысты, евангелісты | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 6. | Прадстаўнікі ЛГБТ-супольнасці | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 7. | Людзі з інваліднасцю | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 8. | Зняволеныя | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 9. | Тэрарысты, чыя віна даказаная | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 10. | Палітычныя актывісты | 1 | 2 | 3 | 4 |

**14. Ці падтрымліваеце Вы захаванне ў Рэспубліцы Беларусь смяротнага пакарання ў якасці выключнай меры крымінальнага пакарання?**

1. Так
2. Не
3. Цяжка адказаць

Давайце пагаворым аб супрацоўніцтве ў сектары беларускіх праваабарончых арганізацый:

**15. Для чаго, на Вашу думку, беларускім праваабарончым арганізацыям трэба супрацоўніцтва паміж сабой?** *(выберыце, калі ласка, не больш за 5 варыянтаў адказу)*:

1. Уплыў на дзяржаўную палітыку ў галіне правоў чалавека
2. Змяненне заканадаўства
3. Палітычныя змены ў Беларусі
4. Прадстаўніцтва інтарэсаў праваабарончых арганізацый у дыялогу з беларускімі ўладамі
5. Паляпшэнне ўмоў дзейнасці (прававых, фінансавых і г.д.) для праваабарончых грамадскіх арганізацый
6. Паляпшэнне ўмоў дзейнасці (прававых, фінансавых і г.д.) для ўсіх арганізацый грамадзянскай супольнасці
7. Прасоўванне, адстойванне, абарона правоў і інтарэсаў мэтавых груп
8. Дапамога іншым беларускім праваабаронцам/праваабарончым арганізацыям у крызіснай сітуацыі
9. Рэалізацыя сумесных праектаў
10. Рэалізацыя агульных кампаній у абарону правоў чалавека
11. Правядзенне сумесных маніторынгаў парушэнняў правоў чалавека
12. Прынясце сумесных заяў, зваротаў
13. Праца ў рамках міжнародных праваабарончых механізмаў
14. Іншае *(напішыце, калі ласка)*: ____________________
15. Праваабарончым арганізацыям не трэба супрацоўніцтва

**16. Пазначце, калі ласка, што, на Вашу думку, у найбольшай ступені спрыяе супрацоўніцтву паміж беларускімі праваабарончымі арганізацыямі?** *(выберыце, калі ласка, не больш за 5 варыянтаў, якія з'яўляюцца найбольш значнымі фактарамі)*:

1. Узаемны давер паміж арганізацыямі сектара
2. Высокі ўзровень ведаў пра дзейнасць адзін аднаго
3. Наяўнасць каардынуючай пляцоўкі
4. Наяўнасць агульных праблем
5. Наяўнасць арганізацый-лідэраў, гатовых браць на сябе адказнасць за сумесныя дзеянні
6. Наяўнасць у арганізацый свабодных рэсурсаў (часу, грошай, кадраў і г.д.)
7. Адсутнасць прычын для канкурэнцыі паміж арганізацыямі
8. Пазітыўны досвед мінулага супрацоўніцтва
9. Супадзенне стратэгічных мэтаў розных арганізацый
10. Добрыя асабістыя адносіны паміж лідэрамі і актывістамі з розных арганізацый
11. Іншае (*назавіце, калі ласка)*:____________________
12. Нічога не спрыяе супрацоўніцтву
13. Цяжка адказаць

**17. Пазначце, калі ласка, колькі прыкладаў сумесных дзеянняў арганізацый праваабарончага сектара за апошнія 3 гады Вы можаце прыгадаць?**

1. Ніводнага
2. 1-2
3. 3-5
4. 6-10
5. Больш за 10

**18. Назавіце, калі ласка, да 5 найбольш паспяховых прыкладаў супрацоўніцтва праваабарончых арганізацый у апошнія 5 гадоў (сумесных дзеянняў, кампаній, праектаў і г.д.)**:

1. ____________________
2. ____________________
3. ____________________
4. ____________________
5. ____________________
6. Не магу прыгадаць
7. Такіх прыкладаў не было

**19. Ацаніце, калі ласка, паспяховасць супрацоўніцтва праваабарончых арганізацый агулам па шкале ад 1 да 10, дзе «1» — «Зусім не паспяхова», а «10» азначае «Вельмі паспяхова»**:

| Зусім не паспяхова | | | | | | | | | Вельмі паспяхова | Цяжка адказаць |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 0 |

**20. Пазначце, калі ласка, абарона якіх правоў чалавека ў Беларусі ў найбольшай ступені патрабуе сумесных намаганняў праваабаронцаў?** *(выберыце, калі ласка, не больш за 3 варыянтаў адказу)*:

1. Права на жыццё
2. Забарона смяротнага пакарання ў мірны час
3. Забарона смяротнага пакарання ў час вайны
4. Свабода ад катаванняў і жорсткага абыходжання
5. Свабода ад рабства і забарона гандлю людзьмі
6. Права на свабоду і асабістую недатыкальнасць (права на абарону ад адвольнага затрымання)
7. Права на справядлівы суд (права на доступ да суда, працэсуальныя правы, права на адваката і прававую дапамогу, права на вядзенне працэса на сваёй мове або з выкарыстаннем перакладчыка, права на выкананне рашэння суда і г.д.)
8. Ніякага пакарання без закона
9. Павага да прыватнага і сямейнага жыцця
10. Свабода думкі, сумлення і рэлігіі
11. Свабода выказвання поглядаў і доступ да інфармацыі
12. Свабода сходаў і аб’яднанняў
13. Права на шлюб, раўнапраўе ў шлюбе
14. Права на эфектыўныя сродкі прававой абароны ад парушанага права
15. Забарона дыскрымінацыі па любой прыкмеце
16. Права ўласнасці
17. Права на адукацыю
18. Права на свабодныя выбары
19. Забарона пазбаўлення волі за даўгі
20. Свабода перамяшчэння і свабода выбару месца пражывання
21. Забарона высылкі грамадзян з краіны
22. Забарона на калектыўную высылку замежнікаў
23. Права на жыллё
24. Права на працу і права на справядлівыя і спрыяльныя ўмовы працы
25. Права на стварэнне прафсаюзаў
26. Права на сацыяльнае забеспячэнне
27. Права кожнага на дастатковы жыццёвы ўзровень для яго і яго сям’і, які ўключае дастатковае харчаванне, адзенне і жыллё, і на бесперапыннае паляпшэнне ўмоў жыцця
28. Права чалавека на найвышэйшы дасягальны ўзровень фізічнага і псіхічнага здароўя
29. Права на мір

30. Права на развіццё
31. Права на здаровае навакольнае асяроддзе
32. Права на камунікацыю
33. Іншае (*назавіце, калі ласка*): ____________________
34. Нічога з пералічанага не патрабуе сумесных намаганняў праваабаронцаў
35. Цяжка адказаць

**21. Назавіце, калі ласка, якія сферы/тэмы дзейнасці, па Вашым меркаванні, стратэгічна важныя для беларускіх праваабаронцаў у кароткатэрміновай перспектыве (3-5 гадоў)?** *(назавіце, калі ласка, не больш за 3 сфер/тэм)*:

1. ____________________
2. ____________________
3. ____________________
4. Не магу назваць

**22. Як Вы лічыце, якія сферы/тэмы дзейнасці стратэгічна важныя для беларускіх праваабаронцаў у доўгатэрміновай перспектыве (5-10 гадоў)?** *(назавіце, калі ласка, не больш за 3 сфер/тэм)*:

1. ____________________
2. ____________________
3. ____________________
4. Цяжка адказаць

**23. Калі ласка, ацаніце інтэнсіўнасць і досвед супрацоўніцтва Вашай арганізацыі з кожнай з пералічаных арганізацый у апошнія 3 гады** *(калі лічыце патрэбным, у свабодных радках можаце пазначыць да 3 беларускіх праваабарончых арганізацый, якіх няма ў спісе)*:

| | **Арганізацыі** | **Інтэнсіўнасць супрацоўніцтва** | | | **Досвед супрацоўніцтва** | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | **Ніколі не супрацоўнічалі** | **Часам супрацоўнічалі** | **Часта супрацоўнічалі** | **Пазітыўны** | **Нейтральны** | **Негатыўны** |
| 1. | АПУ «Офіс па правах людзей з інваліднасцю» | 1 | 2 | 3 | A | B | C |
| 2. | Асамблея НДА Беларусі | 1 | 2 | 3 | A | B | C |
| 3. | Асацыяцыя прафсаюзаў «Беларускі кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў» | 1 | 2 | 3 | A | B | C |
| 4. | Асветніцка-сацыяльнае ГА «Звяно» | 1 | 2 | 3 | A | B | C |
| 5. | АУ «Цэнтр прававой трансфармацыі» (*Lawtrend*) | 1 | 2 | 3 | A | B | C |
| 6. | Беларускі Дом правоў чалавека імя Барыса Звозскава | 1 | 2 | 3 | A | B | C |
| 7. | Беларускі праваабарончы цэнтр «Ідэнтычнасць» | 1 | 2 | 3 | A | B | C |
| 8. | Беларускі прафсаюз работнікаў радыёэлектроннай прамысловасці (Прафсаюз РЭП) | 1 | 2 | 3 | A | B | C |
| 9. | ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» | 1 | 2 | 3 | A | B | C |
| 10. | ГА «Магілёўскі праваабарончы цэнтр» | 1 | 2 | 3 | A | B | C |
| 11. | ГА «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны» | 1 | 2 | 3 | A | B | C |
| 12. | ГА «Цэнтр па правах чалавека» | 1 | 2 | 3 | A | B | C |
| 13. | Гомельскі цэнтр стратэгічнай цяжбы | 1 | 2 | 3 | A | B | C |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
